Людзьмі звацца! —
Янка Купала

Літаратура і Мастацтва

ВЫХОДЗІЦЬ З 1932 г.

ШТОТЫДНЁВІК МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Пятніца, 17 жніўня 1990 г. № 33 (3547) ● Цана 10 кап.

ЯШЧЭ АДНА «БІТВА»?



Сёння мы, аддаючы даніну традыцыі, публікуем фотаздымак, зроблены на жніве. Наш пазаштатны фотакарэспандэнт А. Кляшчук, які прынёс яго ў рэдакцыю, прапанаваў і «не банальны», па яго словах, подпіс пад здымкам: «Сняданак механізатараў». «Бачыце, — дадаў ён, — адзін з іх выцірае з твару пот. Не шкадуюць людзі сябе...»

Сапраўды, не шкадуюць... Ці то сёлета як па заказе грэла сонейка і ішлі ў час дажджы, ці то пастараўся Ягор Кузьміч Лігачоў на сваёй пасадзе старшыні аграрнай камісіі ЦК КПСС, а мо і проста насуперак поспехам нашага слаўнага калгасна-саўгаснага ладу, але ўраджай выспеў, што па ўсёй краіне, што на нашай Беларусі, не тое што выдатны—нябачаны!

Здавалася б, па чалавечай логіцы, зыходзячы са здаровага сэнсу, трэба гэтай акалічнасці, пры нашых пустых паліцах, бязмерна радавацца. Але Ураджай (я дазволю сабе напісаць гэтае слова з вялікай літары) з усёй вастрынёй выявіў параліч нашай адміністрацыйна-камандна-ай сістэмы, фактычна яе няздольнасць валодаць сітуацыяй. Жах ахоплівае, калі глядзіш на зафіксаваныя газетнымі фотакорамі, тэлеаператарамі ссыпаныя на дарогах, на жывёлагадоўчых пляцоўках, проста ў полі манбланы залатога збожжа, значнай частцы якога (падлічана: 40 мільёнам тон, столькі, колькі купляем на «пачварным» Захадзе), наканавана зглуміцца.

Як гэта ў нас робіцца, пры любым правале пачынаецца пошук вінаватых — міністраў, падміністраў, кіраўнікоў ніжэйшага рангу, якія «не паклапаціліся, не прадугледзелі, не прадбачылі, не мабілізавалі» і г. д. і да т. п. Але хоць сто разоў наш, як кажуць, самы прыгожы і элегантны прэм'ер-міністр у свеце Мікалай Іванавіч Рыжкоў будзе збіраць Прэзідыум Савета Міністраў СССР, на якім тэлевізійныя юпітэры высвецяць на ўвесь свет абыякавыя твары міністраў, якім і сказаць няма чаго,—нічога не зменіцца. Бо справа не ў пажарных мерах (днямі чуў па радыё інфармацыю аб тым, як у адным раёне

(Працяг на стар. 4).

За апошнія гады мы неспадзеўкі ўбачылі і зразумелі, што «новая гістарычная супольнасць— савецкі народ» — не такая ўжо і «маналітная еднасць», як нам даводзілі. Сёння мы ўжо зусім звычна вылучаем з гэтай «еднасці» не толькі колішніх трох кітоў — яго вялікасць рабочы клас, калгасна-саўгаснае сялянства і працоўную інтэлігенцыю, але і кааператараў, і дзялкоў ценявой эканомікі, і партапаратчыкаў, і нефармалаў, а таксама алкашоў, наркаманаў, прастытутак, бомжаў і г. д. З развіццём парламенцкай дэмакратыі былі заўважаны кансерватары і радыкалы, а неўзабаве і яшчэ два «саслоўі». Першае з іх адрозніваецца вялікай згуртаванасцю на парламенцкіх лавах і шчырай адданасцю метадам мыслення «а-ля асфальтавы каток»: загадаюць — раструшчым. У нашым рэспубліканскім Вярхоўным Савеце яно мае цвёрдую квоту (і зусім не малую) і ў прастамоўі носіць назву «ветэраны». Другое саслоўе цвёрдай квоты не мае, хоць прадстаўніцтва яго ў нашых парламентах таксама саліднае (прапарцыянальна колькасці на душу насельніцтва — большай у свеце няма). Асаблівая прыкмета: саслоўе падраздзяляецца на дзве рэзка акрэсленыя групы. Адна, неймаверна вялікая, мае неймаверна мала месц у парламентах, на з'ездах партыі і г. д., другая ж лічыць, што неад'емнай часткай яе формы поруч з генеральскімі лампасамі з'яўляецца дэпутацкі значок. Гэтае саслоўе носіць назву «ваеннаслужачыя». Характэрная рыса: прадстаўнікі першай групы (а гэта пераважна малодшае і сярэдняе афіцэрства), трапляючы ў структуры дзяржаўнай улады, пачынаюць, дай веры, «паліваць армію брудам, сеяць варожасць паміж арміяй і народам» і нават распрацоўваць розныя ваенныя рэформы. (Яркі прадстаўнік групы — народны дэпутат СССР маёр Лапацін). Усё гэта вельмі не падабаецца прадстаўнікам другой групы саслоўя. І не можа падабацца. Як тлумачыў мне некалі ў арміі адзін «начальнік»: «У цябе на галаве зорка, а ў мяне — кукарда. Значыць, думаць буду я»...

З думкамі пра гэта ішоў я на сустрэчу з народным дэпутатам рэспублікі, «беларускім Лапаціным», таксама маёрам, Уладзімірам Міхайлавічам Грыбанавым. Яго наўрад ці ёсць патрэба прадстаўляць чытачам. Ён запомніўся сваімі смелымі (як бы мы сказалі яшчэ нядаўна), радыкальнымі выступленнямі з трыбуны і ля мікрафона ў зале нашага парламента, сваёй прынцыповай і бескампрамісной пазіцыяй. Хацелася пагутарыць з ім, даведацца, як пачуваецца яму, прадстаўніку «негенеральскай» групы вайскоўцаў, на месцы парламентарыя, што ён думае пра сітуацыю ў парламенце і па-за яго сценамі, урэшце, проста пазнаёміцца з ім бліжэй, як, безумоўна, з неардынарнай асобай, лёс якой прадвызначыла перабудова.

Дэпутацкі клуб «ЛіМа»

А НАДЗЕІ ЗАСТАЮЦЦА...

Наш няштатны карэспандэнт гутарыць з народным дэпутатам БССР Уладзімірам ГРЫБАНАВЫМ

— Мы сустракаемся з вамі, Уладзімір Міхайлавіч, у апошні дзень работы сесіі. Таму першае пытанне, зразумела, будзе такое: як вы ацэньваеце працу парламента, яе вынікі? Што думаеце наконт дэпутацкага складу, ці такім уяўлялі яго сабе ў час выбараў?

— Ведаеце, удзельнічаючы ў перадвыбарчай кампаніі, назіраючы настрой людзей, я чакаў такога, скажам мякка, не надта рэвалюцыйнага дэпутацкага корпуса. Так яно і атрымалася. Дэпутатаў умоўна можна падзяліць на тры групы. Першая — гэта партыйныя і савецкія работнікі, другая — сярэдзіна, якая нават і за час работы сесіі не надта вызначыла свае пазіцыі, і, нарэшце, левае крыло. Тое, што правых большасць у парламенце, характэрна і для Саюза, і для рэспублікі, для нашай Беларусі.

А наконт таго, што чакалася ад першай сесіі... Людзі чакалі ад сесіі многага, асабліва, так бы мовіць, на бытавым узроўні. Але гэтыя спадзяванні не спраўдзіліся, проста не маглі спраўдзіцца.

Ды зроблена ўсё ж не так і мала. Калі ўспомніць Дэкларацыю аб незалежнасці, якую мы прынялі, калі сапраўды паслядоўна па ёй працаваць у будучым, ці, як сёння стала модным гаварыць, напаўняць яе зместам, то перамены павінны быць.

Коратка мае ўражанні можна ахарактарызаваць так: задавальнення малавата, але надзеі застаюцца.

— Уладзімір Міхайлавіч, скажыце, а кім вы сябе лічыце — прадстаўніком ваеннага саслоўя ў парламенце альбо проста дэпутатам, чыя прафесія — вайсковец?

— Я ўвогуле не разумею тых дэпутатаў, якія кажуць: я — прадстаўнік таго ці іншага завода, я — прадстаўнік аграрыяў і г. д. Гэта бязглуздзіца. Мы ж прадстаўнікі народа і правамоцныя на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Я, напрыклад, атрымліваю пісьмы, скаргі, на якія абавязаны адрэагаваць, з усіх куткоў рэспублікі. І не лічу сябе прадстаўніком толькі Узброеных Сіл у беларускім парламенце.

— А як вы мяркуеце: увогуле, ці маюць права вайскоўцы, што па волі лёсу трапілі на нейкі час у рэспубліку, удзельнічаць у рабоце вышэйшай заканатворчай інстанцыі дзяржавы?

— Я лічу, што калі ўжо ваеннаслужачы стаў дэпутатам, то ён не павінен быць ваеннаслужачым. Трэба выбраць адно з двух. Як міністр не можа быць народным дэпутатам, так і вайсковец, калі ён хоча застацца вайскоўцам, не мае на гэта права. У будучым мы павінны прыйсці да такога парадку. Трэба, каб армія стаяла па-за палітыкай, знаходзілася на службе ў дзяржавы, падпарадкоўвалася дзяржаўнай уладзе, але ні ў якім выпадку не палітычным партыям, як гэта адбываецца зараз.

— Калі не памыляюся, ваша пазіцыя і ваша асоба як кандыдата, а потым і дэпутата, прыйшлася не даспадобы вышэйшаму вайсковаму кіраўніцтву...

— Дэпутатам я стаў, як і многія іншыя з левага крыла, калі можна так сказаць, пазапланавым. Мы прыйшлі на хвалі дэмакратызацыі, на хвалі пякучага жадання змяніць жыццё. Хай гэта гучыць не надта сціпла, але я сам даў згоду балаціравацца ў Вярхоўны Савет тады, калі зразумеў, што змагу там нешта зрабіць.

А пра мой лёс вайскоўца... Ва Узброеных Сілах камандна-адміністрацыйная сістэма выпінаецца настолькі, як гаварыў Маякоўскі, «грубо и зримо», што «не зачапіцца» за яе проста немагчыма. Супраць мноства фактаў яе праяўлення я адкрыта пратэставаў на партыйных сходах і разнастайных нарадах, але, зрэшты, як гэта і бывае, аказаўся адзін. Не хачу абвінавачваць сваіх калег, у кожнага з іх, вядома, свае інтарэсы і не кожны можа ахвяраваць, скажам, дабрабытам сям'і, уступаючы ў барацьбу з тымі, хто пры ўладзе. Звяртаўся я з прапановамі і патрабаваннямі паскарэння перабудовы і ў іншыя, вышэйшыя інстанцыі, нават у ЦК КПСС. Натуральна, што ўсе мае допісы саслізгвалі ўніз, да маіх начальнікаў, і мяне ўшчувалі за тое, што лезу «не туды». І калі ў 1989 годзе зразумеў, што ў гэтай партыі, у гэтай структуры нічога зрабіць не здолею, я выйшаў з КПСС.

А калі пачалася перадвыбарчая кампанія і салдаты вылучылі мяне кандыдатам, у той час як большасць афіцэраў прамаўчала, я вырашыў яшчэ раз паспрабаваць свае сілы. І вось тады кіраўніцтва кінула супраць мяне практычна ўсе сродкі. Магчыма, гэта тлумачыцца і тым, што асноўным маім сапернікам стаў першы сакратар гаркома партыі М. Місуна. Цікавы момант — усё ведамаснае ў дадзеным выпадку адышло ўбок. Я ж вайсковец, я, безумоўна, буду абараняць армейскія інтарэсы, у першую чаргу інтарэсы радавых, ніжэйшых афіцэраў, прытым буду рабіць гэта прафесійна, з веданнем справы, бачачы яе, так бы сказаць, знутры. Хто ж з вайскоўцаў, здавалася б, будзе супраць? Але распачалося самае што ні на ёсць сапраўднае цкаванне.

Не так даўно я чытаў, што ў нас, усходніх славян, існуе цікавы феномен — таго, каго б'юць, яшчэ больш пачынаюць паважаць і стараюцца падтрымаць. Гэты нюанс мае праціўнікі не ўлічылі, дзейнічалі надта просталінейна і такім чынам вынеслі мяне на хвалю папулярнасці. Вядома, я і сам прыклаў нямала сіл, неаднаразова сустракаўся з людзьмі і, як вынік, быў абраны дэпутатам з васьмі кандыдатаў. Я вельмі ўдзячны сваім выбаршчыкам за падтрымку і буду адстойваць іх пазіцыі на любым узроўні, нягледзячы ні на што.

— Пазнаёмце нас, калі ласка, з гісторыяй змен вашага месца службы. Гэта, на мой погляд, таксама даволі характэрны момант «разгулу дэмакратыі» сярод кіраўніцтва Узброеных Сіл.

— Як толькі я быў вылучаны кандыдатам у дэпутаты, маё кіраўніцтва, атрымаўшы «дабро» Масквы, вырашыла перакінуць мяне на іншае месца службы. У арміі існуе няпісаны закон, згодна з якім афіцэр не павінен пераводзіцца ў другую акругу без яго згоды, за выключэннем тых выпадкаў, калі ён не адпавядае пасадзе. У мяне ж не было ніводнага спагнання ні па службовай, ні па партыйнай лініі. Тады на мяне сфабрыкавалі атэстацыю, на падставе якой хуценька перакінулі з Мінска ў Новачаркаск. І зноў парушылі закон, толькі пісаны ўжо. Па загаду міністра абароны СССР неабходна, каб я пад атэстацыяй распісаўся, а ў выпадку нязгоды маю два месяцы на яе апратэставанне. Толькі пасля вердыкта па маім пратэсце яна становіцца афіцыйным дакументам. А я дагэтуль не бачыў сваёй атэстацыі. Толькі з чужых слоў ведаю, што яна злосная, ілжывая і брудная.

Прычыну ўсіх «страсцей» я бачу ў адным: улез у святая святых сістэмы, дзе працвітаюць карупцыя, злоўжыванне службовым становішчам, кумаўство, пратэкцыянізм, у святая святых сістэмы, якая існуе тут і сувязі якой выходзяць на Маскву.

Далей было так: 30 студзеня я зарэгістраваны кандыдатам у народныя дэпутаты, а 31 выйшаў загад аб тым, каб я адбыў у Новачаркаск. Мае выбаршчыкі абурыліся, мяне падтрымаў БНФ; часць, дзе я служыў, была блакіравана пікетамі. Гэта змусіла кіраўніцтва выдаць новы загад: прыпыніць дзеянне загада аб пераводзе да заканчэння выбарчай кампаніі і, у канцы, пажадаць мне поспехаў у перадвыбарчай барацьбе. Але як толькі 17 сакавіка я быў абраны дэпутатам, адразу ж атрымаў новы загад: 20 сакавіка адбыць на новае месца службы. Рабіць нічога не заставалася, паехаў, прыняў пасаду. Так і жыў народны дэпутат БССР за сотні кіламетраў ад рэспублікі.

А калі прыехаў на сесію, то ад імя Вярхоўнага Савета БССР былі пасланы адпаведныя паперы на імя міністра абароны СССР, у камітэт Вярхоўнага Савета СССР па Узброеных Сілах і дзяржбяспецы, і ў выніку я быў пераведзены з Новачаркаска ў Беларусь, на Брэстчыну, але не на сваё ранейшае месца. Перакінуты на пасаду са спецыяльнасцю, па якой не працаваў 18 гадоў, з часу заканчэння вучылішча, хоць мая пасада тут, у Мінску, дзе знаходзіцца мая выбарчая акруга, дзе жыве, працуе і вучыцца мая сям'я, засталася вакантнай. Гэта яшчэ адно сведчанне таго, што маё начальства кіруецца не патрэбамі справы, а менавіта амбіцыямі і прагай помсты.

Зараз мяне прызначылі на пасаду сакратара Камісіі па нацыянальнай палітыцы і міжнацыянальных адносінах. Гэта праца пастаянная. Таму зараз вось у маім «дыпламаце» ёсць паперы, на падставе якіх мяне абавязаны вызваліць ад службы ва Узброеных Сілах. Так што мая вайсковая біяграфія, будзем лічыць, скончана.

— Шкадуеце, не?

— Шчыра скажу, развітваюся з арміяй з жалем, з цяжкім сэрцам ад таго, што там ва ўладзе застаецца нямала людзей, якія выхаваны пэўным асяроддзем і пэўным часам. Але я хачу сказаць, што, нягледзячы ні на што, я буду абараняць правы чалавека ў войску, буду на баку тых, каму патрэбна мая абарона.

— Вы дарэчы вярнуліся да парламенцкіх спраў. Некалькі дзён назад у адказ на стварэнне ў Вярхоўным Савеце рэспублікі партыйнай групы была створана і афіцыйная апазіцыя. Вы ўвайшлі ў яе склад? Якія ў яе мэты, кірункі работы?

— Стварэнне афіцыйнай апазіцыі рыхтавалася раней, некалькі тыдняў таму. Тады яе дакументы падпісалі больш чым шэсцьдзесят чалавек, у тым ліку і я. Але ў апошні дзень Зянон Пазняк і кіраўніцтва фракцыі БНФ чамусьці змянілі сваю лінію, і многія дэпутаты з тых, хто падпісалі дакументы, не трапілі ў спіс апазіцыі. Я не ведаю, чаму гэта было зроблена. Дакумент, які зачытаў З. Пазняк, я лічу канструктыўным, неабходным для нашага парламента. Левае крыло будзе ўносіць у суадносіны сіл сярод дэпутатаў раўнавагу, спрыяць плённай працы парламента.

— Уладзімір Міхайлавіч, вы беларус?

— Не, рускі. Але нарадзіўся на Браншчыне, у Краснагорскім раёне, у рускабеларускай вёсцы, што стаіць на самай мяжы. Прытым, наколькі я зараз ведаю, гэта землі этнічна беларускія. Ды я гэта і сам адчуў: нямала часу спатрэбілася, каб навучыцца ў школе рускай мове.

— Ніжэй дэпутацкага значка ў вас да лацкана пінжака прышпілена «Пагоня». Што гэта азначае?

— Мой сын-студэнт начапіў мне яе ў той дзень, калі я ішоў на афіцыйную цырымонію рэгістрацыі мяне кандыдатам у дэпутаты. З таго часу я гэты значок не здымаю і здымаць не збіраюся. Я лічу, што нацыянальна-гістарычная сімволіка беларускага народа не проста мае права на існаванне, яна нават не патрабуе абароны. Яна існуе, як паветра. Гаворкі «трэба — не трэба» — марная, непатрэбная справа.

Дарэчы, у БНФ я не ўваходжу, але я з тых, хто падтрымлівае фракцыю фронту, яе дакументы. Я лічу іх вельмі канструктыўнымі, вельмі важнымі і неабходнымі ў Вярхоўным Савеце. Што яшчэ мне імпануе ў пазіцыі фронту? Відаць, тое, што галоўная яго мэта — памяншэнне памераў і наступстваў чарнобыльскай бяды. У гэтай справе я буду падтрымліваць БНФ заўсёды.

— Уладзімір Міхайлавіч, дазвольце вам яшчэ адно пытанне як прафесійнаму вайскоўцу. Вы галасавалі за прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўнай незалежнасці рэспублікі. Адзін з яе пунктаў — магчымасць стварэння беларускіх вайсковых фарміраванняў. Якая ваша думка наконт гэтага пункта?

— Дэкларацыя — гэта крык аб дапамозе. Гэта апошняя магчымасць народа яго дзяржавы прыйсці да лепшага жыцця. Трэба разбураць сталінска-брэжнеўскую імперыю. Гэта зразумелі ўжо ўсе. Таму кожны пункт Дэкларацыі — спроба скінуць путы з ног і пятлю з шыі, надзея на тое, што хоць нашы дзеці будуць жыць па-чалавечы. І таму заява аб рэспубліканскіх Узброеных Сілах арганічна ўваходзіць у Дэкларацыю. Адзінае, што хацелася б дадаць. Беларусь у сувязі са сваім геаграфічным і стратэгічным становішчам ажно стогне пад ціскам ваеннага ведамства і ваенна-прамысловага комплексу. Яна перанасычана ракетамі, тэхнікай, войскамі. І ўсё гэта без аніякага кантролю з боку Вярхоўнага Савета рэспублікі. Мне думаецца, мы абавязкова павінны трымаць сітуацыю пад кантролем і дамагацца дэмілітарызацыі рэспублікі, зыходзячы з таго, што мы — незалежная дзяржава. Лічу, што гэты працэс павінен праходзіць хутчэй. На другой сесіі мы проста абавязаны стварыць вайсковую камісію.

— І апошняе пытанне, Уладзімір Міхайлавіч. Вы ўваходзіце яшчэ і ў склад камісіі па заканадаўстве. Некалькі слоў аб яе рабоце. Што чакаць ад заканадаўцаў у будучым?

— Камісія па заканадаўстве сёння проста завалена праектамі, і не толькі новымі, якія павінны на справе пацвердзіць палажэнні Дэкларацыі, але і зменамі да законаў, якія ўжо існуюць, у сувязі з тым, што жыццё наша мяняецца. У рабоце гэтай камісіі я мог бы адзначыць два асноўныя накірункі. Першы, які існаваў да апошняга часу, — гэта прывядзенне нашага заканадаўства ў адпаведнасць з саюзным. Такая работа сёння адмірае самым натуральным чынам. Для яе ж не патрэбен Вярхоўны Савет. Пара класных юрыстаў, некалькі добрых перакладчыкаў — і ўсё будзе выдатна, што заўсёды раней і было. Цяпер жа Дэкларацыя абвясціла верхавенства рэспубліканскіх законаў. Таму нам трэба арыентавацца на свой уласны вопыт, на свой уласны інтэлект. І ў гэтым сэнсе камісія па заканадаўстве будзе самая «працуючая», галаўная камісія Вярхоўнага Савета.

Сённяшні наш парламент выбраны на хвалі эмоцый, папулізму, абкарнанай дэмакратыі. Наша агульная задача зараз — рыхтаваць сабе змену, урабляць глебу, працаваць над стварэннем той інфраструктуры, з якой вырасце новы Вярхоўны Савет як палітычны орган, у якім сапраўды адчувае патрэбу беларускі народ.

Гутарку вёў Максім ГІЛЕВІЧ.

Пімен ПАНЧАНКА

Беларускія настаўніцы

Што з вамі сталася,
Што з вамі станецца?
Можа, цяпер вы пакрыўджана плачаце,
Беларускае мовы настаўніцы,
Беларускай літаратуры выкладчыцы?

Вашай лагоднаю ласкай атулены,
Пра Беларусь мы чытаць былі рады.
Мы вам верылі больш, чым матулям,
Хоць і матулі казалі нам праўду.

Сонца маленства да старасці свеціць:
Зноў мы то ў школе,
То ў інтэрнаце.
Помняць настаўніцу пінскія дзеці—
Іх партызанку
Грышчанку Надзю.

Будзьце ад сэрца у вершы праслаўлены:
Так вы працуеце самааддана,
Войцік Валянціна Вацлаваўна,
Юбко Валянціна Адамаўна.
Як вы спявалі «Ой рэчанька, рэчанька»,
Ваш голас у сэрцах — сардэчны,
не гучны...
Гэта пазней нашу мову скалечылі,
І пакаленні ад мовы адлучаны.

Вы — мае мілыя,
Вы — мае родныя,
Колькі было ў вас і крыўды, і слёз...
Вас пахваліў бы за мову народную
Мудры настаўнік — Алесь Белакоз.

Таварышы начальнікі,
Павышайце настаўніцам стаўкі,
Будуйце ім катэджы
І не чытайце натацый:
Калі мы страцім беларускіх настаўніц —
Знікне і ўся беларуская нацыя.

Трое

Паміж эпох,
Невыразных і шэрых,
Сярод пакутнікаў і герояў
У Беларусі было найвялікшых трое:
Каліноўскі,
Купала,
Машэраў.

Цяжка складаць пра найлепшых радкі:
Болем працяты ўсе мае строфы.
Нават шэпату іх не чутно: «Браткі»:
Каму пятлю накінулі,
Каго скінулі ў прорву,
Каго забілі ў аўтакатастрофе...

На плошчы каля Лукішак
На свой народ
Глядзеў перад смерцю Кастусь.
І плошча яго апошнім выдыхам дыша:
«Чуеш, Беларусь!»

А дзядзька Янка
Заўсёды ў турбоце
Аб родным народзе,
Каб навучыліся землякі
Людзьмі звацца.
Партызаны, партызаны,
Беларускія сыны
Пачалі, як волаты,
За волю змагацца.

Была вайна.
Да яго нахлебнікі лезлі.
А ён штодня пра Беларусь думаў:
«Новыя вершы напісаць пара»...
З дзевятага паверха
У пралёт паміж лесвіц
Скінулі нашага песняра.

А калі Пётр Міронавіч загінуў,
Доўга партызанскія ўдовы плакалі,
Бо яму аднаму толькі верылі;
Прыносілі на магілу кветкі
І ў спёку, і ў стынь...
Вуліца Каліноўскага,
Вуліца Купалы,
Праспект Машэрава
І яго журботная песня —
Хатынь.

□

Я цяжка захварэў: і грып, і запаленне...
Заместа сну — пякельнае трызненне:
Шторм у Атлантыцы, спякотная Сахара,
Агні Нью-Йорка, сцюжа Эверэста...
За што, за што найшла такая кара?
І ўсе вандроўкі зноў узніклі рэзка.

Усё ў жыцці люблю я і шкадую...
Сказаў унучцы Ксені недарэчна:
«Вось акрыяю і ў царкву пайду я,
Вялікую пастаўлю богу свечку».

«Куды табе, дзядуля? Сэрца... Ногі...» —
Дзіця пашкадавала...
З радасцю я сведчу:
Яна прызналася:
«Твайму старому богу
Паставіла ў царкве я ўчора свечку».

Мы ўсе з бязбожнага старога пакалення.
І вера ў нас была:
«За бацькаўшчыну ў бой!»
А сёння я ў нязвыклым захапленні
І міласэрнасцю, і чуласцю малой.

●

Не раз мы пад крывавымі сцягамі
Даверліва на вернасць прысягалі,
Не хітрасць — прысягнуць,
А мудрасць — дасягнуць.

Расійская імперыя,
Савецкі наш Саюз,
Калі ж ты скончыш песню
Жабрацкую сваю?

Мы хвалямі затоплены
Хлусні, маны, ілжы.
Калі па-чалавечаму
Пачнём усе мы жыць?

Злаба і раздражненне,
Разбойніцкі разгул...
І спее ў нашых сэрцах
Расплаты гнеўны гул.

Залатое кальцо Масквы

«У сваёй эканоміцы мы пабудавалі вар'яцкі дом і жывём па законах вар'яцкага дома».

Эканаміст М. ШМЯЛЕЎ.

«Цяпер ніводзін сышчык свету, ні Скотланд-Ярд, ні ЦРУ, ні наш паважаны Камітэт дзяржаўнай бяспекі — ніхто не дазнаецца, у якую прорву бухнула валюта, якую мы выручылі за заходне-сібірскую нафту (200 мільярдаў долараў). Гэтыя магутныя паступленні мы выкарысталі не для стварэння сучасных базісных і інструментальных галін эканомікі; галін, якія б забяспечвалі яе жывучасць і прагрэс, а неяк бяздарна праматалі, растранжырылі, прапілі, прафукалі — скажыце, як вы пажадаеце, таму што кожны тэрмін тут будзе на месцы і, на жаль, будзе правільным».

З гутаркі з членам Прэзідэнцкага Савета СССР акадэмікам С. С. Шаталіным: «Эканоміка крывых люстэркаў», «Огонёк», № 20, 1990 г.

Трохі панюхалі тэхнікі,
Пацёрліся ў агранаміі.
Сялянства абакралі ці знішчылі —
Вёскі сягоння нямыя.
Родную мову забылі
І затапталі спадчыну.
Усюды фонды, рахункі —
Быццам жывём ускладчыну.

Бурчаць дакладчыкі нудна
Пра плюралізм,
стагнацыю
і кансэнсус...
Пакорная наша нацыя
У першародным сэнсе.

Ніхто ў нас рабіць не жадае,
Толькі б трапіць у крэсла
З двайною зарплатай.
Астатніх
Няхай бы халера растрэсла.

Для мільёнаў Чарнобыль — згуба,
Ядзерная зіма.
А тут пятнаццаць рублёў на рукі —
І лейкеміі няма...

Што там нашы Дразды —
Глухая правінцыя!
А пад Масквой раскашуюць
Сапраўдныя нашы правіцелі.

Вёрстаў за дваццаць ці сораК —
Куткі залатыя за горадам:
Катэджы, палацы з басейнамі
Высяцца пекна і горда.

Гэта не дробныя соткі
Вашых садовых участкаў.
Тут жывуць генералы
І ўсё былое начальства.

Гэта для іх у Сібіры
Золата рыюць у горах.
Над гэтым багаццем лунае
Страх, і расплата, і гора.

Тысячы тут разбуральнікаў
І вымагальнікаў.
А дэфіцыт і валюта —
Усё для маскоўскіх начальнікаў.

Тут пражываюць Раманавы,
Грышыны і Медуновы,
Золата і ўзнагароды —
У тайніках адмысловых.

Тут і былыя міністры,
Зброд мафіёзна-панскі,
І чорныя планіроўшчыкі
Ганебнай вайны афганскай.

А хто вінаваты?
Не знойдзеш:
Заблытаны хітрыя сцежкі.
«Гдлян, Іваноў і Калугін» —
Кажуць з пагрознай усмешкай.

Няхай жыве «перастройка»!
На кожным вуглу перастрэлка:
З боем бяруць макароны,
З боем купляюць гарэлку.

Божа, дапамажы нам
Збегчы з вар'яцкага дома!
Жыць гэтак нельга!
Чакаем
Гнеўных маланак і грому.

Мініяцюра пра непатрэбнага халтуршчыка

Крытык Бэндэ калісьці
Прагнуў нашых Народных раструшчыць.
Час закрэсліў яго...
А цяпер новы цуд:
Атакуе сучасных паэтаў
Нахабны халтуршчык —
Асцярожна: Маеўскі!
Не наступіце на... бруд.

ВЯРНУЎСЯ ДА РОДНЫХ ВЫТОКАЎ

Паважаныя таварышы! Вось напісаў зварот, а як распачаць аб галоўным — не ведаю. Але ж спадзяюся, што вы мяне зразумееце.

Гэты маленькі верш (калі вы яго зможаце аднесці да вершаў) для мяне падзея асаблівая. Чаму? А вось паслухайце, калі ласка.

Я беларус. І бацькі мае, і дзяды, і прадзеды — беларусы. У 1941 годзе скончыў 8 класаў у сярэдняй школе гарадскога пасёлка Глуск. Пачалася вайна, і так здарылася, што практычна сувязь з беларускай мовай, з роднымі мясцінамі скончылася для мяне ў красавіку 1943 года, калі пасля цяжкага ранення я быў адпраўлены на Вялікую Зямлю з партызанскага аэрадрома ў Бягомлі.

Вярнуўся ў родныя мясціны праз 36 гадоў — у 1979 годзе, калі выйшаў на пенсію.

Працуючы на Поўначы, спрабаваў пісаць вершы, але на рускай мове. Штосьці атрымлівалася, і асобныя вершы друкаваліся ў мясцовым друку.

Дзесяцігоддзі адрыву ад Беларусі зрабілі сваю справу, і я ўжо, калі рыхтаваў артыкул альбо працаваў над вершам, думаў на рускай мове. Там, на далёкім паўночным усходзе, гэта было звычайнай з'явай, бо гэта была мова міжнацыянальных зносін.

У лютым 1986 года я пазнаёміўся з Нілам Гілевічам, і ён мне падараваў сваю кнігу «Родныя дзеці» з наступным надпісам: «Паважанаму Феліксу Уладзіміравічу Шкірманкову — слаўнаму лясному салдату, геолагу, сябру літаратуры — з самымі добрымі пажаданнямі ад аўтара».

Без перабольшання, прачытаў я кнігу на адным дыханні і адкрыў для сябе незвычайны талент аўтара — Чалавека, Паэта, Грамадзяніна. Паколькі вучыўся я ў беларускай школе, ды і гены, мабыць, спрацавалі, то не было цяжкасцей з чытаннем кнігі.

А ў хуткім часе змог ужо і пісаць на беларускай мове. Канечне, памылак было шмат, ды пачаў пісаць! Але думаў я ўсё ж на рускай мове, калі штосьці абмысліваў.

І вось здарылася тое, што я даўно з надзеяй чакаў, — склаліся першыя вершаваныя радкі на беларускай мове!

Вось такая падзея адбылася ў маім жыцці. Здарылася галоўнае: я вярнуўся да родных вытокаў. І з гэтай радасцю мне патрэбна было абавязкова падзяліцца менавіта з тым, хто мяне зразумее. І я выбраў «ЛіМ» за яго сапраўды грамадзянскую пазіцыю.

●

Каб паэтычную скарбонку
Неспадзявана адшукаў,
Тады б пра родную старонку
З сардэчным смуткам заспяваў.
Знайшоў бы ў ёй я тыя словы,
Што уздымаюць плынь душы.
Без іх не чутна роднай мовы,
Як ні мудруй, як ні пішы.

Ф. ШКІРМАНКОЎ.

г. Слаўгарад.

ШТО ГЭТА ЗА ПАЗІЦЫЯ?

28 ліпеня брэсцкая абласная рускамоўная газета «Заря» надрукавала ліст нейкага Л. Васіна, які гнеўна піша: «Не встречал белоруса, который не понимал бы по-русски. Для чего в Бресте вывесили аншлаги с названиями улиц на двух языках?» Васін адкрытым тэкстам выказвае сваю незадаволенасць тым, што назвы вуліц у беларускім горадзе Брэсце сталі давацца, прынамсі, і на беларускай мове. Можна толькі здзівіцца грубай нецярпімасці да беларускамоўных назваў гэтага аўтара. Але яшчэ больш здзіўляе і абурае каментарый супрацоўніка рэдакцыі В. Сарычава, які цалкам салідарызаваўся з Васіным. Сарычаў «праехаўся» па народных дэпутатах рэспублікі, якія прынялі Закон «Аб мовах у Беларускай ССР». У Законе сказана, што тапонімы (назвы населеных пунктаў, вуліц, плошчаў, рэк і інш.) даюцца на беларускай мове. Сарычаў робіць з гэтага глыбакадумны вывад: «Заметим, удовольствие оказалось недешевым: только изготовление одного аншлага стоит 8 рублей». Бачыце, як спрытна перавёў каментатар адраджэнне беларускай мовы і культуры на гаспадарчы разлік.

Дасталося ад Сарычава на арэхі і намесніку старшыні Брэсцкага гарвыканкома Л. Пірагоўскай: яна падпісала распараджэнне гарадскому вытворчаму аб'яднанню жыллёва-камунальнай гаспадаркі арганізаваць работу па добраўпарадкаванні ў адпаведнасці з законам назваў вуліц і плошчаў горада, пакінуўшы назвы толькі на беларускай мове. Драматызм сітуацыі ў тым, што ў Брэсце, дзе жывуць у асноўным беларусы, усе тапонімы напісаны толькі па-руску, аб чым добра вядома Сарычаву. У Брэсце, як і ў іншых гарадах Заходняй Беларусі, з 1921 па 1939 год праводзілася татальная паланізацыя, а з усталяваннем Савецкай улады ў 1939 годзе — татальная русіфікацыя. Адзіная абласная газета выдаецца на рускай мове.

Васін і Сарычаў фактычна пазбаўляюць беларусаў права пісаць назвы на сваёй нацыянальнай мове на той падставе, што беларусы, маўляў, добра разумеюць па-руску. Што гэта за пазіцыя, думаю, тлумачыць, сёння не трэба.

Здзіўляе і непатрыятычная, блізарукая пазіцыя намесніка рэдактара «Зари» В. Шпарла, за подпісам якога выйшаў гэты нумар газеты.

К. САЕВІЧ,
В. КРАЎЧУК,
студэнты.

г. Брэст.

УШАНАВАЦЬ ПАМЯЦЬ ВУЧОНАГА

Вядомы рускі вучоны-літаратуразнаўца, аўтар больш пяці тысяч друкаваных аркушаў па рускай класічнай літаратуры і беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя Іван Іванавіч Замоцін працяглы час працаваў прафесарам Вышэйшага педагагічнага інстытута (цяпер Мінскі педінстытут імя М. Горкага). Ён у 1942 годзе загінуў у турме г. Горкага. Некалькі год таму назад на задворках 2-га корпуса педінстытута ўстаноўлена мемарыяльная дошка наступнага зместу: «Здесь работал известный ученый-литературовед, академик АН СССР, член-корреспондент АН БССР Иван Иванович Замотин». У гэтым надпісу ўкралася значная памылка, трэба было напісаць: «Здесь работал известный ученый-литературовед, член-корреспондент Академии наук СССР, академик АН БССР Иван Иванович Замотин». Гэту памылку патрэбна паправіць.

Іван Іванавіч Замоцін, памятаю, заўсёды хадзіў праз фасадны ўваход у галоўны корпус (які апошнім часам надбудаваны). Мемарыяльную ж дошку паставілі на задворку 2-га корпуса. Свае ж цудоўныя лекцыі вучоны чытаў у актавай зале галоўнага корпуса. Лічу патрэбным абавязкова перанесці мемарыяльную дошку, якая б ушаноўвала памяць выдатнага вучонага, і ўмацаваць яе (канечне, выпраўленую) на сцяне каля параднага ўваходу ў будынак галоўнага корпуса педінстытута.

Я. ГАВАРУШКА,
выпускнік педінстытута.

г. Смалявічы.

ШТОСЬЦІ НЕ ВЕРЫЦЦА

Нягледзячы на нацыянальнае адраджэнне ў Беларусі, чамусьці радыё Мінска ў многім застаецца на ранейшых пазіцыях. Асабліва, мусіць, выразна гэта адчуваецца па-за межамі рэспублікі. Раніцай уключаеш мінскую хвалю (чамусьці толькі на доўгіх хвалях 1068 м) і замест беларускага слова чуеш трансляцыю з Масквы: то праграму «Утро», то гімнастыку (і ці трэба ўвогуле радыё-гімнастыка, колькі жыву, не бачыў, каб хто пад радыё яе рабіў), то паведамленні з Масквы, то агляд маскоўскіх газет. Толькі тры рэспубліканскія інфармацыйныя выпускі за ўвесь дзень можна пачуць. Міжнародная праграма інфармацыі таксама толькі з Масквы. Ці ж так гэта цяжка — перадаць навіны па-беларуску? Увогуле мова, на якой вядуцца перадачы, часта жудасна скалечана дыктарамі. Няўжо ў Мінску нельга знайсці людзей з правільным вымаўленнем? Можна, аядома. А паслухайце так званыя рэпартажы, інтэрв'ю. Журналісты часцей задаюць пытані па-беларуску, а ім адказваюць амаль заўсёды (нават жыхары далёкіх ад Мінска сельсаветаў) па-руску. А нядаўна была перадача з Мазыра, дык там і журналісты задавалі пытанні па-руску, і адказ атрымлівалі таксама на гэтай жа мове. Няўжо ў Мазыры ўжо ніхто не гаворыць па-мясцоваму? Штосьці не верыцца.

М. РАСЕВІЧ.

г. Вільнюс.

ДОШКА СВЕДЧЫЦЬ

Я не выпісваю часопіс «Политический собеседник». Але апошні нумар за 1989 год купіў у кіёску, бо ўбачыў на вокладцы партрэт саліста Дзяржтэлерадыё Яраслава Еўдакімава.

Разгарнуў гэты часопіс — і аж жахнуўся, — там «разгромны» артыкул Т. Бумажковай пра «фашысцкіх лёкаяў», перасыпаны шматлікімі здымкамі. І дзе яна ўзяла іх, гэтыя фатаграфіі?

Бумажкова свядома ловіць рыбу ў мутнай вадзе — змяшала ў кучу розных людзей. Я не гісторык і не хачу даваць ацэнку ўсім дзеячам, што на здымках, гэта зробяць кампетэнтныя, не кранутыя сталінісцкім свербам, вучоныя. І ўсё ж скажу: ну, навошта было даваць асобны партрэт «прэзідэнта» БЦР Радаслава Астроўскага? Я (ды не толькі я) ведаю гэтага здрадніка беларускага народа даўно. Гэта ён у 1928 годзе аддаў на расправу паліцыі буржуазнай Польшчы сотню вучняў (у тым ліку і мяне) Віленскай беларускай гімназіі, дзе быў дырэктарам.

У «Собеседнике» далі шмат фотаздымкаў, каб у гэтым эшалоне лягчэй было ганьбаваць, скажам, старэйшую беларускую пісьменніцу Зоську Верас: маўляў, і яна такая, як Астроўскі? А яна за свой доўгі век зрабіла шмат добрага для беларускай культуры. Або ўзяць нашу значна маладзейшую таленавітую паэтку Дануту Бічэль-Загнетаву. Як можна ставіць яе побач з тым жа Астроўскім? Ды гэта, відаць, не так важна для «аб'ектыўнасці» «Собеседника», галоўнае — Бічэль-Загнетава не так думае, як Бумажкова.

Пра «Собеседник» і Бумажкову (не адна яна такая барзапіска) не пісаў бы, каб не было ў ім пераклічкі з іншай партыйнай прэсай у сувязі з гадавінай абвяшчэння БНР 25 сакавіка 1918 года. Стваральнікі БНР абвінавачваюцца ў тым, што абвяшчэнне адбылося пад эгідай нямецкіх захопнікаў. У «Собеседнике» чытаем подпіс пад здымкам: «Рада БНР у Вільні (створана кайзераўскімі акупантамі)».

Трэба зазначыць, ёсць доказы, што Раду БНР стварылі без немцаў.

А вось дакументальны прыклад, які, мякка кажучы, пабівае «доказы» розных «Собеседников» аб немагчымасці стварыць у час кайзераўскай акупацыі нешта нацыянальнае або рэвалюцыйнае. На старым будынку Дома культуры ў Слоніме доўгі час вісела мемарыяльная дошка (цяпер захоўваецца ў краязнаўчым музеі), на якой значыцца: «Тут 9 снежня 1918 года праходзіў 1-шы павятовы з'езд Саветаў рабочых і сялянскіх дэпутатаў» (глядзі здымак). У гісторыка-эканамічным нарысе «Слонім» (Мінск, «Беларусь», 1981) напісана, што «...на з'ездзе быў выбраны выканком Савета, у састаў якога ўвайшло 9 чалавек. Шэсць з іх былі бальшавікамі».

А што ў тым годзе рабіў для беларусаў сакратар Паўночна-Заходняга абкома РСДРП(б) Кнорын? Вось яго словы: «Мы считаем, что белорусы не являются нацией и что те этнографические особенности, которые их отделяют от остальных русских, должны быть изжиты».

Што ж, сёй-той «изживает» і цяпер...

Адкуль бярэцца ў журналісткі Бумажковай столькі злосці, ядавітасці да нас, беларусаў, што мы хочам «людзьмі звацца», жыць самастойна, карыстацца сваёй роднай мовай, развіваць родную культуру?

Пры аказіі зазначу: мяне не мабілізавалі, я добраахвотна ўключыўся ў стварэнне падполля на Слонімшчыне, быў партызанам. І ваяваў супраць ворага не дзеля таго, каб гітлераўскі генацыд замяніць на сталінскі, а дзеля таго, каб наша шматпакутная Беларусь была свабоднай дэмакратычнай рэспублікай.

Анатоль ІВЕРС.

г. Слонім.

ЯШЧЭ АДНА «БІТВА»?

(Пачатак на стар. 1).

ўвесь райком удзельнічае ў жніве, а адзін з сакратароў нават заваяваў першынство сярод камбайнёраў гаспадаркі), — справа ў сістэме. Гэта сістэма спланавала, скажам, тую ж прывозку заакіянскага хлеба акурат у час жніва, у выніку чаго чыгуначны транспарт, аўтамашыны, якіх не хапае для перавозкі ўласнага ўраджаю, былі мабілізаваны на абслугоўванне замежных збожжавозаў. Скажам, у Мінскай вобласці, напрыклад, няма як транспартаваць убранае збожжа з-за адсутнасці паловы патрэбнай колькасці транспартных сродкаў. Як зноў жа вінавата сістэма ў хранічным недахопе запасных частак (з-за чаго прастойвае сельскагаспадарчая тэхніка), аўтамашын, элеватараў, сушыльных установак, паліва і да т. п. (я бяру толькі сельскагаспадарчыя аспекты).

Ці ёсць зараз саўгас або калгас, які б у роспачы не падаваў адчайных сігналаў «SOS» — просім тэрміновай дапамогі з горада, інакш ураджай загіне. Гэта яшчэ адно (далёка не адзінкавае) сведчанне банкруцтва калгасна-саўгаснага ладу. І ўсё роўна не пераводзяцца ў нас трубадуры, якія нястомна ўслаўляюць сістэму, якая даўно паказала сваю няздольнасць, няўменне вывесці краіну з хранічнага голаду.

Будзем спадзявацца, што сумеснымі намаганнямі — пры дапамозе заводаў, фабрык, арміі — краіна сёлета ўсё-такі будзе з хлебам. Будзе выіграна яшчэ адна «бітва». Але ж колькі можна жыць на адных кісла-родных падушках? Калі ж мы дадзім магчымасць селяніну нарэшце ўздыхнуць на поўныя грудзі, праявіць сваю багатырскую сілу, паказаць, на што ён здатны?

Міхась ЗАМСКІ.

Спрэчкі, палеміка

Валянцін АКУЛАЎ

...і назвалі курыцу карасём

Матэрыялістычная дыялектыка і марксісцка-ленінская канцэпцыя сацыялізму

ТОЙ, хто цікавіцца філасофіяй, пагодзіцца: ніколі яшчэ матэрыялістычная дыялектыка не падвяргалася такой масіраванай крытыцы. Што ж — адзнака часу. І не толькі адзнака, але і наказ часу. Мы праводзім сёння глабальную інвентарызацыю нашай духоўнай спадчыны, і, трэба шчыра сказаць, далёка не ўсё, што лічылася неаспрэчнай ісцінай і каштоўнасцю самай высокай пробы, адпавядае крытэрыям навуковасці, дабра і прыгажосці. Не бачу таму ніякай прычыны для таго, каб не падвергнуць такой жа строгай рэвізіі і нашу філасофскую гаспадарку.

Аднак неабходна, напэўна, прызнаць і іншае: самі крытэрыі, з дапамогай якіх мы правяраем нашы каштоўнасці, у сваю чаргу, павінны быць дыхтоўныя. Вагамі, якія хлусяць, нічога толкам не ўзважыш і ўзровень радыяцыі дазіметрамі для паўсядзённага карыстання, якія сям-там у нас паявіліся, таксама не вымераеш. З дапамогай якога ж крытэрыю мы правяраем ісціну матэрыялістычнай дыялектыкі? Адказ відавочны: такім крытэрыем служыць «вопыт сацыялістычнага будаўніцтва». У грамадскай думцы надзейна сцвердзілася перакананне, што філасофскім падмуркам марксісцка-ленінскай канцэпцыі сацыялізму з'яўляецца матэрыялістычная дыялектыка. І калі ўзведзены намі «светлы будынак сацыялізму» аказаўся зусім не хорамам, а самай звычайнай казармай, дык ці не відавочна, што і сам падмурак, на якім ён стаіць, нікуды не варты? Тут усё лагічна. Бо сувязь паміж сацыялізмам Маркса — Леніна і матэрыялістычнай дыялектыкай не прыдумана кімсьці. Яе заўсёды падкрэслівалі і Маркс, і Энгельс, і Ленін. Шкада толькі, што нікому не прыходзіла ў галаву ўсумніцца, ці так гэта. Яно, скажам, сумненні прыходзілі, але што ў тым толку? Самая кволая спроба выказаць іх уголас мела б адзін вынік: такая нестандартная галава тут жа апынулася на пласе разам са сваімі сумненнямі, гэта значыць, раней, чым гэтыя сумненні сталі б здабыткам грамадскасці.

Я падкрэсліваю: зусім не банальная баязлівасць, а абсалютная немагчымасць зрабіць здабыткам грамадскасці вынікі сваёй працы вымушала многіх філосафаў адыходзіць у палітычна нейтральныя сферы сваёй навукі — у фармальную і дыялектычную логіку, метадалогію навукі і г. д., карыстацца эзопавай мовай, расшаркваца і раскланьвацца нават тады, калі ў тым не было аніякай патрэбы. Зрэшты, я памыляюся, патрэба была, але надзвычай асаблівая: трэба было кожны раз даказваць, што думка, выказаная табою, — гэта зусім не твая думка, што яна не больш чым вывад, выснова, якая безумоўна вынікае з вучэння Маркса — Леніна. Без такой санкцыі магчымасць для яе пабачыць свет рабілася ў вышэйшай ступені праблематычнай. Гаворка ідзе, вядома, пра філасафаў па прызванні, а не пра філасафаў па аказіі, зручным выпадку, якія пасля ўвядзення курса «навуковага камунізму», як рыба на нераст, павалілі ў філасофію. Яны і ўзбагацілі нас «развітым сацыялізмам», «новай гістарычнай супольнасцю» і іншымі такімі ж дзівоснымі адкрыццямі.

Я вымушаны гаварыць пра гэта вось з якое прычыны. Ні для кога не з'яўляецца сакрэтам, што ўсе гэтыя доўгія дзесяцігоддзі вярхушка КПСС глядзела на грамадазнаўцаў як на пазаштатных работнікаў свайго апарату. Тым больш нечаканай і хваравітай аказалася для яе «здрада» часткі філасафаў, гісторыкаў, эканамістаў. Як жа так, недаўмяваў партыйны функцыянер: ну выступае з крытыкай КПСС і яе ідэалогіі мастацкая інтэлігенцыя — дык ёй і па штаце належыць. Вядомая рэч — «дысідэнты»! Да ўсяго — што яны разумеюць у высокай тэорыі?! Але ж гэтыя, гэтыя! Ускормлены на марксісцка-ленінскіх харчах, аблашчаны самым высокім партыйным начальствам — гэтым чаго не хапае, каб хто сказаў?

Партыйнага функцыянера можна зразумець: прафесіянал-філосаф ці прафесіянал-эканаміст — гэта вам не рэжысёр М. Захараў і нават не пісьменнік А. Адамовіч, тут не спашлёшся на марксісцка-ленінскую некампетэнтнасць. Патрэбны нейкія іншыя спосабы нейтралізацыі. І вось паяўляюцца на свет божы ўладалюбы афанасьевы, шастакоўскія, паповы і іншыя фарысеі і марксапрадажнікі. З нейкае пары ў гэтую кагорту ўладалюбаў і фарысеяў трапіў і я — ваш, чытач, паслухмяны служка.

У сёмай кніжцы «Политического собеседника» за сёлетні год апублікаваны артыкул адказнага сакратара часопіса І. Рыжкова «Рэйтынг фарысейства», які падводзіць вынікі прайшоўшых выбараў у органы дзяржаўнай улады. Выказаўшы здзіўленне з выпадку «бязмежнай магчымасці чалавека пераўвасабляцца», аўтар, аднак, не дранцвее, як тыя гогалеўскія героі ў тым самым сваім здзіўленні. Ён пачынае «разважаць: як? што і чаму?» На жаль, высновы, да якіх прыходзіць І. Рыжкоў у выніку ўсіх гэтых пакутлівых разваг, пераконваюць толькі ў адным: узяўся чалавек зусім не за сваю справу. Трэба мець сапраўды апаратны стыль мыслення, каб угледзець корань складаных і супярэчлівых працэсаў, над якімі аўтар так неабачліва ўзяўся «разважаць», у сістэме «падрыхтоўкі і расстаноўкі кадраў».

Тое, што гэтая сістэма заганная,—ісціна, якая не вымагае доказаў. Тое, што яна спараджае невуцтва, уладалюбства і фарысейства,—гэта таксама нікому даказваць не трэба. У гэтым усе маглі пераканацца, слухаючы трансляцыю з XXVIII з'езда КПСС. Тое, што наменклатурная абойма—дзецішча гэтай сістэмы—абзавялася ліпавымі вучонымі ступенямі і званнямі,—хто ж гэтага не ведае?! Але прычым тут хоць бы той жа Ю. Хадыка, якога І. Рыжкоў, верны традыцыям свайго часопіса, аблівае памыямі? Якое ён мае дачыненне да сістэмы «падбору і расстаноўкі кадраў»? Хіба Ю. Хадыка ўваходзіў калінебудзь у лік наменклатурных работнікаў? Хіба пісаў дысертацыі на актуальную тэму «развітага сацыялізму», пра вельмі цяжкую, хоць і ў вышэйшай ступені неэфектыўную дзейнасць КПБ па інтэрнацыянальным выхаванні? Сам І. Рыжкоў гаворыць, што Ю. Хадыка—доктар фізіка-матэматычных навук. Не ведаю, як вам, чытач, а мне штосьці не даводзілася чуць, каб хоць адзін партыйны ці іншай епархіі функцыянер абараніў дысертацыю па матэматыцы ці фізіцы. Яны распрацоўвалі іншыя сюжэты. Тыя самыя, пра якія піша І. Рыжкоў. Але адкуль узяў наш суровы крытык, што гэтыя людзі знаходзяцца ў апазіцыі да КПСС і марксісцка-ленінскай ідэалогіі? Наадварот, яны, як ніколі, верныя «прынцыпам», «яшчэ цясней з'ядналі шэрагі». Мы мелі магчымасць бачыць гэты «маналіт» на расійскім і саюзным з'ездах КПСС. Хто не бачыў—хай паглядзіць пасяджэнні Вярхоўнага Савета, усё роўна якога — саюзнага ці нашага, рэспубліканскага. Дык дзеля чаго ўвесь гэты сыр-бор з сістэмай «падрыхтоўкі і расстаноўкі кадраў»? І. Рыжкоў, аднак, ведае, што да чаго. У яго, як у добрага мастака слова: калі ёсць стрэльба, яна абавязкова павінна стрэліць. І яна стрэліла: «Ну, можна неяк зразумець такіх, як Суша. Усім ясна, якому богу яны моляцца. Можна, нарэшце, зразумець лідэраў БНФ. Для іх КПСС—вораг нумар адзін. Яны гэтага ніколі не хавалі і, як маглі, ачарнялі партыю. Але як зразумець такіх, як заўсёдны «апанент» «Политического собеседника» доктар філасофскіх навук, прафесар В. Акулаў, які «прыпыніў» сваё членства ў партыі? Ужо ж ён, як кажуць, вырас з партыйных пялёнак, доўгі час працаваў у партапараце і па сённяшні дзень зарабляе хлеб марксізмам-ленінізмам, узначальваючы кафедру філасофіі ў Мінскім інстытуце замежных моў. Як жа вызначыць, калі В. Акулаў больш двурушнічаў—раней ці цяпер?»

Гэта амаль даслоўнае ўзнаўленне таго, што пісалася пра мяне, у вершах і ў прозе, у паклёпніцкіх лістоўках у часе выбараў у Вярхоўны Савет БССР. Там таксама сцвярджалася, што за час работы ў Краснадарскім крайкоме КПСС В. Акулаў вырас ад інструктара да намесніка загадчыка аддзела, абараніў кандыдацкую і доктарскую дысертацыі, быў ледзь не правай рукой тагачаснага першага сакратара С. Медунова. Ды чаго толькі там не пісалася! Апошні залп скунса ў гэтай масіраванай кампаніі даў малочны брат «Политического собеседника» «Вячэрні Мінск», які апублікаваў напярэдадні галасавання наскрозь хлуслівы пасквіль «Дастойнымі і недастойнымі метадамі». І калі я чытаю сёння прасякнутыя высакародным абурэннем радкі І. Рыжкова наконт недазволеных прыёмаў, якімі карысталіся ў час выбараў «уладалюбы з БНФ», у мяне чамусьці ўвесь час круціцца ў галаве маналог Рапяцілава:

...Ночной разбойник, дуэлист.
В Камчатку сослан был,
вернулся алеутом,
И крепко на руку нечист;
. . . . . .
Когда ж об честности высокой
говорит,
Каким-то демоном внушаем:
Глаза в крови, лицо горит,
Сам плачет, и мы все рыдаем.

Я ніколі не абараняюся. Не адказваў калегу І. Рыжкова па часопісе Я. Сямашку. Прамаўчаў і тады, калі ў тым жа «Политическом собеседнике» паявілася падборка «пісьмаў працоўных», што тычыліся маёй асобы. Не таму, вядома, што быў спляжаны палемічным мастацтвам «Политического собеседника». Наадварот, там, як сказалі б французы, і кату на сняданак не хапіла б. Проста я прытрымліваюся парады Д. Пісарава. «Гэты занятак, — пісаў ён, — сумны, клопатны і няплённы. Трэба валаводзіцца з заблытанай аргументацыяй праціўніка, лавіць яго з доказамі злачынства на кожным сафізме, трэба звяраць яго ілжывыя сцвярджэнні з арыгінальнымі дакументамі, трэба разглядаць пад мікраскопам такую дрэнь, да якой агідна дакрануцца, і, нарэшце, коштам такой працы, што прыводзіць да марской хваробы, даводзіцца купіць той нікчэмны вынік, што нейкі *N* дурны, як корак, а М хлусіць не горш за ўсякага барона Мюнхгаўзена».

Я і цяпер не здрадзіў бы свайму правілу, калі б справа тычылася мяне асабіста. Але ж гаворка зусім не пра мяне. Стаў бы, дальбог, орган ЦК КПБ займацца нейкім «адшчапенцам»! Тут, як я ўжо гаварыў, цэлая палітыка, выкліканая масавым выхадам з КПСС, асабліва людзей, што займалі калісьці ці і сёння яшчэ займаюць пэўнае грамадскае становішча, г. зн. людзей, на якіх «сістэма» *магла*, здавалася б, цалкам спадзявацца. У добры, стары час ніякай асаблівай палітыкі тут не трэба было. Цяпер жа — не тое: да сцяны не паставіш, у ГУЛАГ не сашлеш, за мяжу не вытурыш, нават у псіхушку і то не пасадзіш. Застаецца адзін сродак—скампраметаваць. Даказаць, што ўсе гэтыя людзі, якія пакідаюць КПСС,—не больш чым палітычныя кан'юнктуршчыкі, фарысеі і ўладалюбы, што трымаюць нос па ветры. Адсюль—шабас, наладжаны ў свой час ванол Б. Ельцына і А. Сабчака, брудная валтузня ванол генерал-маёра А. Кулагіна, прафесара У. Шастакоўскага і інш. Палітыка неразумная, як, зрэшты, і ўсё, што робіць апошнім часам партыйная бюракратыя. Але нейкую частку людзей, хай нязначную, яна зможа збіць з толку. Менавіта разуменне гэтага і вымусіла мяне, аднінуўшы гідлівасць, адказаць «Политическому собеседнику».

У тым маім паслужным спісе, які прыводзіць І. Рыжкоў, адпавядае сапраўднасці толькі адно: я на самай справе працаваў пэўны час у Краснадарскім крайкоме КПСС, спачатку кіраўніком лектарскай групы, а пасля намеснікам загадчыка аддзела. Усё астатняе — гульня ўяўлення аўтара артыкула.

І. Рыжкоў сцвярджае, што В. Акулаў «вырас з партыйных пялёнак, працяглы час працаваў у партапараце». На самой жа справе пачаў я працаваць у калгасе, так што паспеў зведаць смак «палачнага» шчодрага працадня. Скончыў Кішынёўскі універсітэт. Працаваў у сельскай школе настаўнікам. Пасля сканчэння аспірантуры выкладаў эстэтыку і філасофію ў Кішынёўскім інстытуце мастацтваў. У Краснадар пераехаў у 1970 годзе, будучы ўжо кандыдатам навук. Працаваў у Краснадарскім політэхнічным інстытуце. У Краснадарскі крайком КПСС быў запрошаны ў 1972 годзе. Прыйшоў туды ўжо з гатовай у чарнавіку доктарскай дысертацыяй. З крайкома пайшоў пасля шматлікіх просьб «адпусціць душу на пакаянне» ў 1977 годзе, не прарабіўшы там і пяці гадоў. Доктарскую дысертацыю абараніў у Інстытуце філасофіі і права АН БССР у 1983 годзе, працуючы дацэнтам МДПІЗМ, г. зн. абарона адбылася праз 6 гадоў пасля маёй работы ў крайкоме і праз чатыры гады пасля ад'езду з Краснадара.

Я пытаюся І. Рыжкова: дзе ж «партыйныя пялёнкі», з якіх я быццам бы вырас? Прыйшоў я ў крайком, будучы кандыдатам навук і маючы за плячамі 10 гадоў вузаўскай працы. Пайшоў з крайкома тым жа кандыдатам. Дарэчы, менавіта работа ў крайкоме адтэрмінавала маю абарону доктарскай прынамсі на гадоў 7—8. Дзе мая працяглая праца ў апараце? З больш чым 30-гадовага рабочага стажу мая праца ў крайкоме складае менш чым пяць гадоў.

Цяпер адносна двурушнасці. Мая кандыдацкая дысертацыя, абароненая ў Ленінградзе ў 1965 годзе, была прысвечана эстэтыцы Г. В. Пляханава. Кампетэнтныя людзі ведаюць, што «сістэма» не пасціла гэтага «апартуніста» і «рэнегата марксізму». Менавіта таму, нягледзячы на бліскучую абарону, мая дысертацыя з рыпам прайшла ВАК. Пры жаданні І. Рыжкоў можа пацікавіцца, які быў афіцыйны пункт гледжання на Пляханава ў 1965 годзе, і якая была пазіцыя, што адстайваў у сваёй дысертацыі я. Тэмай маёй доктарскай дысертацыі была праблема субстанцыі, якая, наколькі я магу меркаваць, не знаходзіцца ані ў якім, нават самым далёкім, сваяцтве ні з «развітым сацыялізмам», ні з сацспаборніцтвам, ні з інтэрнацыянальным і патрыятычным выхаваннем.

За гэтыя гады мною апублікавана больш чым 60 навуковых і навукова-публіцыстычных прац, у тым ліку тры манаграфіі. Калі ўжо І. Рыжкоў узяўся быць маім асабістым біёграфам, хай знойдзе ў іх хоць бы адну фразу захаплення «нашай роднай савецкай рэчаіснасцю», хай знойдзе хоць бы адно ўпамінанне пра Хрушчова ці Брэжнева, «гістарычныя рашэнні» партыйных з'ездаў, хай, урэшце, знойдзе хоць што-небудзь, што магло б кінуць цень на мой навуковы аўтарытэт ці чалавечую прыстойнасць. Не знойдзе. Было іншае. Мая першая манаграфія «Філасофія, яе прадмет, структура і месца ў сістэме навук» была забаронена да рэалізацыі. Пра тое, як праходзілі адзве іншыя манаграфіі, хай І. Рыжкоў пацікавіцца ў выдавецтве «Універсітэцкае». Я ж працытую толькі адну мясціну з рэцэнзіі, дадзенай на маю другую кнігу калегам І. Рыжкова, праўда, з другога, цэнтральнага партыйнага часопіса: «Уся супраць Маркса, уся супраць Леніна». Гэта было сказана ў 1984 годзе».

І, нарэшце, апошняе. І. Рыжкоў сцвярджае, што В. Акулаў «па сённяшні дзень зарабляе хлеб марксізмам-ленінізмам, узначальваючы кафедру філасофіі ў Мінскім інстытуце замежных моў». Я сапраўды ўзначальваю кафедру філасофіі ў гэтым інстытуце. Але пры чым тут «марксісцка-ленінскі хлеб»? Няўжо універсітэцкая няня не давяла І. Рыжкову, што філасофія не з Маркса пачалася і не Марксам скончыцца? На кафедры я чытаю курсы гісторыі філасофіі і дыялектычнага матэрыялізму. Сёлета маю намер чытаць яшчэ і курс гісторыі сусветнай і айчыннай культуры. Спадзяюся, І. Рыжкова не трэба пераконваць, што гісторыя філасофіі не складаецца з двух імёнаў—Маркса і Леніна. Ды і культура бярэ свой пачатак не з рамана М. Горкага «Маці». Што тычыцца дыялектычнага матэрыялізму, дык зноў-такі ён сваімі каранямі цягнецца прынамсі да Геракліта і, значыць, звязваць яго толькі з імем Маркса няма аніякіх падстаў. Па сакрэту магу сказаць І. Рыжкову: асабіста я вялікі прыхільнік пантэізму Б. Спінозы. Зрэшты, які тут сакрэт: гэта добра ведаюць усе мае калегі-філосафы ў Саюзе. Праўда, Б. Спіноза—яўрэй, і гэта можа павялічыць непрыязнасць да мяне «Политического собеседника». Ды тут ужо нічога не зробіш.

У заключэнне мне хацелася б усё-такі ведаць: каму адрасаваны палец І. Рыжкова, што паказвае на месца маёй працы? Ці не намёк гэта «кампетэнтным органам» узяць прыклад з Маскоўскага ГК КПСС і правучыць марксісцкага расстрыгу? Калі так, дык я вымушаны засмуціць пільнага аўтара: ён спазніўся гады на два, калі не на ўсе пяць. Так што палец давядзецца скарыстаць дзеля іншых патрэб.

Але, як прынята ў такім выпадку гаварыць, пакінем нашых бараноў і пяройдзем да сутнасці справы.

Дык вось, я сцвярджаю, што марксісцка-ленінская канцэпцыя сацыялізму не толькі не вынікае з прынцыпаў і законаў матэрыялістычнай дыялектыкі, але ў многім знаходзіцца з ёй у зусім не дыялектычнай супярэчнасці.

Пачаць, пэўна, трэба з высвятлення таго, што ж уяўляе сабой канцэпцыя сацыялізму Маркса—Леніна. Пытанне далёка не пустое і, тым больш, не акадэмічнае. І вось чаму. Аб'яўленая ў 1985 годзе ў краіне перабудова — ці не прызнанне гэта краху і палітыкі пабудовы сацыялізму, і той ідэалогіі, якая ляжала ў падмурку гэтай палітыкі? Здавалася б, толькі такі вывад і павінен зрабіць кожны непрадузяты чалавек, які хоча стаяць на глебе рэальных фактаў. Аднак давайце звернемся да апошніх дакументаў той партыі, якая нясе прамую адказнасць за правядзенне гэтай палітыкі. У яе праграмнай заяве «Да гуманнага, дэмакратычнага сацыялізму» чытаем: «З'езд лічыць: глыбінныя крыніцы краху не ва ўшчэрбнасці самой ідэі сацыялізму, а ў тых дэфармацыях, якім яна падвергнулася ў мінулым». Калі прыняць да ўвагі, што ў дакументах з'езда неаднаразова падкрэсліваецца вернасць марксізму-ленінізму, які па-ранейшаму абвяшчаецца ідэйна-тэарэтычнай асновай КПСС, дык мы атрымаем наступнае. Не грамадства падвергнулася дэфармацыям у выніку таго, што КПСС на працягу сямі з гакам дзесяцігоддзяў спрабавала будаваць сацыялізм у адпаведнасці з мадэллю, прапанаванай Марксам—Леніным. Дэфармацыям падвергнулася сама гэтая мадэль. І ўжо як вынік гэтага мы атрымаем тое, што атрымалі: таталітарная дзяржава ў духу старых усходніх дэспатый. Інакш і прасцей кажучы: вінаваты не архітэктар, што распрацаваў недасканалы праект, вінаваты будаўнікі, што адступілі ад праекта.

У гэтым неабходна як след разабрацца. Вядома, што адной з крыніц, якія жывілі канцэпцыю Маркса, быў сацыялізм Сен-Сімона, Фур'е, Оўэна. Аднак, падзяляючы асноўныя ідэі гэтага сацыялізму, Маркс тым не менш лічыў яго зусім

(Працяг на стар. 12).

На тэму дня

КАЛІ ПАРУПІЦЦА...

Неўзабаве афіцыйна ўступіць у сілу Закон аб мовах у Беларускай ССР. Ледзь было не напісаў — павінен уступіць, бо за доўгія застойныя гады прызвычаіліся: усе вялікія і малыя справы вырашаюцца толькі пад прымусам адпаведных дырэктыўных органаў. Што-што, а пастановы яны прымаць умелі. А вось выконваць іх — на гэта часцей за ўсё забываліся. Ды, дзякаваць богу ці перабудове, час зараз іншы, і таму, трэба думаць, Закон аб мовах сапраўды ўступіць у сілу.

Але ён запрацуе па-сапраўднаму толькі ў тым выпадку, калі на яго пачнём «працаваць» усе мы, незалежна ад таго, якую пасаду займаем і які ўзрост маем. А паспрыяць Закону ўключацца ў жыццё ёсць нямала спосабаў. Адзін з іх, прытым даволі просты і досыць перспектыўны, мне падказала нядаўняя паездка на поўдзень. Правільней, палёт...

Праз нейкіх трыццаць хвілін, як наш «ТУ» ўзяў курс на Сімферопаль, мілая сцюардэса разам са шклянкай асвяжальнага напітку прапанавала нам і свежыя нумары газет. Разам з «Правдой», «Известиями», «Комсомольской правдой» былі тут і рэспубліканскія — «Советская Белоруссия», «Знамя юности»... А вось выданняў на беларускай мове, як вы ўжо здагадаліся, і ў паміне не было. Чаму ж? Хіба гэта быў нейкі спецрэйс, якім у Сімферопаль ляцелі іншаземцы? Не, звычайны рэйс па раскладу, і ляцелі адпачываць на поўдзень мінчане, сярод якіх мінімум палова — несумненна беларусы. Як тут не падкрэсліць і такую акалічнасць, што палёт гэты праводзіла не нейкая там «Люфтганза», а — Беларускае ўпраўленне грамадзянскай авіяцыі...

Той жа, хто ездзіць чыгункай, можа прывесці таксама нямала падобных прыкладаў. Праўда, сяды-тады чыгуначнікі за адпаведную плату могуць прапанаваць і сякія-такія беларускія выданні, найперш часопіс «Работніца і сялянка».

Думаецца, што «Саюздрук» і ўпраўленне грамадзянскай авіяцыі і чыгункі павінны пайсці насустрач адно аднаму і сумесна парупіцца аб тым, каб пасажыры ў небе і на зямлі мелі магчымасць чытаць выданні на беларускай мове. Хіба не знойдзецца жадаючых пачытаць «Звязду» ці «Чырвоную змену», «Голас Радзімы» альбо наш «ЛіМ»? Няўжо не прывабіць нікога свежы нумар «Працы», бюлетэня «Наша слова»?

Асабліва гэта тычыцца чыгункі. Тут і паездкі доўжацца суткамі, і груз тут на грамы не падлічваецца, можна ўзяць «на борт» і «Полымя», і «Маладосць», і «Нёман»...

Адным словам, трэба парупіцца...

ЛІМАВЕЦ.

«А піра як гучыць?»

Чытаючы пейзажную і экалагічную паэзію

У НАШ час экалагічных кантрастаў і хвароб, відавочна, не трэба і казаць, па якіх прычынах прырода застаецца адной з магістральных тэм сучаснай беларускай паэзіі. Родная прырода ўспрымаецца сённяшнімі паэтамі як неацэнны нацыянальна-духоўны скарб і Храм прыгажосці, які, на жаль, па віне чалавека месцамі занядбаны, забруджаны, а то і па-варварску апаганены. Пачынаючы ад М. Гусоўскага, Я. Коласа і да сённяшніх паэтаў, беларуская паэзія бачыць свет роднай прыроды як свет экалагічнай гармоніі, як унікальны космас нацыянальнага быцця.

Асабліва моцную завостранасць атрымала ў паэзіі пасля чарнобыльскай катастрофы экалагічная праблематыка. Радыеактыўная забруджанасць роднай зямлі ўзмоцніла ў паэтаў адчуванне трагічнага перакрыжавання смерці і жыцця як у свеце чалавечым, так і ў навакольным асяроддзі. Можна надоўга запыніцца на разглядзе паэтыкі прыродаапісанняў П. Панчанкі, А. Грачанікава, В. Зуёнка, М. Рудкоўскага, можна шмат гаварыць пра цікавую і арыгінальную натур-філасофію М. Танка ці пра язычніцка-купальскую паэзію прыроды Р. Барадуліна, вымагае асобнай гаворкі пейзажная лірыка Н. Гілевіча, Я. Сіпакова, Д. Бічэль-Загнетавай, Л. Дайнекі, В. Гардзея, М. Дуксы, К. Камейшы або яшчэ маладзейшых — Л. Галубовіча, Л. Дранько-Майсюка, У. Марука, А. Сыса, А. Пісьмянкова і іншых. Безумоўна, глыбіня лірычнага, філасофскага раскрыцця тэмы «чалавек і прырода» дасягаецца дзякуючы важкасці мастацкага і ідэйна-эстэтычнага зместу і ўзроўню паэтычных твораў. Аднак у сучаснай лірыцы, у творчасці асобных паэтаў даволі часта сустракаюцца сур'ёзныя мастацкія пралікі, недапрацоўкі, якія прыкметна зніжаюць эмацыянальную і эстэтычную сілу ўздзеяння паэтычнага слова на чытача. Зірнём жа крытычна на асобныя вершы аб прыродзе і паспрабуем выявіць у іх найбольш тыповыя мастацкія недахопы.

Сучасны чалавек, як вядома, яшчэ мае мажлівасць прыпасці да крыніц першароднасці, неразгаданай казачнасці. Шматлікія куточкі прыроды поўніць багацце «і невядомых зыкаў, і невядомых рухаў...» (У. Марук). Ды гэта не паўсюдныя праявы беларускіх краявідаў.

Пейзаж маляўнічы — нічога
не скажаш.
Ды многа змянілася ў родным
пейзажы.
(А. Ставер)

Як бачым, выказаў паэт сваю думку досыць аголена-празаічна, бясстрасна. Далейшы тон, здавалася б, вымагаў адпаведных фарбаў, іншай інтанацыі. Але ў паэта ўжо не хапіла сіл узняць тэмпературу ні думкі, ні пачуцця.

Верш А. Ставера «Родны пейзаж» змешчаны ў зборніку яго выбранай паэзіі «Зоры зямныя». Пісаўся гэты твор, можа, і даўнавата, але тое, што яму бракуе свежасці, балючасці позірку на акаляючы свет, — відавочна. І такіх вершаў у сённяшняй паэзіі нямала. Насцярожвае, што паэты, асабліва маладыя, часта запыняюцца толькі на канстатацыі фактаў і вынікаў негатыўнага гаспадарання, выказваючы іх словамі-накшталт «няма», «прапала», «знікла», «змялела»...

Няма крыніц,
Няма ракі.
Засохла лотаць.
Няма за вёскай асакі.
Няма балота.

Гэта радкі Л. Пранчака з альманаха «Дзень паэзіі-88». Ці возьмем тыпова апісальны верш «Асвяціла нябёсы...» В. Шніпа. Паэту не хапіла заглыбленых разважанняў, няма ў вершы горычы і болю, якія бралі б за душу, знаходзілі шчыры водгук:

А на прызбе старыя
Зноў размовы вядуць
Пра былыя палеткі,
Пра лясы, пра ваду.
І ўсё хваляць былое...

Напэўна, мудрыя дзяды і бабулі маюць на тое падставы, каб выказваць захапленне былой красой, турбавацца пра агульныя нашы скарбы — доўгае жыццё пражылі яны на свеце. Як бы хацелася пачуць іхнія і паэтавы «неспакойныя думкі пра лясы, пра ваду...» Неабходна, відаць, ісці ўглыб асэнсавання экалагічных праблем.

Трэба сказаць, што асобным паэтам і больш сталага творчага ўзросту ў подступе да праблемы «чалавек і прырода» бракуе першароднасці, пачуцця ўдумлівасці, істотных адкрыццяў. Прачытаўшы, напрыклад, невялікі верш В. Жуковіча «У загарадным лесе», адразу згадваеш радкі з «Лясных воблакаў» П. Панчанкі, у якіх, прынамсі, гучыць узрушаны крык паэтавай душы: «Людзі! Пакіньце глядзець на паляны Прагным і хіжым сваім жыватом». У В. Жуковіча такой інтанацыі якраз няма, а ёсць толькі лабавыя звароты-воклічы да сумлення мяшчанства. Ды і згадка пра раскіданыя бляшанкі і сляды кастроў, якімі шмат гадоў назад надзвычай абуралася прэса, — простае паўтарэнне прапісной маралі.

О, вы мяшчане і мяшчанкі,
што гэтак цягне вас сюды,
дзе пасля вас — адно бляшанкі
ды дзікіх вогнішчаў сляды?!

Дзе вы ўзялі такую моду:
каб жываты ядой набіць,
ісці ў маўклівую прыроду
і ўсё жывое там губіць?!

Легкаважкасцю інтанацый вызначаецца і другі верш са зборніка «Твая місія» — «Мялеюць рачулкі і рэкі...».

Спусцілі ваду чалавекі,
і плачам цяпер, як бабры,—

кажа В. Жуковіч, нібы прыпамінаючы мясціны паэзіі П. Панчанкі: «горкі плач», «плачам бабрамі». Што ж гэта за такія «чалавекі», што за свет-псіхалогія ў іх — невядома, не адчуваецца ў вершы і болю, драматызму нашага плачу па прыродзе. Ствараецца ўражанне, што паэт вымучвае радкі, каб не адстаць ад «моднай» тэмы.

Альбо возьмем верш В. Жуковіча «Верыцца...», у рытмамелодыцы якога чуецца нейкая лёгкасць і недарэчная напеўнасць. Няхай даруе паэт, але неяк па-дзіцячы і досыць бясхмарна выказвае ён свае думкі і пачуцці:

Атулім зямельку садамі, лясамі
на радасць нашчадкам
(пацешымся й самі).
Не пусцім атруты ў рэкі, азёры.
Нідзе на паўторым Чарнобыля
гора.

Ды В. Жуковіч умее пісаць удумліва і кранальна, пра што сведчыць хаця б такі яго верш, як «На сумежжы».

Не прэтэндуе на першаадкрыцці часам і Л. Дайнека. У вершы «Як выказаць цябе?..» прырода для паэта — «вечнасць і свабода», «бура і спакой». Л. Дайнека пералічвае якраз усё тое, чым была пры-

У ХАТЫНІЧАХ, ПАСЛЯ ВАЙНЫ...

Л. Левановіч. Паводка сярод зімы. Раман, апавяданні. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1989.

З Андрэйкам Сахутам, галоўным героем новага рамана Леаніда Левановіча «Паводка сярод зімы», чытач знаёмы па папярэднім рамане «Шчыглы». Гэтаксама і з іншымі персанажамі. Тады, нагадаю, пісьменнік узнавіў падзеі трох цяжкіх ваенных і пасляваенных гадоў. Дзеянне адбывалася ў родных мясцінах аўтара—там, дзе цячэ Бесядзь. У характары ж Андрэйкі ўгадваліся аўтабіяграфічныя моманты. У карысць гэтага гаварыла і аўтарскае прысвячэнне — «Памяці маіх братоў — Хведара, Міхаіла, Міколкі і Толіка».

Пісьменніку ў цэлым удалося стварыць пераканаўчы малюнак народнага жыцця. Найбольшы поспех спадарожнічаў яму тады, калі апавядаў аўтар пра свайго галоўнага героя — аднаго з тысяч малалетніх пакутнікаў вайны, чыё дзяцінства яна апаліла, пазбавіла радасці і разам з тым не магла забраць аптымізму, веры ва ўсё лепшае. Удала была знойдзена і назва рамана — «Шчыглы». Гэтую птушку Андрэй Сахута ўпершыню ўбачыў яшчэ тады, калі ішлі апошнія баі, гарэлі навакольныя вёскі. Запомнілася хлопчыку: «грудка ў яго чырвонаячырвоная. Во як ета зарыва».

Я невыпадкова прыгадаў момант, звязаны з жыццём Андрэйкі Сахуты, бо і ў новым рамане найлепшыя старонкі тыя, дзе гаворыцца пра гэтага дапытлівага, няўрымслівага хлапчука. Л. Левановіч піша пра свайго героя з любоўю, адбіраючы найбольш значныя эпізоды з дзяцінства тых, хто сёння дасягнуў свайго пяцідзесяцігадовага перавалу. Андрэйка Сахута — па сутнасці той самы шчыгол, які, крыху аперыўшыся, прыглядаецца да наваколля, ці не ўпершыню сутыкаючыся з усімі складанасцямі жыцця. Хоць вайна і мінулася, ды многае, пасеянае ёю, засталося.

Ніяк не можа зразумець Андрэйка, чаму гэта ўсе з падазронасцю ставяцца да Нінкі Варонінай: «Ад маці, іншых дарослых Андрэйка чуў, што паліцай Варонін быў зверам, а яму ўсё роўна чамусьці шкада гэтай канапатай Нінкі». Задумваецца хлапчук над несправядлівасцю, па-свойму выпрацоўвае маральныя асновы ўзаемаадносін між людзьмі: «Мой бацька быў на фронце... Калі б ён там зрабіў нешта кепскае, дык няўжо б і мяне пасадзілі ў турму?»

Шкада яму і сястру Марыну, якая пасля заканчэння фельчарскага вучылішча працуе ў раённай бальніцы. Добрая, ласкавая, яна гатова заўсёды зразумець хлапчука, прыйсці на дапамогу. Вось толькі Марына адна. Хвалюецца і маці, што дачка векавухай можа застацца.

Адбываюцца, можна сказаць, уваходзіны Андрэйкі ў вялікае жыццё. Ён, у многім яшчэ бесклапотны і разам з тым не падзіцячы сур'ёзны, пастаянна вымушаны пераадольваць тую ваенную паласу, якая і ў яго лёсе, і ў жыцці аднавяскоўцаў ужо засталася ззаду, але тым не менш нязменна адчуваецца.

Л. Левановіч праз вобраз Андрэйкі паказвае традыцыйнае супрацьстаянне дабра і зла, жыцця і яго процілегласці — смерці. Робячы гэта, пісьменнік не абмінае таго негатыўнага, што ў пасляваенны час адбывалася ў вёсцы. Людзі, якія выстаялі перад лютым ворагам, адолелі яго, свята верылі, што разам з фашызмам адыдзе ў нябыт усё благое. Але, як і да вайны, былі ў многім сляпыя ў сваёй веры, не маглі і здагадвацца, адкуль ранейшая падазронасць, беды, жаданне сяготаго, кіруючыся высокімі мэтамі, звесці ўласныя рахункі.

Як і ў рамане «Шчыглы», у «Паводцы сярод зімы», на маю думку, Л. Левановічу найцяжэй удаецца суаднесці гэтыя два сюжэтна-тэматычныя пласты. З аднаго боку — лірычна-ўзнёслае, хоць і з гаркавінкай узнаўленне жыцця галоўнага героя, з другога ж — жыццё самой вёскі Хатынічы, усяго раёна. Канешне, цалкам апантанасць людзей працаю, стаўленне да яе, як да свята будняў, адмаўляць нельга. Так лёгка пайсці шляхам іншай крайнасці, бо першая, мы гэта памятаем, была ў пасляваеннай літаратуры з яе бесканфліктнасцю, з яе старшынямі-ардэнаносцамі, «кавалерамі залатой зоркі» і ўсім і заўсёды задаволенымі калгаснікамі, якім адкрываліся светлыя далі.

Наколькі ж у такім разе ў рамане праўда мастацкая суадносіцца з праўдай жыццёвай? Што Л. Левановіч імкнецца глядзець на тагачасныя падзеі з вышыні сённяшняга дня, сумняваецца не даводзіцца. Пераканаўчым атрымаліся вобразы першага сакратара райкома партыі Акапяна

рода для рамантыкаў: «Люблю спокойствие — но гнев ещё сильней» (Байран), «...Дышать со всей природой одним дыханьем, жить ее свободой», «И бурь земных, и бурь небесных вой...» (Лермантаў). На жаль, вершу не хапае сучаснай сэнсавай нагрузкі, выяўлення нечакана-арыгінальнага погляду на сённяшнюю прыроду. Бо паўтарыў паэт тое, што вынес не з уласнага асэнсавання, а з класічных паэтычных крыніц:

Усё лягло ў душу,
Усё запомніў я.
Ты—вечнасць і свабода,
Ты—бура і спакой.
Калі памрэш, прырода,
Памру і я з табой.

Здараецца, што Л. Дайнека «патанае ў плыні дэкларацый, што, урэшце, выклікае недавер да такіх сцвярджэнняў, як наступнае:

Я пасаджу лясы. Я воды
напоўню чыстым серабром.

Але поруч з гэтымі радкамі ў Л. Дайнекі шмат проста выдатных вершаў, строфы якіх лёгка запамінаюцца і згадваюцца: «Куст лазы, як зялёны спрут, Нетаропка на сцежку выходзіць...» ці «Спявае вецер. Пачалася весніфікацыя душы».

У сённяшняй лірыцы прыроды можна ўбачыць шмат шэрай сузіральнай апісальнасці, гладкай прычасанасці думак і пачуццяў. Гэткія вершы ёсць у паэтаў рознага творчага ўзросту. Напрыклад, асобныя верлібры-прыродаапісанні Х. Жычкі нудныя, паныла-празаічныя, хоць і прэтэндуе паэт часам на глыбіню філасофскай думкі. Гаварыць пра яркасць і важкасць лірычнага самавыяўлення ў вершах «Тапчу нагамі...» і «Калі мароз праймае да костак...» не прыходзіцца. Ад шырыні зрокавых вобразаў у межах аднаго невялічкага верша стамляешся. З'яўляецца адчуванне, што верш напісаны ў імя формы:

Калі мароз праймае да костак,
бяроза ўспамінае,
як летам
падбягалі да яе ног мяккія
травы,
на голле садзіліся птушкі,
спявалі,
а па лісціках поўзалі
ненажэрныя хрушчы.

Вецер прыносіць з поля
духмяны пах свежай пшаніцы.

«Рацыо» ўладна бярэ верх у некаторых творах пра прыроду Я. Сіпакова. У вершы «Дойлід» Дрэва жыцця малюецца паэтам як мірная і унікальная пабудова свету. Паэт лічыць, што чалавеку ёсць чаму павучыцца, што пераняць у гэтай разумна арганізаванай сістэмы прыродных сувязей:

Не парушаючы закон
геатрапізма
(карэнне—уніз, галіны—
строга ўгору),
Расці і будавацца. Трэба
помніць,
Што крона размяркоўвацца
павінна
Заўсёды па акружнасці ствала,
Разумна, раўнамерна...

Але ў працытаваных радках нельга не прыкмеціць, што сэнс думкі ляжыць на паверхні. Ад такога штучнага канструявання дыхае холадам разважлівасці, сухім рацыяналізмам.

Павярхоўнасцю ўражанняў, вонкавай апісальнасцю нярэдка грэшыць пейзажная лірыка В. Макарэвіча. Возьмем, напрыклад, верш «Пчала» з кнігі «Відушчы посах». У гэтым творы паэту не стае вобразна-паэтычнай глыбіні, адточанасці і культуры ў паэтыцы прыродаапісання. «Чадны смог» бачыцца паэту, «як прагавіты чорны цмок». Цяжка намаляваць, уявіць сабе гэтага цмока-пачвару, які

Ішоў няўпэўненай ступою,
Як раніцай туман з ляска,
І піў сасмяглую таполю
Аж да апошняга лістка...

У паэтавых апісаннях прыроды шмат шурпатасцей, бракуе выкшталцонасці радка: «спакой ажно да падаліста», «і ці то ў роспачы, ці ў страху, як аб лядок, аб ззянне шкла» і інш.

У паэтычнай кнізе С. Басуматравай «Званы чалавечнасці», калі казаць без рэверансаў, таксама хапае пасрэдных пейзажных малюнкаў. Бясспрэчна, ёсць у зборніку і творы, напісаныя рукой майстра, такія, як «Сасна», «Маёй рацэ», і інш. Вершу «Гракі прыляцелі» ўласціва агульшчына і размытасць пачуцця. Няма ў строфах гэтага твора яркай метафарычнасці, раскаванай ці скандэнсаванай пачуццёвасці. Паэтка хоча выгаварыцца і напісаць пра ўсё адразу:

А бачу:—Родны кут.
У неабдымнай сіні
Плыве касы прамень,
І вецер дзьме з ракі.
І пра жыццё шумяць
Знаёмыя вяршыні.
І пра любоў крычаць
Знаёмыя гракі.

У пейзажных творах багата рыфмавання, якое набіла аскоміну, стала банальным у паэзіі: «Пра лес, пра нівы, пра мароз Вятры сп'янелыя спявалі, Ялін і сосен, і бяроз Пад тыя песні абнімалі» і інш. У пейзажных і экалагічных вершах паэты, як думаецца, неапраўдана часта паўтараюць адны і тыя ж вобразы, эпітэты і метафары, бляск якіх добра-такі сціраецца пасля шматлікага ўжывання: «світальны вецярок», «світальная раса», «світальнай лодкай», «вішнёвая завея», «сад вішнёвы» (У. Мазго), «Цішай спавіты бор», «спавітых вераснем прысад», «вятрамі спавітай», «спавіў палі ружовы змрок», «у соннай збажыне», «каля соннай ракі», «глыбокі сон зары», «спачын пад зарой вечаровай», «у вечаровым полымі зары» (З. Марозаў) і інш. Ліра асобных паэтаў перадае ўжо чутыя ў паэзіі танальнасць і рытмы. Чытаем у вершы В. Жуковіча радкі «Белы шлях! Белы цвет! Белы птах! Белы свет!» ці ў В. Гардзея «...І гамоняць наўкола Белы свет, белы май, белы сад» — і адразу прыходзіць на ўспамін інтанацыя «Снежнай імпрэсіі» Г. Бураўкіна, якая стала песняй.

Шматлікія перапевы пазбаўляюць паэта арыгінальнасці, надакучаюць чытачу. Думаецца, не варта пераконваць, што свежасць і глыбіня індывідуальна-аўтарскага светабачання здольны закрануць пачуцці чалавека, збудзіць у ім ачышчальны боль ці прасветленую радасць. Вось ён, асноўны кангламерат недахопаў «лірыкі ў жывапісе» (выраз К. Грыгар'яна) і экалагічнай паэзіі: стэрэатыпнае выяўленне думкі, яе бязважкасць ці проста халодная, сухая разважлівасць, выпадковая дэкларацыйнасць, імкненне толькі да канстатацыі фактаў замест іх мастацкага аналізу, шэрая і панылая апісальнасць. Вершаў на экалагічную тэматыку, трэба сказаць, з'яўляецца ўсё больш і больш. Нельга не вітаць гэтага, бо, кажучы словамі А. Сыса,

Паэт не мае права быць паэтам
цнатлівае і чыстае красы,
калі ў Айчыне загніваюць рэкі
і засыхаюць на вачох лясы.

Толькі няхай будзе ў пейзажнай і экалагічнай паэзіі як мага меней сумнага рыфмавання і невыразнасці, а болей непаўторнай мастацкасці.

Алесь БЕЛЬСКІ.

Пятро ПРЫХОДЗЬКА

Гэтай вясной з групай савецкіх ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны мне давялося зноў пабываць на Эльбе, у Таргау, дзе, як і сорак пяць гадоў назад, адбылася сустрэча воінаў-пераможцаў з Савецкага Саюза і Злучаных Штатаў Амерыкі. У складзе нашай групы былі Герой Савецкага Саюза з Запарожжа В. Бурак, падпалкоўнік у адстаўцы адсіт Р. Агаркаў, дырэктар Музея Вялікай Айчыннай вайны БССР, былы авіяцыйны стралок-радыст А. Ульяновіч, нядаўні афганец старшы сяржант, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, Сяргей Рудкоўскі і некалькі іншых таварышаў. Кожны з нас вынес з гэтай паездкі шмат уражанняў. Мы пабывалі не толькі на Эльбе, але і ў многіх гарадах ГДР, сустракаліся з рознымі людзьмі на розных прадпрыемствах, ва ўсходнім і заходнім Берліне. Зноў, як сорак пяць гадоў назад, сфатаграфаваліся перад рэйхстагам.

Пра ўсё гэта будзе яшчэ напісана. А пакуль прапаную чытачам «ЛіМа» верш, напісаны ў час гэтай незабыўнай сустрэчы.

Аўтар

Мост праз акіян

Прыйшлі ў Таргаў, як на веча,
Байцы былых саюзніц дзвюх:
Праз сорак пяць гадоў
сустрэча
Нам узнавіла Эльбы дух.

Вясна сама нас запрасіла
На бераг бурнае ракі.
І зноў Амерыку Расія
Адчула ў поціску рукі.

Былі абдымкі і дарункі,
Шмат сувеніраў для сяброў.
Нібыта выткаў май карункі
Ў зялёнай засені дуброў.

На гэту стрэчу ля пагоста
Прыйшла Германія сама.
О, каб яна сказала проста:
«Між нас варожасці няма!»

Здалося—ў дружбе і сумленні,
Прайшоўшы бурны ураган,
Праклалі нашы пакаленні
Свой дружбы мост праз акіян.

Берлін. Ля помніка ахвярам Чарнобыля.

КАНЦЭРТ ЯЎРЭЙСКАЙ ПЕСНІ

З поспехам прайшоў у Віцебску канцэрт ансамбля яўрэйскай песні Мінскага гарадскога таварыства яўрэйскай культуры. Гучалі песні на вершы І. Харыка, М. Кульбака, Р. Рэлеса, М. Каплана і іншых яўрэйскіх паэтаў Беларусі. Музыку да гэтых песень напісаў кіраўнік ансамбля М. Парыч. Цёпла прынялі гледачы і песні на вершы М. Парыча «Ад'язджаюць сыны», «Іерусалім».

Доўга не адпускалі са сцэны салістаў ансамбля Ю. Ханіна і А. Наліваева.

У канцэрце прыняў удзел старэйшы яўрэйскі паэт Р. Рэлес.

А. ШУЛЬМАН.

Як заўсёды, грамадскасць Мінска адзначыла чарговую гадавіну з дня смерці народнага песняра Беларусі Якуба Коласа. 13 жніўня на Вайсковыя могілкі прыйшлі пісьменнікі, супрацоўнікі Літаратурнага музея Якуба Коласа і іншых музеяў сталіцы рэспублікі, удзячныя чытачы. Слова ля магілы сказалі празаік Алесь Савіцкі, літаратуразнавец Міхась Мушынскі, кампазітар Анатоль Багатыроў. Былі ўскладзены кветкі.

Тэкст і фота
Ул. КРУКА.

(у папярэднім рамане, аднак, не абышлося і без пэўнай лакіроўкі, падкрэслівалася ва ўсім і заўсёды «станоўчасць» персанажа), старшыні райвыканкома Пракапенкі, намесніка старшыні райвыканкома Даўгалёва і іншых. Як і Акапян, яны тут, у параўнанні з раманам «Шчыглы», больш паказаны ў супярэчлівасці сваіх паводзін. Не сакрэт жа, далёка не кожны, хоць і быў сумленным чалавекам, мог знайсці смеласць запярэчыць дыктату зверху, пайсці насуперак указанням і дырэктывам. Прынамсі, той самы Акапян, каб дагадзіць абласному і рэспубліканскаму начальству, ішоў на звычайныя прыпіскі. Па сутнасці, у гэтым ён нічога благога і не бачыў.

Пісьменніцкая ўдача — вобраз Жмуроўскага. Ён з тых персанажаў, якія з'яўляюцца і носьбітам аўтарскай ідэі, і разам з тым увасабляюць здаровыя сілы ў грамадстве, што выступалі супраць паказухі, беззаконня, суцэльнага адміністравання. Л. Левановіч не абмяжоўваецца знешняй характарыстыкай яго ўчынкаў, а сканцэнтроўвае ўвагу на псіхалагічнай матывіроўцы яго паводзін, на ўсім, што дазваляе лепш зразумець і адчуць Жмуроўскага не толькі як чалавека, а як грамадзяніна ды ўрэшце сына свайго часу.

Безумоўна, Л. Левановіч не мог не адлюстраваць у рамане і самой палітычнай атмасферы ў грамадстве. Якія гэта былі гады, мы сёння добра ведаем. Сталін, упэўнены, што перамога ў вайне з Германіяй надала яму яшчэ большага аўтарытэту, працягваў жорстка распраўляцца з уласным народам. Вядома, рэпрэсіі на сяле адчуваліся не гэтак, як у трыццатыя гады. Але народ не мог не ведаць, што знаходзіцца пад пастаянным пільным наглядам правадыра. У творы вяскоўцы жыва абмяркоўваюць апошнія навіны з жыцця краіны, асобныя нават асмельваюцца і самога Сталіна пакрытыкаваць. Чытаеш пра ўсё гэта і міжволі прыходзіць думка: а ці не робіць пісьменнік сваіх персанажаў залішне свядомымі? Ці не забягае наперад? Як быццам людзі не ў саракавых жывуць, а ў цяперашніх, васьмідзесятых гадах!

Да чаго можа прывесці своеасаблівае забяганне наперад, бачна на гэтым эпізодзе, які гучыць проста-такі парадыйна. Андрэйка Сахута рос хлапчуком не па гадах дапытлівым, любіў чытаць. А тут маці з сястрой якраз газетамі абклеілі сцены. «Спачатку хлапчук перачытаў сцяну напроці стала», а потым... «У суседняй газеце ён прачытаў артыкул сакратара ЦК Кампартыі бальшавікоў Карэла-Фінскай ССР Ю. Андропава аб вучобе і выхаванні кадраў, аб тым, што некаторыя работнікі абаранілі кандыдацкія дысертацыі. Зразумела, што Андрэйка не мог не задумацца, што «такое дысертацыя, чаму і ад каго яе трэба абараняць?»

Што тут скажаш? Адно, раман пісаўся ў 1983—1987 гадах...

Рэцэнзуючы раман «Шчыглы» ў часопісе «Полымя», я ўжо зазначаў, што выпадковымі выглядаюць у творы дакументальныя матэрыялы, якімі завяршаюцца некаторыя раздзелы. Л. Левановіч, відаць, мяркуе, што гэта дапамагае чытачу лепш зразумець, наколькі жыццё Хатыніч, раёна было звязана з падзеямі ва ўсёй краіне. Яго воля... Але і ў «Паводцы сярод зімы» ўсё ж, на маю думку, вытрымкі з хронікі БЕЛТА, ТАСС, як бы чужароднае цела. Скажам, такія:

«2 верасня. У мінскім прыгародным калгасе «Чырвоны агароднік» створаны філіял мінскай музычнай школы імя Л. П. Александроўскай.

12. На экранах Масквы пачаў дэманстравацца новы мастацкі фільм «Канстанцін Заслонаў» і г. д.

Дае знаць у рамане і расцягнутасць. Напрыклад, завельмі падрабязна прасочвае аўтар любоўныя прыгоды дырэктара школы Пятра Мамуты, калі стаў на некаторы час студэнтам-завочнікам.

Аднак, выказваючы аўтару заўвагі, не магу не сказаць, што той, хто пазнаёміцца з раманам «Паводка сярод зімы», у многім паглыбіць сваё ўяўленне аб пасляваенным часе. Не сумняваюся, нямала знойдзецца і тых, для каго лёс Андрэйкі Сахуты ўспрымецца, як і часцінка ўласнага лёсу, які «вырас» з вайны.

Алесь МАРЦІНОВІЧ.

ЗАПРАШАЕМ НА «ЖНІВО»!

Старадаўняе народнае свята, якое адбудзецца 19 жніўня 1990 г. у Цэнтры беларускага фальклору на Белай Дачы а 12 гадзіне. Будзем святкаваць разам з фальклорнымі калектывамі «Знаходка», «Жаваронкі», «Сцвіжанка».

Чакаем усіх на Белай Дачы, вул. Казінца, 76.

Праезд тралейбусам № 27, аўтобусамі № 1, 40 да прыпынку «Ручай».

Мікола МІНЧАНКА

Субота

У рэчцы дзень вымые ногі:
Туманам на поле — спачыць.
І будуць маўкліва дарогі
За сцішанай вёскай сачыць.

Ці выйдуць тут хлопцы, дзяўчаты
Да клуба, які апусцеў.
І буду маўчаць вінаваты:
Застацца тут сам не схацеў.

Тут маці жыве адзінока.
Так дрэвы на полі жывуць.
Да лесу тым дрэвам далёка,
І ў госці ўжо іх не завуць.

●

Наш лес — наш лёс. Яны перапляліся.
Яны зжыліся. І зрадніліся навек.
Ідзеш у лес, яму ты пакланіся,
Калі ты свой і блізкі чалавек.

У будучыню смела углядайся.
Не трэба аб мінулым стомлена тужыць.
Як жыў наш край — часцей пытайся.
Больш думай, як нашчадкі будуць жыць.

Роднае

Калі духмяны бохан на стале,
Як сонца цёплае, пакой асвеціць,
Тады рахманы дзядзька ў кубак лье
Бясконцы пах, настоены на леце.
Тут водар мяккі, як ліпнёвы цвет.
У песні — медуніцы пах з чаборам.
І словам яркім цэлы белы свет —
Затканы дзіўным матчыным узорам.
Тут чысціня ўсіх роздумаў былых,
Якіх ніколі не забудзе сэрца.
Тут цішыня аж прыгалубіць слых,
І поле песняй роднай адгукнецца.
Дзе наліваюць буйна каласы,
Дажджамі шчодрымі абмытыя.
Тут выплываюць продкаў галасы,
Што намі не забытыя.

а. Ян МАТУСЕВІЧ: «Не выракацца свайго народа, мовы, традыцый...»

Гэтага чалавека можна сустрэць і на рэлігійным свяце ў касцёле ў Барунах на Ашмяншчыне, дзе ён працуе настаяцелем, і на розных акцыях БНФ, і на кніжным аўкцыёне, бо надта ж ён вялікі аматар кніг... Гэта — каталіцкі святар айцец Ян Матусевіч.

Імя яго неаднойчы згадвалася ў лімаўскіх публікацыях. Сёння мы маем магчымасць бліжэй пазнаёміць чытачоў з айцом Янам. З ім гутарыць наш пазаштатны карэспандэнт У. Пучынскі.

— Айцец Ян, якім чынам прыйшлі вы ў рэлігію? Як сталі не проста святаром, а чалавекам, што хварэе за лёс свайго народа, неабыякавы да адраджэння мовы, традыцый, да дэмакратычных працэсаў, якія адбываюцца ў краіне?

— Я выхоўваўся ў сям'і вернікаў. Найбольш веруючымі былі цётка й бабуля. Яны сваім выхаваннем і прывілі любоў да Бога. Далейшая, ужо свая, дарога была незвычайнаю. На маю думку, да больш глыбейшага пазнання Бога я прайшоў праз антырэлігійную літаратуру (хоць гэта можа падацца вельмі дзіўным). Вельмі мне цікава было даведацца, ад чаго ўсё зарадзілася, як стварыўся свет. Я чуў, што аб гэтым усім напісана ў «Бібліі». У той час яе нельга было пачытаць нават у грамадскай бібліятэцы. І я па сваёй наіўнасці звярнуўся да аднаго з упаўнаважаных савета па справах рэлігій з просьбаю падказаць, дзе можна набыць Біблію. І ён — а было гэта гадоў 20 — 25 таму — паглядзеў на мяне са здзіўленнем: «Чым гэта вы, малады чалавек, цікавіцеся? Ну як можна ў наш час верыць у Бога?» А потым і дадаў: «Калі хочаце, пачытайце «Пацешную Біблію» ці «Пацешнае Евангелле»: можаце ўзяць у любой бібліятэцы ці кнігарні».

Ужо маючы гадоў дваццаць ці болей, я чытаў антырэлігійную літаратуру, дзе ўсялякім чынам высмейваліся прадстаўнікі духавенства. Я ж, чытаючы гэта, успрымаў усё наадварот.

У 1968 годзе я ездзіў паступаць у тэатральны інстытут, але не прайшоў творчы конкурс. Хутка перайшоў у каталіцкую веру (у дзяцінстве я быў хрышчаны ў царкве, мае бацькі былі праваслаўныя), бо ўсе дзяды й прадзеды былі каталікамі — як лацінскага, так і ўсходняга абраду (г. зн. — уніятамі) — з пакалення вельмі далёкага. У той час стаў чытаць вельмі шмат рэлігійнай літаратуры па-руску. І ўжо меў шчасце мець Біблію для свайго карыстання. Хацеў пасля тэатральна-мастацкага інстытута ў Мінску паступіць у семінарыю, каб прысвяціць сябе дзейнасці ксяндза. Але паколькі ў мяне была свецкая адукацыя, мне было адмоўлена ўпаўнаважаным па справах рэлігій. Таму прыйшлося атрымаць святарства праз Польшчу. Прыехаўшы адтуль, я з 1979 года працую настаяцелем касцёла ў вёсцы Баруны Ашмянскага раёна.

— Вядома, што вы адпраўляеце набажэнства па-беларуску.

— У Савецкім Саюзе ў касцёлах традыцыйна (апрача Літвы, дзе набажэнства ідзе па-літоўску, і Латвіі, дзе жыве латышская мова) ужываецца польская мова. Але ёсць на сённяшні дзень тры каталіцкія святары на Беларусі, якія карыстаюцца ў касцёлах беларускаю моваю. Гэта ўсім вядомы змагар за адраджэнне роднае мовы ў святынях айцец Уладзіслаў Чарняўскі, настаяцель касцёла ў вёсцы Вішнева Валожынскага раёна, айцец Пятрайціс, настаяцель касцёла ў горадзе Мёры (хаця па нацыянальнасці ён літовец) і я.

Чаму я так зрабіў? У кастрычніку 1988 года я разам з айцом Чарняўскім быў запрошаны на канферэнцыю «Тысячагоддзе хрышчэння Беларусі й беларускі народ» у Лондан Беларускім культурным цэнтрам і Беларускай каталіцкай місіяй. Апошнюю ўзначальвае а. Аляксандр Надсан, дырэктар беларускай бібліятэкі імя Францішка Скарыны і беларускага музея ў Лондане. Там былі прадстаўнікі з Аўстраліі, Амерыкі, Францыі, Бельгіі, Канады... І адзін прадстаўнік Ватыкана сказаў мне: «Трэба, каб на Беларусі родная мова была чуваць у святынях не толькі ў адным Вішнеўскім касцёле, але і ў іншых. Варта і вам, а. Ян, паследаваць гэтаму прыкладу». З таго часу я й малюся па-беларуску. Хаця гэта не ўсім прыйшлося даспадобы, бо людзі старэйшага ўзросту прызвычаіліся да польскае мовы, але ж моладзь, людзі сярэдняга ўзросту з сімпатыяй аднеслісся да гэтага.

— Летась вы бралі чынны ўдзел у святкаванні «Дзядоў» на Беларусі, тым днём вы былі ў Курапатах і асвяцілі пакутніцкі Крыж.

— Мне, як чалавеку, які нарадзіўся на Беларусі, родзічы якога таксама пацярпелі ў гады сталінскіх рэпрэсій, гэта было святым абавязкам. Я пайшоў туды з блаславення нашага цяперашняга біскупа, апостальскага адміністратара Тадэвуша Кандрусевіча.

Між іншым, сёлета на Беларусь прыязджаў каталіцкі святар з Польшчы (які нарадзіўся там і паляк сам), які станоўча ставіцца да ўсяго беларускага. Ён лічыць, што ў нашых святынях павінна скарыстоўвацца наша родная мова.

Вазіў яго ў Катынь пад Смаленскам, дзе пахаваныя ахвяры сталінізму — польскія афіцэры. Пабылі мы і ў Курапатах. Тут на памяць тры каменьчыкі з гэтых магіл.

— Як вы думаеце, айцец Ян, ці можа паўтарыцца тое, што было ў 30-ыя гады?

— Усё залежыць ад Бога. Я не раз казаў аб гэтым сваім вернікам.

— Пасля «Дзядоў» адбылося святкаванне ў беларускай каталіцкай святыні ўгодкаў забойства уніяцкага святога — біскупа Кунцэвіча. Чаму вы, каталіцкі святар, таксама дачыніліся да гэтага?

— Я скажу, што гэта не толькі уніяцкі біскуп. Ён — і католік. Што значыць уніяты? Гэта каталікі ўсходняга абраду.

— Але ж гісторыкі кажуць, што Кунцэвіч быў пакараны заслужана, сінтэзу дзвюх культур, дзвюх вер ён дамагаўся нечалавечымі метадамі, вёў непрыстойны лад жыцця...

— Я з гэтым не згодзен. Лічу, што гэта домыслы ворагаў уніі, ворагаў св. Юзафата Кунцэвіча, ворагаў каталіцкай царквы. Гісторыя не кажа аб гэтым канкрэтна. А домыслы могуць быць розныя.

— Вам блізкія беларускія нацыянальныя традыцыі, культура... Вось у вашым пакоі бачу я гравюры «Менск», «Вільня», бел-чырвона-белы сцяжок, выявы Пагоні, фотаздымкі беларускіх ксяндзоў А. Станкевіча і Я. Гэрмановіча... А побач з гэтым — бюсты Высоцкага, Чайкоўскага, вунь — планшэтка «А. П. Чэхаў», партрэт Тараса Шаўчэнкі...

— Гэта мае любімыя аўтары, дзеячы культуры. Да прыкладу, я вельмі люблю вершы Т. Шаўчэнкі — і чытаю іх толькі ў арыгінале. Люблю музыку Чайкоўскага, Баха, Моцарта. Вельмі люблю вершы й песні Уладзіміра Высоцкага, маю яго запісы. Маім найлюбімым расійскім пісьменнікам з'яўляецца Антон Паўлавіч Чэхаў.

— А хто з беларускіх пісьменнікаў найбольш падабаецца вам?

— Люблю пранікнёныя вершы Янкі Лучыны, вострасюжэтныя байкі Вінцука Адважнага (а. Гэрмановіча), добры гумар Ядвігіна Ш. Па маіх перакананнях блізкі перш за ўсё Янка Купала, а з сучасных — Пімен Панчанка з яго зборнікам «Горкі жолуд», Сяргей Грахоўскі з яго актуальнымі творамі аб перажытых ім жудасцях часоў сталінізму.

Сёння нам трэба азірнуцца назад, паглядзець і ўзгадаць, як жылі нашы продкі, бацькі. Вось, скажам, «Дзяды»... Свята гэтае было заснавана дзеля таго, каб прыгадаць сваіх памерлых продкаў, каб рабіць у жыцці такія ж добрыя ўчынкі, якія рабілі яны. Азірнуцца на наша мінулае. Бо той чалавек, які мінулага свайго не памятае, які далёкі ад гэтага, топча яго, — варты жалю. Быў я неяк на былых нямецкіх, татарскіх, яўрэйскіх могілках. І казаў тым, хто быў са мною: дрэнна, што знішчаны гэтыя могілкі. Людзі тых нацыянальнасцяў не могуць прыйсці й пастаяць над магіламі сваіх продкаў. Усё знесена — на гэтым месцы цяпер так званы парк адпачынку. Гэта ўсё ганебна. Вельмі ганебна.

— Вы паспелі нямала пабачыць і зведаць за сваё жыццё. Да якой высновы вы прыйшлі? Да чаго нам варта імкнуцца?

— Да веры. Да міласэрнасці. Да любові да бліжняга. І памятаць, хто мы. Як сказаў наш слынны паэт: «Людзьмі звацца». Вось да гэтага мы й павінны імкнуцца. Каб не выракацца свайго народу, сваёй мовы, сваіх традыцый.

ЧАГО ТОЛЬКІ са мною не здаралася, калі вучыўся ў Маскве! У якія толькі цянёты не трапляў! У якія пасткі не ўскокваў! Пра ўсё не ўспомніш, не раскажаш. Ды адзін выпадак для ўмацавання нашае гультаяватае галоснасці ўсё ж варта прыгадаць, бо ён, выпадак гэты, пераўзышоў усе мае студэнцкія выбрыкі.

Вучыўся гэта я ў Літаратурным інстытуце і клопату з вучобай не меў аніякага. Валачыўся адно, як Ясенін у залатыя часы нэпа, па славутым Цвярскім бульвары—каля нечага спыняўся, да нечага падыходзіў. Да саркафажнага МХАТа, напрыклад. Да тассаўскай будыніны таксама. На той час у яе экранных вокнах выразна і з цвёрдых класавых пазіцый фатаграфічна біўся нястомны пульс краіны і да гэтага нястомнага пульсу, не дыхаючы, прыкладалася рознакаляровым вухам прагрэсіўная частка чалавецтва. Цікава было назіраць...

У запасе, як і ў кожнага маскоўскага паэта, у мяне была вечнасць, у кішэні—стыпендыя імя Канстанціна Сіманава, а ў туманных думках—яшчэ больш туманны Стакгольм. Апошняе, натуральна, пераважала, таму я час ад часу пытаўся ў кіяскёраў, што сядзелі ў акенцах пад шыльдай «Мосгорсправка»: а ці не ведаюць яны дакладны адрас камітэта па Нобелеўскай прэміі? На памяць яны не ведалі гэты адрас і пачыналі нудна, старонка за старонкай праглядаць свае тысячалістыя талмуды, а я тым часам не чакаў—ішоў далей да наступнага кіёска, і шчыра прызнаюся: у застойныя дні нічагусенькі не рабіў такога, што магло хоць бы на дзень наблізіць да народа-працаўніка сённяшнюю перабудову.

У дні свайго студэнцтва быў я невылечным банвіанам.

Цяпер, вядома, шкадую, што пускаў энергію маладую дымам рэстаранным у паветра. Праўда, употайкі я пісаў фрывольныя вершыкі пра стараватых нашых правадыроў, выносячы іхнія прозвішчы ў запамінальныя дактылічныя рыфмы: цячэ ж Нява—Брэжнева; прасціна вам—Усцінава; паненка вам—Чарненкава і г. д. Але ўжо тады здагадваўся, што малая гэта цагліна ў светлую сцяну дэмакратыі. Здагадваўся і разам з тым абачліва не пускаў сваю творчасць на крутыя самвыдавецкія сцежкі—адно зрэдку паказваў яе сябру-правізару.

Сябар таксама быў студэнтам, вучыўся на фармфаку, а па начах працаваў—дзяжурыў у аптэцы паблізу ад праспекта Міхалыванавіча Калініна. У вольны вечар я да яго заходзіў туды, іншы раз нават начаваў.

Сябар любіў слухаць маю вершаваную фронду.

Калі я чытаў, ён глядзеў на мяне з той нефальшывай любасцю, з якой Бурацінаў тата некалі ўзіраўся ў бярозавае палена.

Ноччу ў ягоную аптэку звычайна прыходзілі старыя людзі. Ясным яснае, што іхняй старасці, акрамя валідолу і нітрагліцэрыну, нічога не было патрэбна. Ну яшчэ маглі папрасіць свечы з беладонай ды які-небудзь пустырнік.

Аднак жа пасля выявілася, а да гэтага я й вяду, што старыя людзі па начах шукаюць яшчэ і звычайную зялёнку.

Аптэка была маленькая і празрыстая, як шклянка. Нічога ад мяне схаванага ў ёй не было. Я добра ведаў,

---

Фелік БАХЧЫНЯН

Калі перакладаеш песню

Якубу КОЛАСУ

Калі перакладаеш песню,
Перакладаеш груз з плячэй,
Якія скарб дадому неслі,
Не выбіралі, каб лягчэй.

Як лёгкаю была паклажа,
Бярэш, не баючыся страт,

Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК

ПРА ТОЕ, ЯК Я АДНОЙЧЫ ДЗЯЖУРЫЎ У НАЧНОЙ АПТЭЦЫ

АПАВЯДАННЕ

што дзе ляжыць, на якой паліцы якая пляшачка густа пылам пакрываецца.

Часам, калі мой сябар соладка прыкладаўся патыліцаю да падушкі, а ў дзверы званіў нецярплівы масквіч, я з задавальненнем адсоўваў ад сябе блакнот з рыфмамі і хоць не ведаў ніводнага слова з клятвы Гіпакрата, але ж начныя правізарскія абавязкі спаўняў ад душы...

У Маскве толькі што адбегала, адплавала, адскакала і ўрачыста адфанфарыла Алімпіяда. Толькі што над Лужнікамі ўзняўся, падвешаны да дзіцячых балёнаў, заплаканы мядзведзь. Ён памахаў усім мяккай лапай, пусціў апошнюю развітальную слязу і пад вершы народнага паэта СССР Міколы Дабранравава хуценька памкнуўся ў бок манархічнай Швецыі. Дарма думаць, што палёт у бок Швецыі быў тайна задуманы і цалкам залежаў ад авантурнай ідэі—вось так нечакана развітацца не толькі з маскоўскай Алімпіядай, але і назусім з краінаю Леаніда Ільіча.

Не, прывязаны да балёнаў мядзведзь не збіраўся эміграваць і ў Швецыю паляцеў толькі таму, што яго панёс туды моцны паўднёваўсходні вецер. Дзьмуў бы іншы вецер, ну, скажам, у бок Уральскіх камянёў, то няшчасны Міша паляцеў бы й на Урал.

Да Швецыі, аднак, мядзведзь не даляцеў.

У адной з неспакойных рэспублік Прыбалтыкі, каля самага мора, яго ўгледзелі нашы пільныя жаўнеры-пагранцы са службы процінябеснай абароны. З воклічам ціхага шкадавання: «Эх, Міша, і ты туды ж», яны пусцілі ў алімпійскага любімца паслухмяную ракету.

Пра трагедыю над Балтыкай мы з сябрам даведаліся з дысідэнцкага лістка «Згублены ўраджай». Лісток гэты нехта ўначы падсунуў нам пад антэчныя дзверы.

Памаўчалі мы, уздыхнулі раз-другі—шкада ўсё ж мядзведзя—і тут жа ў аптэцы й памянулі славутага нябожчыка. Чым памянуць, у аптэцы заўсёды знойдзецца.

Ясней за яснае, што і за здароўе пагранцоў нашых ёмкіх пацяглі мы па кроплі вострай.

Дык гэта вось адсюль, з гэтай самай кроплі вострай, і пачаў да мяне набліжацца той выпадак легендарны, пра які я намерыўся расказаць вам у сваім апавяданні.

Спаласнуўшы колбы, сябар папрасіў:

— Пабудзь за мяне ў аптэцы, гэту ноч хачу лірыцы аддаць.

Хіба адмовіш, пачуўшы такое!

— Аддавай, — кажу, — мне зусім няцяжка масквічоў начных таблеткамі супакойваць.

Сыпануўшы на язык жоўтых аскарбінавых бабкоў (дарэчы, ідучы да дзяўчыны, танную аскарбінку можна ўжываць заместа заўсёды нямашнага дэзадаранту), сябар сышоў з аптэкі, пакінуў мяне сам-насам з антыўрадавым лістком «Згублены ўраджай».

Каб час не цёк, а бег, я прачытаў яшчэ раз нататку пра смерць алімпійскага мядзведзя.

Пуск ракеты ананімны аўтар абазваў тэрарыстычным актам і патрабаваў міжнароднага суда. І над кім бы вы думалі? Над жаўнерамі з процінябеснае абароны? Не. Над самім Леанідам Ільічом!

Ну, гэта занадта, падумаў я. І толькі так падумаў, як у дзверы пазваніў першы нездаровы...

Пасля званілі яшчэ і яшчэ, і не толькі старыя людзі. Які хочаце ўзрост пальцам у званок тыкаў. Нават дзяўчаткі маладзенькія па гумачкі інтымныя прыбягалі.

За ноч нахадзіўся я да дзвярэй, насоўгаўся. Замонаўся зусім. Без прывычкі яно і ў Парыжы цяжка, а тут — аптэка! Таксама прамысловасць хімічная. І мне, задыханаму, часам здавалася, што нашу я не маленькія пушачкі-каробачкі, не дробныя бутлікі сціскаю ў жмені, а цэлыя бярэмкі ўсіх гэтых анальгінаў ды аскафенаў прыціскаю аберуч да грудзей...

Пад самы ранак, калі ў заапарку краснапрэсненскім, успамінаючы сваю радзіму цёплую, пакутніцы малпы закрычалі; калі ўжо павінен быў з лірычнага мацыёну мой сябар вярнуцца, і калі ўжо вочы мае зрабіліся малінавыя, усё адно як лампасы генеральскія,—я н о й навалілася, крыламі сваімі каляровымі залопала...

Толькі гэта я прылёг, прыціснуў плячыма падшыўку «Здоровья», ажно дзверы затрэсліся, ад званка-звону закалыхаліся. Відаць, нехта моцна хворы, падумаў я, ідучы адчыняць, да кнопкі электрычнае прыляпіўся.

І каго ж я за акенцам фанерным убачыў?

Мо, сябра-правізара—вясёлага, шчаслівага падгулялага?

Зусім не.

За фанерным акенцам убачыў я пяцёра-шасцёра мужчын-ахоўвачаў у аднолькавых шынелепадобных апранахах. Трымаючы рукі ў кішэнях, яны стаялі на тратуары паўкругам. Стаялі і маўчалі. Яшчэ хвіліна—і з-за спінаў гэтых маўклівых фігурантаў (зраблю тут перадых!),—без капелюша, з яркімі, нават ноччу, зоркамі ва ўсе бакі пінжака і з узнятым акрываўленым пальцам паволі выйшаў сумны Леанід Ільіч.

Ці вам казаць, што адразу я не паверыў у жывога Леаніда Ільіча. Мне падалося, што гэта з мяне, соннага і стомленага, захацеў пасмяяцца мой дарагі сябар. Пасля шчаслівага спаткання ад няма чаго рабіць недзе здзёр з плота манументальных памераў плакат і, разбудзіўшы мяне інквізітарскім званком, разгарнуў, паразіт, на ўсю шырыню аптэчных дзвярэй гэтую вулічную агітацыю з намаляваным на ёй Леанідам Ільічом і ягонымі маўклівымі хлопцамі. Праўда, на плакатах я ніколі не бачыў, каб Леанід Ільіч быў сумны ды яшчэ з падзёртым пальцам.

Не, гэта ўсё ж быў не выбрык майго любімага сябра-правізара, гэта...

— Добрай раніцы,—сказаў мне Леанід Ільіч, усё трымаючы перад сабой чырвоны палец. Сказаў вельмі проста і чалавечна, як і належыць камуністычнаму правадыру, і паглядзеў на мяне без аніякай хітрасці, як на свайго аднапалчаніна-малазямельца.

Цёплы голас правадыра мяне расчуліў. Паранены палец устрывожыў, і мне зрабілася вельмі сорамна за свае подлыя фрывольныя вершыкі, за свае гнюсныя дактылічныя рыфмы.

Леанід Ільіч падступіў бліжэй, і яго невясёлыя ахоўвачы таксама зрабілі крок наперад.

Я ж ветліва адхіснуўся, здаецца, адышоў назад, хаця ногі мае і не варухнуліся. У пройме фанернага акенца Леанід Ільіч выглядаў зусім падзяржаўнаму, як у тэлевізары.

Ён паклаў свой няшчасны палец на падваконнічак:

— Бачыце... Палез гэта ва ўнутраную кішэню і накалоўся аб гэтую зорку...

Леанід Ільіч даверліва паказаў мне наравістую зорку, што так неспадзявана сваёй драцянай прыколкай абдзёрла яму палец. Далей з тым жа светлым даверам здаровай рукой вывернуў штрыфель, і я ўбачыў, як з глыбіні пінжака сярод іншых прыколак шчупаковым зубам бліснула і зламысная прыколка.

— Смешна прызнацца, але ў маёй машыне не знайшлося ні ёду, ні зялёнкі. Можа, у вас ёсць?

Ах, вось яно што! Зялёнка патрэбна—і ўвесь клопат! А то ўжо галава мая ад поўнай мабілізацыі мазгоў цухнуць пачала.

Я далікатна шмарганyў на дзвярах замком і запрасіў параненага Леаніда Ільіча ў аптэку.

Фігуранты, не вымаючы з кішэняў рук, увайшлі без запрашэння.

І толькі гэта за апошнім ахоўвачам зачыніліся дзверы, як і ўтварыўся самы што ні на ёсць кульмінацыйны момант.

Я палядзеў стукацца галавой аб паліцы—шукаць зялёнку, а Леанід Ільіч сціпла падышоў да століка, на якім, нядбайна пакінуты, ляжаў «Згублены ўраджай»...

— Ужо прачыталі?—пакрыўджана спытаў ён і ўваткнуў у газеціну пашкоджаны палец.

Пляшачка з зялёнкай у маёй памакрэлай далоні імгненна зрабілася ярка-чырвонай. Як мак!

Мне захацелася стаць вар'ятам і я, няма сумнення, ад страху і звар'яцеў бы, каб не добрае сэрца генсека.

— Вам гэту пракламацыю, вядома ж, падсунулі, — зусім па-бацькоўску сказаў Леанід Ільіч.

— Так, так... падсунулі, гады, вось пад гэтыя дзверы! — выкрыкнуў я з палёгкай.

— І мне таксама падсунулі,—уздыхнуў Леанід Ільіч,—і таксама пад дзверы. Вам калі? Ноччу? (Я махнуў галавой.)... Вось і мне ноччу... Вы толькі падумайце, што робіцца? За гэтага дурнога мядзведзя патрабуюць, каб мяне судзілі. Не па-чалавечы гэта. Дый сам мядзведзь, штучка такая з пчоламі ў носе... папёрся проста ў Швецыю! Ну хоць бы братнюю Польшчу выбраў. Слова камуніста, што жывы застаўся б. На польскім напрамку ў нас слабейшае пэвэо стаіць. Вось так... Дык што—давайце вашу зялёнку.

Аперацыя прайшла ўдала. Перавязка таксама. Я далікатна абгарнуў рану, рэшту бінту закінуў Леаніду Ільічу на шыю—зрабіў для зручнасці перавязь. А раптам у машыне палец заныe? Самы раз тады ўсю руку ўсунуць у пяцельку—няхай адпачывае.

Мой аперацыйны спрыт спадабаўся Леаніду Ільічу і на самы адыход ён разгаманіўся са мной ужо зусім па-сямейнаму.

— Дык, значыць, у аптэцы працуеце?

— Не-е зусім... Літаратар я.

— Пішаце?

— Угу...

— Я таксама пішу. Што-небудзь маё чыталі?

— А як жа ж, чытаў...

— Спадабалася?

— Вельмі...

За гэты час мы так і не прыселі. Хоць колькі таго часу прайшло? Хвілін пяць, не болей. Аднак было відаць, што Леанід Ільіч стаміўся, што яму, перавязанаму, хочацца ў машыну.

— Хутка памру,—раптам сказаў ён,—а ў Палітбюро поўны завал...

Пасля гэтай генсекавай шчырасці ахоўвачы ў шынелепадобных апранахах па-конску пераступілі з нагі на нагу. Я ж дзеля ўласнай бяспекі, адчуваючы незадаволенасць ахоўвачаў, уцягнуў галаву ў плечы і паспрабаваў апусціць вушы. Каб не пачуць лішняга. Але ўсё ж пачуў.

— Уся надзея на моладзь,—ужо каля дзвярэй прамовіў тое «лішняе» Леанід Ільіч.—Мы тут нядаўна ў склад Палітбюро ўвялі маладога. Гарбачоў яго прозвішча. Я на яго вельмі спадзяюся.

Нічога гаспадар не скажа.
Знаходцы дробнай будзе рад.

Укленчы, перакладчык, скаргам,
Сяброўскай назаві тугу,
І ношку важкую са скарбам
Цягні, сагнуўшыся ў дугу!

Коні на Ушацкім полі

Васілю БЫКАВУ

«...А для чалавецтва нарадзілі Ушачы добрых паэтаў і Васіля Быкава».
Пімен ПАНЧАНКА

А коні ўсё іржуць буланыя, залётныя,
А ў цёмных іх вачах — маленства наша потнае.
Наіўным рэхам поўніцца ўвесь свет,
Малечых гульняў выбягае след...

Ах, як мне конна хочацца праехацца,
Каб вёрткія вятры сцябалі вехцямі,
Каб білася кашуля падалом,
Як птушка з перавязаным крылом.

Каб казкі зноў шапталі над калыскамі
На вуха сну матулі словы блізкія.
Ты помніш, коню мой, калі з табой
Мы абагнаць хацелі неспакой.

Ты потам пах, як скакуну належала,
Пацелі нівы, туманы начлежныя,
Былі ў палоне светлых мрой усе,
Дрыжэла поўня ў казачнай расе...

Ты помніш, коню мой, як мы з дзівосамі
Развітваліся, сталі дні дарослыя.
Ты помніш сябра з цёплай стараны?
У яго вачах — журботы палыны.

Не, ёсць дзівосы! Памяць зоркай глянула.
Зноў пахнуць коньмі туманы буланыя.
Звініць Ушачам звонам раўчука
Армянскі смех малога хлапчука.

Тры песні Антаніне

1. Нашая ноч

Гэтай ноччу былі мы ўдваіх.
Ты накінула цемры вэлюм.
Дзень патух, дзень аглух, дзень заціх.
Ты і я толькі ў свеце цэлым.

І падобным было на вулкан
Сэрца, што падзялілі надвое.
Сінім цестам сіні туман
Падышоў у дзяжы настрою.

Трэба выдумаць казак шмат
Шчырым зоркам з усмешкай шчырай.
Ты мне дорыш сіні пагляд,
Мусіць стаць ён мне вечнай лірай.

Гэтай ноччу былі мы ўдваіх,
Ці ж Сусвету гэтага мала?
Мы пачулі сябе саміх.
Нас хістала, агнём ап'яняла.

Нас ахутала ў храме цяпло,
Светам стаў замак сіні ў лесе.
Так дыханне маё апякло,
Што здалося — рассыплюся ўвесь я...

І здалося, ратунку няма,
Разарвуцца нябёсы ад крыку,
І пяшчота адкрышыць сама
Ад ракі анямеласці крыгу...

Я адчуў позірк палу нямы
І растаў ад цнатлівага дзіва,
І ў глыбінях спрадвечнасці мы
Зніклі, быццам камета, імкліва...

2. Нашае ранне

Ранне нашае нашым было.
Сонца я запаліў да світання.

Дзень наш вечным быў, як святло,
Я на даху накрэсліў каханне.

І ставала святла на зямлі,
І ў душу святло завітала.
У тваіх мае вочы былі,
А ў маіх — ты світала, світала.

3. Нашае расстанне

Мы рассталіся.
Хто расстраляў наш час?
Двух буслоў у хвіліну пяшчоты
Хто апудзіў?
У цемры начы якраз
Мы згубілі надзею на ўзлёты...
З зоркі ўпала сляза
І Сусвет пагас,
І душа палёў ад маркоты
Задыхнулася.
Хто расстраляў наш час?
Лёс,
Буслоў пакараў за што ты?
Што за птушка пяе ў гэты час
Без нас?..
Ці растануць расстання сумёты?..

З армянскай.
Пераклаў Рыгор БАРАДУЛІН

Тры аповесці В. Быкава па-ўкраінску

Складаны лёс у аповесці Васіля Быкава «Мёртвым не баліць». Уласна кажучы, складаным яго зрабілі перастрахоўшчыкі ад літаратуры. Напісаная ў 1965 годзе, аповесць была змешчана ў часопісе «Маладосць», перакладзена на рускую мову. А вось больш шырокае знаёмства з ёй беларускага чытача запазнілася амаль на дваццаць гадоў. Толькі дзякуючы намаганням колішняга дырэктара выдавецтва «Мастацкая літаратура» М. Дубянецкага гэтая аповесць у 1982 годзе ўвайшла ў Збор твораў В. Быкава ў чатырох кнігах.

Знамянальна, што менавіта гэты глыбока праўдзівы твор пісьменніка (пазначаны як раман) даў назву аднатомніку В. Быкава, выпушчанаму ўкраінскім выдавецтвам мастацкай літаратуры «Дніпро». У зборніку, які папоўніў серыю «Еднасць», што выходзіць з 1983 года, змешчаны таксама аповесці «У тумане» і «Аблава».

Думаецца, складальніца і перакладчыца Т. Кабржыцкая сабрала разам гэтыя творы зусім невыпадкова. Пры рознасці зместу яны пра адно — пра паводзіны чалавека ў надзвычайных абставінах. Зразумела, гэта прысутнічае ў кожнай быкаўскай аповесці, але менавіта тут бескампраміснасць пісьменніка ў адлюстраванні ўсяго негатыўнага ў жыцці ўзнята на вялікую, іншым недасягальную вышыню.

Таццяна Кабржыцкая напісала да выдання і грунтоўную прадмову «Мост з мінулага ў будучыню», у якой прасочвае асноўныя накірункі творчасці В. Быкава, запыняе ўвагу на самабытнасці почырку пісьменніка, яго смеласці ў адлюстраванні складаных жыццёвых з'яў. Гаворыць яна і аб пакручастым лёсе «Мёртвым не баліць». У прыватнасці, яна адзначае: «Са з'яўленнем рамана «Мёртвым не баліць» частка чытачкай інтэлігенцыі адчула, што Твардоўскі невыпадкова пачаў 1966 год гэтым творам. Відавочна, што публікацыяй быкаўскага рамана рэдактар «Нового мира» хацеў выказаць пратэст супраць пэўных спроб рэабілітацыі Сталіна, якія пачалі ўжо наспяваць у краіне».

Т. Кабржыцкая падкрэслівае, што ў В. Быкава даўнія сувязі з Украінай. Ён «абараняў Украіну ад гітлераўскага нашэсця ў першыя месяцы вайны, ён прыйшоў на яе зямлю зноў, вызваляючы Саратаў, Варонеж, Сталінград», прымаў удзел у вызваленні ад фашысцкай акупацыі сёл і мястэчак стэпавай Украіны.

Блізкая ўкраінскаму чытачу і праблематыка твораў В. Быкава, у тым ліку і аповесці «Аблава». Яна, зазначае Т. Кабржыцкая, «пра тое, што хвалюе сёння і ўкраінскі народ, — пра сумленнага працалюбівага селяніна, пра яго любоў да роднага краю, якую мы нарэшце пачынаем прызнаваць як праяўленне патрыятызму, пра тое, як гвалтоўна адрывалі патомнага працаўніка ад роднай зямлі, пра яго горкае выгнанне».

Тыраж кнігі В. Быкава на ўкраінскай мове — 50 тысяч адпаведнікаў.

А. ВІШНЕЎСКІ.

Данат ЯКАНЮК

БТ: час на самавызначэнне

Тэарэтычны роздум практыка

З ГОДУ ў год лічбы, якія характарызуюць колькасць гледачоў той ці іншай праграмы БТ, амаль адны і тыя ж: 1—3—5 % (часам да 10 %) аўдыторыі глядзяць перадачы грамадска-палітычнага блоку і да 65—70 % — мастацкага. Выключэнне — «Крок», маладзёжная грамадска-палітычная праграма, якая лідзіруе за кошт вострых сюжэтаў, прамога эфіру і кліпаў.

Дык чаму нашы «Панарама», «Трыбуна», «Аспекты» і іншыя грамадска-палітычныя перадачы—аўтсайдэры нашага палітычнага вяшчання? Чаму толькі адзінкі з амаль васьмідзесяці рубрык БТ карыстаюцца ўвагай аўдыторыі? Першы і банальны адказ: не цікавіць. А што цікавіць?

Ва ўсім свеце самай цікавай інфармацыяй з'яўляецца мясцовая — тая, у якой гаворыцца пра суседа, пра родны горад, рэспубліку, краіну; потым — замежная (маўляў, а як у іх?).

Нашы ж «Панарама», «Рытм», «Раніца рэспублікі» амаль не адпавядаюць патрабаванням хуткасці, дакладнасці і дасціпнасці. Ці не таму, што нашы журналісты ніяк не могуць спраўдзіцца як асобы? Ці не таму, што мы бедныя на тэхніку, на фантазію, на грошы, на агульную культуру вядучых, і беднасць гэта лезе ў шчыліны і дзіркі нашых тэленамаганняў?

Тут міжволі ўспомніліся вядучыя кругласутачнай амерыканскай тэлеінфармацыйнай праграмы Сі-Эн-Эн, якую давялося глядзець у Варшаве на працягу тыдня. Не зазіраюць амерыканскія вядучыя ў шпаргалкі — глядзяць проста ў вочы гледачам, не пакутуюць ў пошуках слова, думкі. Яны — дасціпныя драматычныя артысты-камунікатары, якія бачаць-адчуваюць, напрыклад, усе межы, логіку развіцця інтэрв'ю, размовы, усёй праграмы. Невыпадкова ж былы тэлекаментатар Рэйган стаў прэзідэнтам... Ёсць нават жарт, што ў папулярнага каментатара наступны крок у кар'еры — палітычная дзейнасць.

Пра што сведчаць нашы праграмы, вядучыя, большасць каментарыяў і каментатараў? А найбольш пра тое, што БТ (а праз яго і рэспубліка) — перыферыя, правінцыя, якая не можа прыдумаць нічога лепшага, як паўтарыць праграму «Время» (наша «Панарама»), «Взгляд» (наш «Крок»), «7 дней» (наш «Рытм») і г. д. Праўда, былі ў свой час на БТ «5 мінут на роздум» (зараз «Наш каментарый») да таго, як з'явіўся «Прожектор перестройки» на ЦТ; «МТЦ», які па форме застаўся непаўторны; а сёння ЦТ «паўтарыла» наша «Рэха дня» («Эхо дня»). І ўсё ж... залежнасць ад усіх і ўсяго, галоўнае, нейкая інтэлектуальная залежнасць — гэта сумная рэальнасць БТ.

Засяроджанае, мэтанакіраванае выхаванне журналісцкай свядомасці вялося і вядзецца перш-наперш на нашым журфаку БДУ. І дагэтуль мне сустракаюцца студэнты, што спецыялізуюцца па ТБ і РВ, якія здагадваюцца (не ведаюць, не карыстаюцца) пра законы псіхалогіі зносін, псіхалогіі ўспрымання аўдыёвізуальнай інфармацыі, пра псіхалогію і драматургію пабудовы інтэрв'ю, размовы, пра неабходнасць падрыхтоўкі да тэмы сюжэтаў... Маладыя журналісты часам не могуць назваць прозвішчы кампазітараў, мастакоў і пісьменнікаў свету; сваіх, беларускіх, таксама. Ці не самае балючае месца падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў і іх непасрэднай «вытворчай» дзейнасці — мова і слоўнікавы запас. Беларускай лексікай не валодаюць, рускай — на побытавым узроўні.

Час і прафесійныя патрабаванні да журналіста дыктуюць жорсткія ўмовы і крытэрыі. Па сутнасці журналіст, тым больш тэлевізійны, адначасова мусіць быць палітыкам, псіхолагам, эрудытам, паліглотам, мастацтвазнаўцам ці спецыялістам у адной-дзвюх галінах, артыстам. Лепшым з лепшых. Пакуль жа журналіст сустракаецца «з жыццём», дзе яму ўсё адно, слухае-глядзіць яго аўдыторыя ці не: зарплату і ганарары (зразумела ж, адпаведна бяднюткія) яму плацяць пасля выйсця ў эфір. І такая сістэма нам спушчана з «цэнтра», з Дзяржтэлерадыё СССР. І мы пакуль яе пакорліва-паслухмяна падтрымліваем. Мы ж адзіная саюзна-рэспубліканская сістэма вяшчання, дзе нам, Дзяржтэлерадыё БССР, наканавана роля «мясцовага», «Мінскага» — не дзяржаўнага, не рэспубліканскага, не самастойнага. Пе-ры-фе-рый-нага.

Аптымізму надае праект Закона аб друку і абвешчаная сістэма рэспубліканскага самакіравання і самафінансавання. Але, як вядома, па бальшыні гэта самастойнасць толькі абвешчана, бо ўсе буйныя прадпрыемствы БССР — падпарадкавання саюзнага. Як і мы, Дзяржкамітэт БССР па тэлебачанні і радыёвяшчанні. Па матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні, па адміністрацыйна-структурным падпарадкаванні Камітэт пакуль не становіцца самастойным адпаведна абвешчанай самастойнасці рэспублікі. Больш за тое, да саюзнага кіруючага органа падначалення далучаюцца і яшчэ тры рэспубліканскія інстанцыі, якія кіруюць Дзяржтэлерадыё БССР. Як гэта? А вось як. Паводле Канстытуцыі БССР усе міністэрствы і ведамствы зацвярджаюцца і падпарадкаваны вышэйшай заканадаўчай уладзе — Вярхоўнаму Савету БССР, які зацвярджае старшыню Дзяржтэлерадыё БССР, пасля таго, як яго прадставіць Саўмін БССР. Паводле той самай Канстытуцыі наш Камітэт, як ведамства сістэмы выканаўчай улады — Саўміна БССР, падпадаркаваны і яму, у асноўным па лініі бюджэтна-тэхнічнага забеспячэння. А паколькі наш Камітэт — установа ідэалагічная, дык ён падсправаздачны яшчэ і ідэалагічнаму аддзелу і бюро ЦК КПБ...

Так склаліся ў рэспубліцы дачыненні з радыё за 65 гадоў яго існавання і з тэлебачаннем — за 35. Міжволі тут прыгадваецца прымаўка пра дзіця, якое застаецца без носа ў сямі нянек, а калі працягнуць метафару, дык рэспубліканскае тэлебачанне кульгае на абедзве нагі (не хапае машын, паліва), крывое ці не на два вокі (хранічна і банальна не хапае сучаснай перасоўнай тэхнікі), без рук (не хапае мантажнай тэхнікі, студый, матэрыялаў для афармлення). Ну, што тут можна казаць, калі Еўропа і свет пераходзяць на лічбавую і лазерную тэле- і радыётэхніку, мантаж ажыццяўляюць ЭВМ па спецыяльных праграмах!

А наш Рэспубліканскі радыётэлецэнтр (РРТЦ) вымушаны (а, можа, й выгадна яму!) спасылацца на збуцвелыя маскоўскія інструкцыі тэхнічна-вытворчага забеспячэння. Ну, на самай справе, ці не нонсенс сёння, калі пад адным дахам чатыры цэхі-арганізацыі, але адна з іх — гасразліковая (РРТЦ) і ад яе (як ад, скажам, калісьці ад МТС, ад саўнаргаса, ад РАПА і іншых нашых грамадска-вытворчых кантор «залежаў» ураджай!) сёння залежыць якасць і сучаснасць тэлевізійнай журналістыкі! І заробак ніводнага з інжынераў не залежыць ад канчатковага прадукту — ад якасці тэлеперадачы. Відаць, наспела стварэнне тэлевізійна-вытворчых аб'яднанняў, куды раўнапраўна ўваходзілі б і журналісты, і рэжысёры, і інжынерна-тэхнічны персанал.

Пакуль што, шаноўны чытач, БТ больш змагаецца з тымі «нянькамі», чым песціцца і гадуецца імі. Ды й увогуле, ці не пара з інфантыльна-апаратных «штонікаў», у якіх БТ трымаюць «нянькі», пераапрануцца ў дарослую і элегантную камунікатыўна-тэлевізійную спяцоўку самастойнага працаўніка-спадара? Ці не наспела грамадская і проста чалавечая патрэба незалежнасці электроннай інфармацыі ад усіх грамадскіх арганізацый, акрамя вярхоўнай улады дэмакратычных саюзаў?

Такое становішча рэспубліканскага аўдыёвізуальнага сродка інфармацыі і масавай камунікацыі, як кажуць, «склалася» і павінна мяняцца разам з часам, з патрабаваннямі жыцця ў прынцыпова новых палітычных, ідэалагічных, эстэтычных, сацыяльна-маральных, псіхалагічных умовах. І ўмовы гэтыя, увесь кантэкст сацыяльнага жыцця патрабуюць вызначэння і, адпаведна, самавызначэння

Працяг размовы

ЧАГО МЫ ВАРТЫЯ— БЕЗ КУЛЬТУРЫ?

У «ЛіМе» за 27.04.90 г. быў змешчаны ліст чытачкі І. Пракапенкі «Збеднена ўсё наша грамадства...». На тую публікацыю адгукнуўся старшы выкладчык БДК А. Селачнік — «Што ж здарылася з музычнай культурай!» (гл. нумар за 3.VIII.90).

Праблемы музычнага выхавання і асветніцтва, адраджэння духоўнай культуры ў грамадстве, якія, дарэчы, увесь час у полі зроку «ЛіМа», турбуюць і аўтара гэтых нататак.

Шэраг тых змен, якія носяць назву «перабудова», суадносяцца з сацыяльнымі, эканамічнымі і палітычнымі падзеямі. І як жа тут хочацца выгукнуць: «Людзі! Не адным толькі хлебам жыве чалавек!» Той вал інфармацыі, які штодня абрыньваецца на кожнага з нас, можа ўвагнаць людзей у інфармацыйна-палітычны шок. Шмат хто верыць у перамогу дэмакратычных сіл, але многія страцілі гэтую веру, перажыўшы доўгія гады свайго роду небыцця.

Думка пра тое, што ў нас парушаны генафонд, не новая. Ды таму яшчэ цяжэй бачыць, як гэты генафонд парушаецца і далей. Колькі ўжо дзеячаў культуры зрабіла ў сваім жыцці рашучы крок — з'ехала за мяжу. Што гэта? Відаць, колькі гадоў назад для многіх жыццё за мяжой і сам ад'езд туды былі сімвалам збавення ад турбот, гэткім раем. Але, як гаварыў пасля 17-гадовай адсутнасці на радзіме галоўны рэдактар літаратурнага часопіса ў Парыжы «Континент» Уладзімір Максімаў, «эміграцыя — гэта усё ж такі экстрэмальная сітуацыя!» (штотыднёвік «Семья», № 20, 1990 г.).

Працэс разбурэння культуры сёння ўжо відавочны для ўсіх. А наогул жа, культура нашай краіны складаецца з самабытных культур кожнага народа. Культура народа складаецца з культуры гарадоў, вёсак... Што ж робіцца тут у нас, беларусаў?

Вось — Гродна. Што гаворыць гэта чытачу? Камусьці на памяць прыходзяць старыя брукаваныя вуліцы, усё тое, што робіць горад старажытным. Год назад выйшаў энцыклапедычны даведнік «Гродно». Глядзіш яго з думкай пра тое, што горад гэты — гісторыка-культурны асяродак Заходняй Беларусі. Толькі вось калі культурны, дык чаму дасюль няма ў ім ніякага культурнага цэнтра? І што такое культурны цэнтр?

Цывілізаванае чалавецтва даўно ўжо ўсвядоміла, што не трэба эканоміць сродкі на культуры. А ў нас жа ніякай эканоміі на ёй і не робіцца, бо... няма ні сродкаў, ні ўжо культуры! І толькі гісторыя данесла да нас факты таго, што калісьці горад быў на скрыжаванні культурных шляхоў. Былі і балет у Гародні, і тэатр у Слоніме, куды нават запрашалася трупа з Італіі.

Гродзенцы зараз вельмі далёкія ад думкі, каб каго-небудзь запрашаць з Італіі, далёкія ад думкі, каб мець культурны цэнтр такога тыпу, як Лінкальн-Цэнтр у Вашынгтоне. Але для пачатку аднаўлення культуры, яе рэанімацыі трэба ўладам, якія кіруюць культурай, тыя адпаведныя будынкі, што захаваліся ў горадзе. Напрыклад, Базіліянскі кляштар, у памяшканні якога існуе Рэспубліканскі музей гісторыі рэлігіі, мае ўсё неабходнае, каб рабіць настрой на сустрэчу з Вялікім Мастацтвам.

У музеі ёсць невялікая зала на 80—90 месцаў з добрай акустыкай. Час ад часу ў ёй праходзяць канцэрты камернай вакальнай, інструментальнай, харавой музыкі. Летась тут адбыўся аўтарскі вечар маладога кампазітара Андрэя Бандарэнкі. Той канцэрт сабраў выканаўчыя сілы не толькі Гародні, але і сталіцы Беларусі. Тады ўпершыню і прагучала думка наконт таго, каб зрабіць музей культурным цэнтрам Гродзеншчыны. Тым больш, што канцэрт паказаў: у горадзе ёсць

БТ як самага масавага сродка зносін, БТ як сродка, у пэўным сэнсе, вызначэння і пабудовы новай Беларусі — Рэспублікі, якая толькі-толькі прыняла Дэкларацыю аб Суверэнітэце. Менавіта масавасць тэлебачання і моц яго ўздзеяння падштурхоўваюць да высновы, што БТ павінна быць, так сказаць, парламенцкім, падпарадкоўвацца і даваць справаздачу ў асноўных палітычных і ідэалагічных накірунках толькі вышэйшай уладзе — Вярхоўнаму Савету БССР і З'езду народных дэпутатаў. Чаму? — Таму, што толькі Савет (а можа парламент, сейм, рада?..) будзе ў будучым аб'ядноўваць народных дэпутатаў розных сацыяльных катэгорый, розных партый, грамадскіх арганізацый і рухаў. Толькі максімальная ідэалагічная і арганізацыйная самастойнасць органа, як самага масавага і моцнага, могуць пазбавіць яго ад тэндэнцыйнага ўздзеяння і надаць больш дэмакратызму і пэўнай «нейтральнасці». Да таго ж стукаецца ў дзверы «манапольнага» рэспубліканскага тэлебачання лакальнае, раённае тэлебачанне. Лунае ідэя так званага альтэрнатыўнага вяшчання, якое ўжо сёння зможа выкарыстоўваць спадарожнікі сувязі і перадаваць замежныя праграмы, фільмы. Такая альтэрнатыва можа пастаянна «штурхаць» ці не самы рухомы па сваёй прыродзе грамадскі інстытут — тэлебачанне.

А пакуль у калідорах і кабінетах тэлевежы, што па вуліцы Макаёнка, 9, пры словазлучэнні «альтэрнатыўнае тэлебачанне», тым больш камерцыйнае і тым больш пад назвай «талака» (ці не падобны працэс стварэння тэлевізійнай праграмы на вясковую талаку, калі грамадой, калектыўна, разам?..) з'яўляюцца скептычныя ўсмешкі ці сурова ссоўваюцца бровы...

Каб вызначыць месца БТ у пабудове нацыянальнай, самабытнай, па-сапраўднаму самастойнай Беларусі - дзяржавы, трэба, відаць, вызначыць спачатку, што гэта такое — нацыянальнае тэлевяшчанне? Што павінна адрозніваць яго, скажам, ад ЦТ, ад расійскага, ад украінскага, ад...?

Па-першае, «мясцовая» інфармацыя. Прынамсі, мне ўяўляецца, што яе падрыхтоўка і «выдача» падобны зноў на тую самую «талаку», дзе нават тэлегледачы могуць будаваць інфармацыйны блок — падказаць незвычайны, востры, выключны факт, падзею, асобу па тэлефоне, у лісце, у студыі. (Менавіта так, у садружнасці з тэлегледачамі, стварае свае «600 секунд» знакаміты Саша Няўзораў). Мы мусім знайсці, прыдумаць форму, «адзенне» нацыянальнага вяшчання, самым вялікім камянём у падмурку і сценах якога зробіцца наша мова і, адпаведна, усё, што з ёй звязана. А з ёй звязана ці не ўся сучасная палітычная сітуацыя ў рэспубліцы.

Мы павінны сабе прызнацца яшчэ і яшчэ раз, што, па сутнасці, цераз мову, праз і з дапамогай нацыянальнага слова, мыслення, псіхалогіі рэспубліка можа вызначыцца як Беларусь, а не як Паўночна-Заходні край. І менавіта Беларускае тэлебачанне можа і павінна распаўсюджваць «слоўныя біятокі» беларускай зямлі.

Менавіта тэлебачанне можа і павінна фарміраваць і культываваць «гульню» нацыянальнай фантазіі праз і паводле мелодыкі і словазлучэнняў беларускай мовы, праз і паводле моўнай і інтанацыйнай (нават тэмбравай) эстэтыкі. Вось, калі вы, чытачы-гледачы, заўважыце зрухі ў свабодзе беларускамоўнага мыслення, красамоўнасць, інтэлектуальную і эмацыянальную раскаванасць удзельнікаў перадач, і, асабліва, нашых журналістаў-вядучых,— тады гэта будзе сведчыць, што мы ўсе—па абодва бакі экрана — зрабілі крок у развіцці нацыянальнага інтэлекту. У яго цывілізаваным развіцці!

А пакуль на хвілінку ўспомнім мову і мысленне многіх нашых парламентарыяў на рэспубліканскай сесіі, мову і працэс «экраннага» мыслення нашых тэлежурналістаў, каб усвядоміць: як жа мы павінны спяшацца па шляху самаразвіцця той самабытнай формы быцця народа — мовы, яе лексікі, словаўтварэння і, адпаведна, візуальнай артыстычнасці!

Як кажуць, «яшчэ ўчора» наспела неабходнасць карэнным чынам перагледзець нашы тэлевізійныя міжнацыянальныя зносіны, зрабіць іх сапраўднымі сучаснымі зно-сі-на-мі з непасрэднай чалавечай рэакцыяй. Ці не цікава будзе нашаму тэлегледачу глядзець не запіс, а прамы эфір «тэлемаста», скажам, з Эстоніяй, Малдовай, або з Казахстанам, Варкутой, дзе, дарэчы, шмат жыве беларусаў з часоў сталінскага «вялікага перасялення»?

Увогуле наспеў і працэс пашырэння беларускамоўнай «тэлеаўры»: свет павінен чуць музыку мовы аднаго са сваіх народаў. Голас-мову-роздум Беларусі павінны чуць за мяжой. Але замежнае вяшчанне для БТ—«белая пляма», «зямля невядомая». Відаць, трэба і карэнным чынам пераасэнсоўваць паняцце «замежнае вяшчанне Беларусі» ў кантэксце суверэнітэту саюзных рэспублік і, зразумела, нашай Дэкларацыі аб незалежнасці. Таму ці не цікава паспрабаваць заключыць дагавор з сімі-тымі замежнымі тэлекампаніямі аб абмене тэлеінфармацыяй (і, адпаведна, паспрабаваць зарабіць валюту)? Спачатку, магчыма, можна было б выйсці на заключэнне аднабаковых кантрактаў з тэлекампаніямі або асобнымі іх прадстаўнікамі - тэлежурналістамі, дзе беларускія асобныя журналісты або тэлерэдакцыі могуць выступаць у якасці спецкораў. Ці не цікава гэта, калі наша мова загучыць з замежнага экрана? І вы, чытач, справядліва заўважыце: навошта гэтыя рытарычныя пытанні, даўно пара, чаго вы там сядзіце! Сядзелі, так. То, можа, зараз паспрабуем зварухнуцца...

Невялікі вопыт тэлезносін чатырох рэспублік у нас ёсць: маладзёжная праграма «Магістраль», у якой удзельнічалі Эстонія, Латвія, Літва і Беларусь. І амаль сканала гэта праграма, таму што «занадта» разыходзяцца пазіцыі прыбалтаў з нашай афіцыйнай устаноўкай на саюзнае падпарадкаванне, «занадта» смела і незалежна гаворыць моладзь нашых рэспубліксуседак. А беларусам часам не хапае аргументаў, майстэрства вядзення дыялога, дыскусіі, інтэрв'ю, каментарыя. Дый да таго ж мо й наша, беларуская «сусветная» сціпласць замінае? Як замінаюць і хібы журналісцкай (чытай — дзяржаўнай, агульнакультурнай, камунікатыўнай, псіхалагічнай, ідэалагічнай) падрыхтоўкі? У тым ліку падрыхтоўкі ў плане, так мовіць, «электронна-дзяржаўнага мыслення». Гэта значыць мыслення і зносін праз ЭВМ, спадарожнікі сувязі, праз магчымасці электронікі як сістэмы сродкаў новай эстэтыкі — спецэфектаў, электроннага дызайну, камп'ютэрнага «афармлення» вяшчання. І ўсё ж мысленне, як тое біблейскае «слова», што было напачатку, павінна быць наперадзе, каб ва ўнікальных гістарычных ўмовах асэнсаваць пазіцыі дзяржаўнасці Беларусі не як «малодшай сястры», а як самастойнай суверэннай дзяржавы з еўрапейскай шматвяковай гісторыяй.

Міхась КАЛАЧЫНСКІ

10 жніўня 1990 года на 74-м годзе жыцця памёр вядомы беларускі паэт, член КПСС з 1942 года, заслужаны работнік культуры БССР, персанальны пенсіянер рэспубліканскага значэння Міхась (Міхаіл Іванавіч) Калачынскі.

М. І. Калачынскі нарадзіўся 12 студзеня 1917 года ў гарадскім пасёлку Крупкі Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння сярэдняй школы працаваў старшым піянерважатым, потым літработнікам у Крупскай раённай газеце. Скончыў курсы пры Камуністычным інстытуце журналістыкі ў Мінску. Працаваў адказным сакратаром рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва». Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Франтавы шлях прайшоў армейскім журналістам. У пасляваенны час працаваў у вайсковых газетах. Рэдагаваў альманах «Советская Отчизна», з 1960 па 1978 год — галоўны рэдактар часопіса «Беларусь». Быў адказным сакратаром, а затым намеснікам старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Пачаў друкавацца ў 1932 годзе. Ён аўтар шматлікіх зборнікаў паэзіі — «Сонца ў блакіце», «У вялікім паходзе», «Прыпар», «Сосны і дзюны», «Гронка рабіны», «Паясы», «За палямі, за лясамі», «Докшыцкі каравай» і іншых. Плённа працаваў паэт і на ніве дзіцячай літаратуры. У розныя гады з-пад яго пяра выходзяць кнігі «Насустрач жыццю», «Лясныя казкі», «Прыгоды патапкі», «Мая мазаіка». Неаднаразова творы Міхася Калачынскага выдаваліся на мовах народаў СССР і свету. Працаваў ён і ў галіне мастацкага перакладу.

Міхась Калачынскі — паэт самабытнага таленту, высокага грамадзянскага гучання. Няўрымслівы змагар за народныя ідэалы, ён напаўняў свае творы шчырым святлом любові да Радзімы, да бацькаўшчыны, да чалавека працы.

Баявыя і працоўныя заслугі М. І. Калачынскага высока ацэнены Радзімай. Ён узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Айчыннай вайны і двума ордэнамі «Знак Пашаны», многімі медалямі.

Светлая памяць пра паэта-камуніста, натхнёнага майстра паэтычнага слова Міхася Калачынскага назаўсёды захаваецца ў сэрцах тых, хто ведаў яго.

В. А. ПЯЧЭННІКАЎ, Н. М. МАЗАЙ, К. К. АТРАХОВІЧ (Кандрат Крапіва), В. У. АДАМЧЫК, Р. І. БАРАДУЛІН, І. А. БРЫЛЬ, В. У. БЫКАЎ, Я. К. ВАЙТОВІЧ, А. С. ВЯЛЮГІН, А. І. ВЯРЦІНСКІ, А. М. ГЕРАСІМЕНКА, Н. С. ГІЛЕВІЧ, А. С. ГРАЧАНІКАЎ, А. П. ЖАЛЯЗОЎСКІ, С. І. ЗАКОННІКАЎ, В. В. ЗУЁНАК, Ц. В. КРЫСЬКО (Васіль ВІТКА), А. П. КУДРАВЕЦ, У. С. ЛІПСКІ, А. А. КАРАТАЙ (Максім Лужанін), Т. К. МАЛІНОЎСКІ, М. І. МІСУНА, У. П. НЯКЛЯЕЎ, Р. В. НЯХАЙ, І. Я. НАВУМЕНКА, П. Е. ПАНЧАНКА, У. А. ПАЎЛАЎ, А. У. ПІСЬМЯНКОЎ, А. С. РУСЕЦКІ, А. У. РУСЕЦКІ, Я. І. СКУРКО (Максім Танк), М. С. СТУКАЧ, В. П. СУПРУНЧУК, І. Г. ЧЫГРЫНАЎ, І. П. ШАМЯКІН, А. А. ШАБАЛІН, Г. У. ШЫЛОВІЧ.

РАЗВІТАЛЬНАЕ

Не ў Рым святы
І не ў спякотны Крым,
А як спрадвек наканавана
богам,
На могілкі, што хмарай лес
акрыў,
Вядуць усе шляхі
І ўсе дарогі.

Канторы надмагільная карчма
Імя як даўжніка занесла
ў кнігу.
Бы ледалом уздыбіўся
старчма —
Пліт мармуровых —
Каля крыгі крыга!

Хто можа глыбу
Смутку і тугі
Скаціць з душы альбо цяжар
узважыць?
Труны жалобнай зеўраць
берагі,
Што векам і цвікоў вузламі
Звяжуць.

Вяшчуючы,
Зязюля ў ранні час
Яму гады ўжо болей не
палічыць.
Схіліся, неба, і ў апошні раз
Запомні гэта ціхае аблічча!

Паўдзён самлелых не
расчэпіць рук
Пад векавым скляпеннем
пантэона.
І зараз ён, труны смалісты
зруб,
У бездань апраметную патоне.

А дзень гудзе, нібыта
з кірмаша
Вяртаецца улегцы і з вазамі.
Грымі скразнымі вёрстамі,
шаша,
Што Мінск з кутком паэтавым
Звязала!

Абрабаваў боль страты,
абабраў,
Магчыма, больш, чым іншымі
часамі.
Ідуць аблокі гуртам з-пад
Бабра,
І коціцца валун неабчасаны.

Каменны бог, каменны
патрыярх!
Агнём яго душу пакуты
паляць.
Ён сядзе земляку у галавах,
Каб вартаваць яго спакой
І памяць.

Дармо, што выб'юць горкі
некралог,
І цішыня застыне скрухай
немай,
Ягонае каменнае крыло
Ірвацца будзе ветразем
У неба!

Не бачна дня з-за гора і тугі,
І не сабрацца з сілай, бы
ў задуху.
Міхась Іванавіч, зямляк мой
дарагі,
Хай станецца зямля навекі
пухам!

Васіль МАКАРЭВІЧ.

Саюз пісьменнікаў БССР глыбока смуткуе з прычыны смерці пісьменніка КАЛАЧЫНСКАГА Міхаіла Іванавіча і выказвае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

Калектыў рэдакцыі часопіса «Беларусь» смуткуе ў сувязі са смерцю былога галоўнага рэдактара часопіса, вядомага беларускага паэта Міхася КАЛАЧЫНСКАГА і выказвае спачуванне сям'і, родным і блізкім нябожчыка.

нямала маладых адметных выканаўцаў, якім проста няма дзе раскрыць свой творчы патэнцыял.

І вось ужо сёлета давялося мне выступіць з першым сольным канцэртам у родным горадзе, куды я вярнуўся пасля вучобы ў кансерваторыі. Публіка, якую ў асноўным складала студэнцкая моладзь, вельмі зацікаўлена слухала фартэпіянныя творы венскіх класікаў, Ф. Ліста, С. Рахманінава. Сустрэча з **Музыкай**, на мой погляд, адбылася.

Праз тыдзень быў наладжаны вечар камернай інструментальнай музыкі. Выканаўцы — выкладчыкі музычнага вучылішча Віктар Гільдзюк (скрыпка) і Алена Лябецкая (фартэпіяна). Праграму склалі санаты Л. Бетховена, І. Брамса, творы П. Чайкоўскага і іншых кампазітараў. Канцэрт не толькі паказаў майстэрства выканаўцаў, іх тонкае адчуванне розных музычных стыляў, а і зазначыў нараджэнне новага творчага саюза, у якога ёсць добры выканаўчы патэнцыял. На жаль, публікі было ўсяго каля сарака чалавек. Гэта асабліва горка яшчэ і таму, што канцэрт быў дабрачынны.

А ў Міжнародны дзень музеяў у Рэспубліканскім музеі гісторыі рэлігіі зноў адбыўся дабрачынны канцэрт. У першым аддзяленні выступіў хор музычнага вучылішча пад кіраўніцтвам Л. Іконнікавай, у другім іграў аўтар гэтых радкоў.

Харавы калектыў Л. Іконнікава — ужо даволі вядомы ў вобласці, нават набывае славу прафесійнага. І слухачы дабрачыннага канцэрта пераканаліся, як своеасабліва і вельмі тонка чуе музыку кіраўнік хору, як перадае сваю чуласць калектыву, як захапляе яго сваёй самаадданасцю ў кожным творы; як добра акампануе канцэртмайстар Р. Нікіціна, выкладчыца музычнага вучылішча.

Уласнае выступленне я вырашыў пачаць з размовы пра творы, якія меўся іграць. Здавалася, кароткая гутарка парушыла псіхалагічныя бар'еры паміж мною, піяністам, і аўдыторыяй. Выканаўшы «Карцінкі з выстаўкі» М. Мусарскага, Санату С. Пракоф'ева, творы А. Бандарэнкі, я адчуў паразумеласць з залай. Аднак... засмучала, што запоўнена яна была на якую трэць.

Наогул жа, канцэрты з удзелам маіх калег — гродзенскіх музыкантаў наводзяць на думку, што нашы творчыя сілы ўжо даўно маглі б быць заўважаны тымі «працаўнікамі культуры», якія дагэтуль усё кіруюць ёю, не з'яўляючыся нават паслухаць такія вось канцэрты. Па сутнасці гэтыя канцэрты — культурна - асветніцкія, грошай ад іх музыканты не маюць. Шкада, што праходзяць яны ў незапоўненых залах. Мо таму, што рэклама гэтых «пазапланавых» канцэртаў знаходзіцца на ўзроўні «савецкай рэкламы», што гучыць там «некамерцыйная» класічная музыка?.. Тым не менш, як гавораць супрацоўнікі музея, на канцэрты сваіх, гродзенскіх выканаўцаў гараджане ідуць усё ж больш, чым на гастралёраў з ганаровымі званнямі. Гэта дае пэўныя спадзяванні на будучыню, на мажлівасць адраджэння сваёй культуры.

Сёння ўсе навокал гавораць пераважна пра набліжэнне эканамічнай рэформы. А трэба падумаць і пра дзень будучы, заўтрашні. Чаго ён будзе варты — без культуры? З якім багажом **культуры** падыдзем мы да яго?

Уладзімір ЛЯБЕЦКІ,
загадчык аддзялення
музычнага выхавання
педвучылішча.

г. Гродна.

...І назвалі курыцу карасём

(Пачатак на стар. 5).

нездавальняючым. Чым жа быў ушчэрбны для Маркса сацыялізм XVIII стагоддзя? Маркс гаворыць пра гэта зусім пэўна: ён не ўказваў рэальных шляхоў, што вядуць да пабудовы грамадства, заснаванага на прынцыпах сацыялізму. Таму ён і назваў гэты сацыялізм утапічным. І меў, безумоўна, рацыю: любая ідэя толькі тады набывае навуковы і грамадска значны сэнс, калі ўказаны шляхі яе рэалізацыі. У адваротным выпадку яна ёсць усё, што хочаш: гульня ўяўлення, плён фантазіі, ідэалагічны фантом, толькі не ідэя ў навуковым змесце гэтага паняцця.

Напрыклад, сёння ў модзе гуманны, дэмакратычны сацыялізм. Я нічога не маю супраць сацыялізму, тым больш гуманнага і дэмакратычнага. Але мне хацелася б ўсё ж ведаць: што гэта такое— гуманны, дэмакратычны сацыялізм і чым ён адрозніваецца, папершае, ад іншых сваіх разнавіднасцей, па-другое, ад таго ж капіталізму? Нарэшце, і гэта галоўнае, вынікам якіх аб'ектыўных грамадскіх працэсаў ён паявіцца на свет божы? Паколькі адказаў на гэтыя законныя пытанні я не знаходжу, у мяне няма абсалютна аніякіх падстаў разглядаць ідэю гуманнага, дэмакратычнага сацыялізму як навуковую ідэю.

Мы можам колькі хочаш знеслаўляць нашых артадоксаў за кансерватызм мыслення, нежаданне спусціцца з заваблачных вышынь сваіх «прынцыпаў» на грэшную зямлю — яны вартыя таго. Але ў адным артадоксы маюць рацыю: тыя меры, якія прапануюцца як крокі на шляху да гуманнага, дэмакратычнага сацыялізму, нічога спецыфічна сацыялістычнага ў сабе не заключаюць. Ці не так? Можа, гэтым спецыфічна сацыялістычным з'яўляецца рынкавая эканоміка? Дык жа яна існуе ва ўсім свеце. Рэгулюемая рынкавая эканоміка? Тут трэба паглядзець, што мы пад ёй разумеем. Калі мы маем намер рэгуляваць рынак з дапамогай эканамічных механізмаў, дык гэта ўжо робіцца ва ўсіх цывілізаваных краінах. Калі ж з дапамогай адміністратыўнага дыктату, дык няма чаго гарод гарадзіць — гэтым мы займаемся ўжо амаль тры чвэрці стагоддзя. Можа, прававая дзяржава — атрыбутыўная ўласцівасць сацыялізму? Але ідэя прававой дзяржавы таксама не плён гуманна-сацыялістычнага мыслення. Прававая дзяржава існуе ў Англіі, Бельгіі, Францыі і г. д. Вось я і не вазьму аніяк да розуму: усё, да чаго мы яшчэ толькі імкнёмся, даўно ўжо стала здабыткам чалавечай цывілізацыі. Але чамусьці ў іх гэта капіталізм, а ў нас павінна іменавацца гуманным, дэмакратычным сацыялізмам.

І тут мне міжволі прыходзіць на памяць адна старая французская прытча. Жыў калісьці набожны манах Гаранфло. І трэба ж такому здарыцца, што менавіта ў посны дзень страшэнна захацелася манаху пакаштаваць свежай курацінкі. Што рабіць, як вырашыць гэтую антыномію: і курацінай паласавацца, і бога не прагнявіць? Думаў манах думаў і прыдумаў: узяў ды і здзейсніў над курыцай абрад святога хрышчэння, назваўшы курыцу карасём. Ну а рыбу, як вядома, святая царква не забараняе есці нават у посны дзень. Вось я і думаю: ці не хочам мы здзейсніць над капіталізмам абрад святога хрышчэння, абавязаўшы яго называцца з гэтага часу не капіталізмам, а гуманным, дэмакратычным сацыялізмам. Выгода відавочная: і справы свае паправім, і марксісцка-ленінскую сваю цнатлівасць зберажом. А калі сур'ёзна, дык ці не час выкінуць на гістарычны сметнік ідэалагічныя бразготкі, як гэта ўжо даўно зрабілі ўсе разумныя людзі, і дадаць, нарэшце, магчымасць грамадству развівацца па сваіх уласных, і манентна ўласцівых яму законах? Няўжо нас не пераканала жыццё: «капіталістычны» хлеб зусім прыдатны для «сацыялістычнага» страўніка. Але як бы там ні было, трэба, напэўна, пагадзіцца ў адным: ідэя гуманнага, дэмакратычнага сацыялізму, паколькі яна навукова не абгрунтавана, у лепшым выпадку можа быць аб'ектам веры, але ва ўсякім разе не прадметам сур'ёзнай дзяржаўнай палітыкі. Тут мае сімпатыі цалкам на баку Маркса, які крытыкаваў сваіх ідэйных папярэднікаў за утапізм.

Што ж прынцыпова новае было ўнесена Марксам у «сацыялістычную ідэю», што пераўтварыла яе, як думаў сам Маркс, а ўслед за ім і ўсе яго саратнікі і вучні, «з утопіі ў навуку»? У самым агульным выглядзе на гэтае пытанне можна было б адказаць так: Маркс лічыў, што яму ўдалося намацаць рэальныя шляхі, якія вядуць да матэрыялізацыі гэтай ідэі, пераўтварэння яе з феномена чыстай свядомасці ў факт існай рэчаіснасці.

Перш за ўсё Маркс зыходзіў з той дыялектычна-матэрыялістычнай пасылкі, што працэс грамадскага развіцця, нягледзячы на яго свядомы і мэтазгодны характар, такі ж аб'ектыўны, як і працэс развіцця прыроды, г. зн. падпарадкоўваецца пэўным законам, якія чалавеку не падуладны. Чалавек можа толькі спазнаць іх і ўзгадніць з імі сваю дзейнасць. У гэтым і заключаецца сапраўдная свабода чалавека: не ў залежнасці ад законаў прыроднага і сацыяльнага быцця, а ў здольнасці дзейнічаць у адпаведнасці з гэтымі законамі.

Ці меў рацыю Маркс? Безумоўна, меў, што б ні гаварылі крытыкі, якія менавіта гэтак разумеюць ідэю свабоды. Як я спрабаваў даказаць («ЛіМ», 1990, № 12), уся гэтая крытыка грунтуецца альбо на непаразуменні, альбо на вульгарна-прагматычным яго, гэтага разумення, вытлумачэнні, якое не мае нічога агульнага з дыялектыкай. Ісціннасць дыялектыкі і слушнасць Маркса, які прытрымліваўся ў дадзеным выпадку яе прынцыпаў, пацверджана ўласна нашай гісторыяй. Менавіта валюнтарызм, імкненне быць разумнейшымі за само жыццё і прывялі нас да ўсеагульнай грамадскай катастрофы: разбурэння прыроднага асяроддзя, эканомікі, культуры, прававога і маральнага нігілізму.

Што ж, аднак, вынікала з гэтай пасылкі? Вынікала адно: калі сацыялізм не плён пустой фантазіі, не выдумка летуценнікаў, дык яго карані павінны ляжаць у самім жыцці, а значыць, і з'явіцца ён можа толькі як натуральны вынік логікі самога жыцця, унутраных механізмаў яго развіцця. Намаганні Маркса з гэтага часу і накіраваны на тое, каб ускрыць гэтыя механізмы.

Тое, што існуючыя формы грамадскага жыцця гістарычна асуджаны, — гэта для Маркса было відавочна. І не толькі таму, што вынікала з самой сутнасці дыялектыкі, якая бачыць на кожнай з'яве адзнаку яе непазбежнай пагібелі. Увесь шматвяковы вопыт чалавецтва сведчыць аб ненарушнасці гэтай старой мудрасці: няма нічога вечнага пад Месяцам. Формы чалавечай супольнасці пастаянна мяняюцца: родаплемянны лад змяніўся рабаўласніцкім, на змену яму прыйшоў феадалізм, які, у сваю чаргу, вымушаны быў саступіць месца капіталізму. Няма абсалютна ніякіх ні лагічных, ні фактычных падстаў думаць, што капіталістычная форма грамадскага ладу — той ідэал, які ўвабраў у сябе ўсю мудрасць гісторыі.

Усё гэта так. Але адсюль яшчэ зусім не вынікае, што новыя формы, якія ідуць на змену капіталізму, — гэта і ёсць тыя формы, абрысы якіх былі акрэслены сацыялістамі-утапістамі. На жаль, Маркс забывае на другую, такую ж старажытную мудрасць: няма нічога новага пад Месяцам. Як бы ні мяняўся чалавек і формы чалавечай супольнасці, ён застаецца чалавекам, а значыць і формы яго грамадскага ўладкавання не могуць супярэчыць карэнным уласцівасцям чалавечай прыроды. Маркс думае інакш. Па яго перакананні, чалавек, зменьваючы прыроду, змяняе і сваю ўласную прыроду. Менавіта ў гэтым, цэнтральным пункце Маркс і робіць сваё першае святатацтва перад дыялектыкай.

Маркс, вядома, кажа праўду: чалавек — істота грамадская. Але, вылучыўшыся з прыроды і супрацьпаставіўшы сябе ёй, чалавек зусім не ператварыўся ў нешта надпрыроднае і звышнатуральнае. Чалавек — не толькі прадукт прыроды, але і частка прыроды, а таму знаходзіцца з ёй не толькі ў генетычнай, але і ў глыбокай актуальнай сувязі. Разглядаць чалавека толькі як «сукупнасць грамадскіх адносін» — значыць, начыста перагарадзіць сабе шляхі да разумення чалавека, бо сутнасць чалавека і сапраўднае яго багацце — у багацці ўзаемаадносін з усёй бясконцай прыродай. Грубая сацыялагізацыя чалавека несумяшчальная з дыялектыкай, для якой прырода і грамадства — не дзве сумежныя і толькі вонкава спалучаныя рэальнасці, а супярэчлівыя бакі адзінай рэальнасці, імя якой Універсум. У гэтых межах ісціна не на баку Маркса, а на баку крытыкуемага ім Феербаха.

Праўда Марксава і ў тым, што «чалавек — не абстракт, уласцівы асобнаму індывіду». Чалавек — гэта свет чалавека, свет, у якім ён жыве. Але гэта ўсё ж свет **чалавека**, а не адарваная ад чалавека, а таму невядома дзе і як існуючая «сістэма грамадскіх адносін». Грамадства, адарванае ад кожнага дадзенага канкрэтнага індывіда — такая ж мысліцельная абстракцыя, як і асобны індывід, узяты ў яго адарванасці ад грамадства. Таму зусім відавочна, што і грамадскі інтарэс, якім аперыруе марксізм, у яго ізаляцыі ад індывідуальнага інтарэсу — не больш чым мысліцельная абстракцыя. Абстракцыя, праўда, як паказаў наш вопыт «сацыялістычнага будаўніцтва», досыць зручная, бо дазваляе выдаваць за гэты грамадскі інтарэс карыслівыя інтарэсы правячай партыйна-дзяржаўнай вярхушкі. Але якраз чалавеку і не знаходзіцца месца ў марксісцкай сацыялагічнай дактрыне. У разуменні і выкладанні Маркса гістарычны працэс — безасабовы працэс. У ім ёсць законы, ёсць класы, але няма галоўнага — чалавека. Таму, нягледзячы, на ўсяляк рэкламуемую гуманнасць марксізму-ленінізму, дактрына гэтая па сутнасці глыбока антыгуманная.

На самай справе. Ніхто ж іншы, а менавіта Маркс лічыў, што аснову незалежнасці чалавека, а значыць, яго і грамадзянскіх і палітычных свабод складае эканамічная незалежнасць. Думка больш чым слушная. Але як, якім чынам яна можа быць сумешчана з адмаўленнем тым жа Марксам права чалавека валодаць уласнасцю? Мне могуць запярэчыць: чалавек, па Марксу, з'яўляецца суўласнікам грамадскай уласнасці. Усё гэта якраз і ёсць адна з ілюзій марксісцка-ленінскай канцэпцыі сацыялізму. І горкі наш вопыт — лепшы таму доказ.

Чытач, напэўна, памятае надзвычайнае здзіўленне, якое выказаў М. С. Гарбачоў на XXVII з'ездзе КПСС: як жа так, наш заўсёдны гонар, наша найвялікшая заваёва — грамадская ўласнасць аказалася на паверку нічыйнай? Гэтага не можа быць, тут яўная «дэфармацыя сацыялізму». А разам з тым здзіўляцца тут няма чаму, інакш і быць не магло. Бо як грамадства, адарванае ад жывых чалавечых індывідаў, ёсць усяго толькі мысленае, а не рэальна існуючае грамадства, так і грамадская ўласнасць, узятая паза сваіх прыватных формаў, г. зн. адарваная, адчужаная ад канкрэтных уласнікаў, ёсць усяго толькі мысленая, а не рэальна існуючая ўласнасць. Безасабовай, абесчалавечанай гісторыі, якой яна паўстае ў канцэпцыі Маркса, можа адпавядаць толькі такая ж безасабовая, нічыйная ўласнасць. Само сабой разумеецца, што такую гісторыю можна стварыць толькі ў галаве, рэальная гісторыя населена людзьмі. Але дакладна гэтак жа і грамадская ўласнасць — не больш чым стварэнне чыстай думкі, у рэальнасці ўласнасць абавязкова камусьці належыць.

На жаль, гісторыя злосна пасмяялася з Маркса. І пасмяялася невыпадкова. Яшчэ Гегель заўважыў дзіўную заканамернасць, якую ён назваў «іроніяй гісторыі»: чалавек імкнецца да аднаго, а вынік атрымлівае проста адваротны. Маркс быў перакананы, што абагуленая ўласнасць тут жа стане здабыткам кожнага чалавека. На самай жа справе ў выніку гэтай акцыі ўвесь народ пазбавіўся ўласнасці. Маркс быў перакананы, што, абагуліўшы ўласнасць, мы раз і назаўсёды скончым з яе прыватнай формай. На паверку ж аказалася, што ўласнасць проста не можа належаць абстракцыі, якая называецца грамадствам, яна шукае жывога, рэальнага гаспадара. Таму ўласнасць як была, так і засталася прыватнай уласнасцю, прыняўшы толькі іншую форму, апынуўшыся ў руках тых, хто выступае ад імя грамадства. Маркс быў перакананы, што грамадская ўласнасць раз і назаўсёды ліквідуе магчымасць любой эксплуатацыі. На паверку ж аказалася, што эксплуатацыя прымае ў гэтым выпадку яшчэ больш жорсткую, бесчалавечную форму, бо эксплуататарам аказваецца тут дзяржава-манапаліст і партыйна-дзяржаўная бюракратыя, што выступае ад яе імя. Маркс быў перакананы, што, абагуліўшы ўласнасць, мы створым умовы для палітычных і грамадзянскіх свабод. На самай жа справе атрымалася ўсё наадварот: чалавек трапіў у поўную залежнасць ад дзяржавы, стаўшы яе бяспраўным і бязмоўным рабом.

Чаму ж гісторыя так жорстка пажартавала з Марксам? Менавіта таму, што яна не дазваляе жартаваць з самой сабой, не дазваляе парушаць свае законы. Парушыўшы закон, які на абстрактнай мове матэрыялістычнай дыялектыкі называецца законам адзінкавага і агульнага, Маркс адарваў грамадства ад чалавека, метафізічна супрацьпаставіў яго чалавеку, у выніку чаго і грамадская ўласнасць, якая, на яго думку, павінна была сцвердзіцца ў новым, сацыялістычным грамадстве, аказалася не рэальнай уласнасцю, а ўсяго толькі мысленай канструкцыяй і добрым пажаданнем. Гісторыя пайшла, вядома, сваёй дарогаю, мала лічачыся з тым, якія маршруты падрыхтавалі ёй тэарэтыкі сацыялізму і прыхільнікі сацыялістычнага выбару. Шкада толькі, што гэтая яе «іронія» абярнулася трагедыяй для мільёнаў ні ў чым не вінаватых людзей.

Маркс зыходзіў з той дыялектычна - матэрыялістычнай прадпасылкі, што гістарычная заканамернасць мае, у адрозненне ад заканамернасцей прыроды, тую асаблівасць, што яна рэалізуецца праз свядомую і мэтазгодную дзейнасць людзей. Гісторыя, гаворыць ён, ёсць гісторыя мэтаімкнёнага грамадскага чалавека. І гэта сапраўды так. Гісторыя — не сляпы і безасабовы працэс, у ёй дзейнічаюць людзі, адораныя кожны сваімі патрэбамі, інтарэсамі, воляй. Гісторыя — гэта іх гісторыя, і яны яе творцы. Але калі гэта так, дык, пэўна, задача тэарэтыка, які паставіў сабе за мэту ўскрыць унутраныя механізмы функцыянавання і развіцця грамадства, заключаецца ў тым, каб зразумець: як і якім чынам людзі робяць сваю гісторыю? Маркс знаходзіць гэты механізм у законе класавай барацьбы.

Мае тут рацыю Маркс ці не мае? Безумоўна, мае. Перш за ўсё з пункту гледжання дыялектыкі, якая разглядае крыніцу ўсякага руху і развіцця ва ўласцівых любой з'яве супярэчнасцях. І калі грамадства развіваецца ў сілу ўнутрана ўласцівых яму супярэчнасцей і вырашэння іх, а гісторыю грамадства твораць людзі, дык ці не відавочна, што вырашэнне гэтых супярэчнасцей павінна абавязкова прымаць форму барацьбы тых грамадскіх сіл, якія стаяць за гэтымі супярэчнасцямі, форму барацьбы класаў. Марксава праўда і з пункту гледжання гістарычных фактаў. Бо гісторыя грамадства, як было паказана не толькі Марксам, але і, напрыклад, французскай гістарыяграфіяй (Т'еры, Мінье, Гізо), ёсць гісторыя класавай барацьбы. Усё пытанне толькі ў тым, каб не трактаваць гэтую барацьбу супярэчнасцей на манер сваркі дзвюх прадстаўніц прыгожага полу на камунальнай кухні. Ці ўтрымаўся Маркс на вышыні гэтай задачы? Па маім глыбокім перакананні, не. Тут ён зрабіў другое сваё святатацтва перад дыялектыкай. Я не магу вытлумачыць гэта інакш, як толькі тым, што ідэолаг узяў у Марксе верх над тэарэтыкам.

Дазволю сабе нагадаць чытачу асноўны змест дыялектычнага закона тоеснасці супярэчнасцей. Без гэтага нам проста не абысціся. Дык вось, пра што гаворыць гэты закон? Ён гаворыць, што кожная з'ява ўнутрана супярэчлівая. Узаемадзеянне бакоў гэтай супярэчнасці і забяспечвае працэс развіцця дадзенай з'явы, выступае крыніцай гэтага працэсу. Пры гэтым істотна важна ўлічваць тры моманты. Па-першае, узаемную абумоўленасць бакоў супярэчнасці, якая выяўляецца ў тым, што яны не сумежныя, а ўяўляюць сабой толькі адваротныя бакі аднаго і таго ж. Скажам, жыццё і смерць — гэта ж не два самастойныя, існуючыя асобна працэсы, а толькі адваротныя бакі адзінага працэсу функцыянавання і развіцця жывога арганізма. Старажытныя казалі праўду: жыць — значыць паміраць, паміраць — значыць жыць. Па-другое, што бакі супярэчнасці абсалютна раўнапраўныя, г. зн. тут няма вядучага і вядомага боку. Недарэчна было б ставіць пытанне: што ў працэсе дыхання з'яўляецца вядучым, а што вядомым бокам — удых ці выдых. Не ўдыхнуўшы, не выдыхнеш, але ж не выдыхнуўшы, таксама не ўдыхнеш. Гэтая іх раўнапраўнасць і ляжыць у аснове таго, што ў выніку вырашэння супярэчнасці гінуць абодва бакі, вынікам чаго і з'яўляецца тое, што ўзнікае якасна іншая з'ява, з іншымі, толькі ёй уласцівымі супярэчнасцямі. І, на эшце, па-трэцяе, гібель бакоў супярэчнасці не ёсць простае іх анігіляцыя, простае знішчэнне. Тут адбываецца працэс, які Гегель назваў узаемазняццём, г. зн. узаемным пераходам аднаго боку ў другі.

Усе гэтыя тры прынцыпы дыялектыкі праігнараваны Марксам. Маркс пачынае з таго, што парушае прынцып узаемнай абумоўленасці бакоў супярэчнасці. Пралетарыяту, кажа ён, няма чаго траціць у гэтым грамадстве, акрамя сваіх ланцугоў. Што ж, як прапагандысцкі лозунг — гэта цудоўна. Як тэарэтычная ідэя — надзвычай кепска. Бо пралетарыят не менш мае патрэбу ў буржуазіі, чым буржуазія мае патрэбу ў пралетарыяце. І не толькі таму, што вытворчасць вымагае спалучэння сродкаў вытворчасці з рабочай сілай. Справа і ў тым, што адна грубая фізічная сіла не робіць яшчэ надвор'я ў вытворчасці. Патрэбна яе арганізацыя, патрэбна кіраванне вытворчымі працэсамі, патрэбны новыя тэхнічныя і тэхналагічныя ідэі — ды ці мала што патрэбна для нармальнага функцыянавання і развіцця вытворчасці. Маркс, пэўна, як пазней і Ленін, меркаваў, што кожная кухарка калі ўжо не дзяржавай, дык, як мінімум, вытворчасцю кіраваць зможа. Жыццё хутка вылечыла Леніна ад гэтай ілюзіі, змусіўшы пайсці на паклон да гэтак ненавісных «буржуазных спецаў». Перад Марксам практычныя задачы не стаялі, таму ён мог аддавацца ілюзіям з поўнай сваёй асалодаю.

Маркс парушае прынцып раўнапраўнасці бакоў супярэчнасці, пастулюючы асаблівую месіянскую ролю пралетарыяту ў развіцці грамадства. На чым жа заснаваны гэты пастулат? Толькі на адным: паколькі пралетарыяту ў гэтым грамадстве траціць няма чаго, пастолькі ён рэвалюцыйны па самой сваёй прыродзе. Я думаю, і спадзяюся, што чытач пагодзіцца з гэтым, што адной рэвалюцыйнасці, г. зн. па сутнасці агрэсіўнасці, усё ж яўна недастаткова, каб прэтэндаваць на ролю вырашальнай сілы грамадскага прагрэсу. Але нават не гэта галоўнае. Важна іншае: парушыўшы прынцып роўнасці бакоў супярэчнасці, Маркс вымушаны трактаваць «барацьбу супярэчнасцей» не як узаемадзеянне, чаго вымагае дыялектыка, а як вульгарнае фізічнае супрацьборства, што выліваецца ў канчатковым выніку ва ўзброенае сутыкненне, у барацьбу на фізічнае знішчэнне. Я бяру на сябе смеласць сцвярджаць, што з такой трактоўкай закона «барацьбы супярэчнасцей» не пагадзіліся б ні Геракліт, які ўпершыню сфармуляваў яго, ні Гегель, які распрацаваў яго дэталёва. Так, дыялектыка сцвярджае, што вырашэнне любой супярэчнасці адбываецца шляхам рэвалюцыйнага выбуху, скачка, які забяспечвае пераход ад старой якасці да новай. Інакш ніякага развіцця проста не адбывалася б. Але тая форма, якую надаў гэтай дыялектычнай ідэі Маркс, належыць не дыялектыцы, а выключна Марксу. Мне могуць запярэчыць: можна, маўляў, прывесці факты, якія пацвярджаюць слушнасць Маркса. На гэта я адкажу, што можна прывесці і іншыя факты, якія абвяргаюць Маркса. Галоўнае ж заключаецца ў тым, як сказаў бы дзядуля Гегель, што не ўсё тое, што існуе ці мела месца, выяўляе ісціну быцця, г. зн. існуе ці існавала «разумна». Дыялектыка ж у якасці навукі пра законы развіцця прызнае не ўсялякую рэчаіснасць, а толькі «разумную рэчаіснасць», г. зн. рэчаіснасць, якая вынікае з унутранай прыроды з'яў, а не проста мае сваю прычыну. Але пра гэта я гатовы пагаварыць з чытачом як-небудзь іншым разам. Зрэшты, пры жаданні чытач можа звярнуцца да майго артыкула «Логіка жыцця і стэрэатыпы мыслення» («ЛіМ», 1990, № 24), дзе я спрабаваў паказаць, што Кастрычніцкая рэвалюцыя, нягледзячы на факт свайго адбыцця, не была рэчаіснасцю ў дыялектычным разуменні гэтага паняцця, г. зн. не была «разумнай рэчаіснасцю», не была неабходнасцю.

Парушае Маркс і трэці прынцып закона тоеснасці супярэчнасцей. У яго канцэпцыі сацыялізму вырашэнне супярэчнасці паміж буржуазіяй і пралетарыятам адбываецца не шляхам узаемазняццё бакоў супярэчнасці, а шляхам гібелі аднаго з яго бакоў. Калі б Маркс строга прытрымліваўся дыялектыкі, ён атрымаў бы наступную карціну. Буржуазія ў выніку вырашэння гэтай супярэчнасці пазбаўляецца манаполіі на сродкі вытворчасці, а значыць, і магчымасці жыць за кошт чужой працы. Тым самым яна як бы «пераходзіць у пралетарыят». Пралетарыят, наадварот, набывае ўласнасць, а значыць, і перастае быць толькі наёмнай рабочай сілай. Тым самым ён як бы «пераходзіць у буржуазію». Буржуазія і пралетарыят, такім чынам, пазбаўляюцца сваіх класаўтваральных адзнак: няма ўжо ні буржуазіі, ні пралетарыяту, ёсць якасна іншае грамадства з прынцыпова іншай сацыяльнай структурай.

У сілу ўсім нам добра вядомых прычын я кепска дасведчаны ў тым, якія працэсы адбываюцца ў сучасным заходнім свеце. Але нават тая інфармацыя, якая ў мяне ёсць, дае падставы зрабіць выснову, што развіццё сучаснага буржуазнага грамадства ідзе менавіта ў гэтым накірунку, г. зн. у адпаведнасці з законамі дыялектыкі. Няма ўжо там уласцівай класічнаму капіталізму манаполіі буржуазіі на ўласнасць. Што тычыцца рабочых, дык яны ўсё больш робяцца трымальнікамі акцый прадпрыемстваў, а значыць і іх уласнікамі.

Як жа паўстае гэты працэс у канцэпцыі Маркса? У выніку сацыялістычнай рэвалюцыі, гаворыць Маркс, уласнасць буржуазіі экспрапрыіруецца і буржуазія ліквідуецца «як клас». Пралетарыят жа, наадварот, не толькі не ліквідуецца «як клас», але нават устанаўляе сваю дыктатуру. Над кім ён устанаўляе дыктатуру і навошта яна яму патрэбна, калі ён, адпаведна таму ж Марксу, ужо напярэдадні рэвалюцыі складае пераважную большасць насельніцтва — усё гэта цяжка зразумець. І наогул, дзіўная нейкая дыялектыка атрымліваецца ў Маркса. Працэс пераходу супярэчнасцей як працэс іх узаемазняцця паўстае ў канцэпцыі Маркса проста як перамена адваротных бакоў месцамі, як змена матэматычных знакаў: быў плюс — стаў мінус, была дыктатура буржуазіі — стала дыктатура пралетарыяту, была прыватная ўласнасць — стала грамадская ўласнасць, была таварная вытворчасць — стаў натуральны тавараабмен, была «анархія вытворчасці» — стала планавая вытворчасць. Ну проста як у партыйным гімне: хто быў нікім, той стане ўсім. Паўтараю, калі гэта дыялектыка, дык нейкая дзіўная дыялектыка, ва ўсялякім разе не гегелеўская.

Я ахвотна пераадрасаваў бы яе будучаму гісторыку сацыялізму, калі б усе гэтыя пытанні не набылі вострасучасны, палітычны інтарэс. Мы ўвесь час раз за разам чуем: дэфармацыі сацыялізму, дэфармацыі сацыялізму... Не палітыка, а сеансы Кашпіроўскага. Ці не час перастаць, нарэшце, займацца ўнушэннем і самаўнушэннем і паставіць пытанне так, як і належыць паставіць: што менавіта з ідэйнай спадчыны Маркса-Леніна падвергнулася дэфармацыям? Як дэфармацыі сацыялізму асуджаюцца адзяржаўленне грамадскага жыцця, занядбанне культурна-гістарычных каштоўнасцей, стан перманентнай канфрантацыі з усім цывілізаваным светам. Але хіба гэта не прамыя вынікі ідэі дыктатуры пралетарыяту, якую Ленін справядліва лічыў галоўным у марксізме? Калі адкінуць палітычную рыторыку і паглядзець, што за ёй хаваецца, дык сутнасць усіх гэтых закліканняў пра «дэфармацыі сацыялізму» звядзецца да адной досыць трывіяльнай рэчы: прызнаючы прычыну, мы не хочам прызнаць вынікі, якія яна спараджае. Можна яшчэ прасцей і больш зразумела: жадаючы з'ведать усю асалоду кахання, мы не хацелі б мець клопатаў і нязручнасцей, якія яму спадарожнічаюць.

Я добра разумею, колькі шчырага ці імітаванага гневу і абурэння выклічуць гэтыя мае нататкі ў служак і прыхаджан марксісцка - ленінскага прыходу. Але гэта лішні раз дакажа толькі тое, што, абвінавачваючы нашу філасофскую і эканамічную навуку ў адыходзе ад жыцця, кіраўніцтва КПСС хацела чуць толькі тое, што яно хацела чуць. Не больш.

ЦЫМБАЛЫ — ГОЛАС РОДНЫ...

Штрыхі да партрэта Таццяны ЧАНЦОВАЙ

Строгая годнасць яе таленту, абаяльнасць твару, прыгожага і адкрытага... Ёсць штосьці захапляючае ў асобе музыканткі Таццяны Чанцовай. І адгукаюцца слухацкія сэрцы на споведзь беларускіх цымбалаў, якім давярае выканаўца свой роздум ды пачуцці.

Бліскучыя поспехі былі ў Т. Чанцовай яшчэ ў першыя гады навучання ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, дзе яна займалася ў класе вядомага цымбаліста Яўгена Гладкова. Перамогі ў конкурсах, першыя выступленні Таццяны на прафесійнай сцэне пераконвалі ў творчай перспектыўнасці маладой выканаўцы.

Пра асобу ў мастацтве гаварыць заўсёды адказна (як, зрэшты, пра асобу наогул). Ды падкрэслю, бадай, галоўнае: у выканаўчым майстэрстве Т. Чанцовай выразна вылучаюцца рысы абвостранага пачуцця традыцыі і сучаснасці, іх духоўных вытокаў, маральнага вызначэння. Сёння, як і раней, Таццяне спадарожнічае поспех. І справа не ў авацыях, чуллівых знаках увагі слухача. Радуе прыўзнятая творчая атмасфера, якая яднае выканаўцу з аўдыторыяй.

Чанцова таленавіта аднаўляе сапраўднае харастве твора, не імкнучыся быць эфектнай за кошт гармоніі свайго мастацтва. Яе інтэрпрэтацыі — заўсёды ўзор яснасці, лагічнасці, эмацыянальнай праявы мастака. З пачуццём радасці сачу за яе творчасцю, і пра тое, што ва ўдасканальванні свайго мастацтва яна не губляе шчырасць і захопленасць, думаю заўсёды, калі Т. Чанцова з'яўляецца на сцэне. Пачынаецца вялікае таінства... Артыстычная культура, абаяльнасць вобраза выканаўцы, логіка рухаў, — усё «працуе» на мастацкую ідэю! Захоўваючы каноны, цымбалістка як бы падпарадкоўвае іх сабе, сваёй індывідуальнасці. І тым багацей уражанні слухачоў.

Ад амаль імправізацыйных народных тэм да акадэмічных узораў—такі рэпертуар Т. Чанцовай. Яе майстэрства пашырае традыцыйныя ўяўленні пра канцэртныя магчымасці цымбалаў. Выканаўца як бы абвяргае стэрэатыпную думку, быццам бы народны інструмент прызначаны толькі для народнай музыкі. Пад яе чулымі рукамі звычайна кідкія фарбы цымбалаў дапаўняюцца празрыстай акварэллю, надзвычай тонкім піяна... Філігранна адпрацаваная кожная дэталь.

Сапраўднае свята для слухача — выкананне Т. Чанцовай старадаўняй музыкі. Стыль барока, ракако... Люлі, Куперэн... Выдатныя кампазітары! Не часта чуем мы гэтыя імёны ў праграмах выканаўцаў на народных інструментах. Прычына, відаць, і ў тэхнічнай складанасці твораў французскіх кампазітараў, і ў тонкасці ўласцівых ім псіхалагічных малюнкаў. Лёгкасць і празрыстасць фактуры, багатай арнаментаванасцю меладычных галасоў, Таццяна яўна звязвае з канкрэтнымі акустычнымі ўласцівасцямі клавесіна — яго ўрыўкавым, хутка згасальным гукам. Трэлі, мардэнты робіць так прыгожа і зграбна, што яны, арганічна яднаючы ўсю меладычную лінію, цудоўна падкрэсліваюць галантны стыль твораў. Своеасаблівыя абразкі — даніна павагі класіцы — здзіўляюць свежасцю, адточанасцю перакладчыцкага майстэрства выканаўцы. Ці не пра тое марым мы, калі разважаем пра музычнае майстэрства?

А калі ва ўрачыстай абстаноўцы канцэртнай залы сустракаешся з самым што ні на ёсць блізкім спадарожнікам у радасці і смутку — народным напевам, тады робіцца зусім добра і ўтульна. Тое, што бярэ вытокі з народнай творчасці, заўсёды кранае сэрца і заўжды зразумелае. Сапраўды, немудрагелістыя тэмы ў натхнёным выкананні Чанцовай робяцца гэткімі маляўнічымі, з мноствам адценняў, што гонар з'яўляецца за багатую на таленты беларускую старонку.

Таццяне давяраюць выкананне сваіх твораў лепшыя беларускія кампазітары. Так, у яе творчасць увайшла музыка І. Лучанка, С. Картэса, В. Войціка, Г. Гарэлавай... Нацыянальным каларытам, выразнасцю выказвання прасякнутыя творы гэтых аўтараў. Асабліва гожа гучаць «Акварэль», «Сюіта ў старадаўнім стылі», эцюды В. Войціка, «Успамін» І. Лучанка, «Сюіта» С. Картэса... Вельмі цікавай і адначасова цяжкай была праца цымбалісткі над музыкай Г. Гарэлавай паводле твораў беларускіх паэтаў «Чатыры песні». Роля цымбалаў была ў тым, каб стварыць вобраз інструментальны, адлюстроўваючы ўсе адценні вакальнага цыклу...

Выканаўчае майстэрства Таццяны Чанцовай мае шмат прыхільнікаў у краіне і за яе межамі. Яна як бы ўвесь час у дарозе. Цымбалы яе гучалі амаль ва ўсіх кутках Саюза, іх слухалі ў Англіі, Мексіцы, Швейцарыі, Ісландыі, Бразіліі, Фінляндыі, Польшчы... Не, цяжка пералічыць усе маршруты яе высакароднай місіі. І я перакананая: калі беларускае мастацтва за мяжою прадстаўлена гэтай цудоўнай выканаўцай, дык годнасць нашага з вамі краю будзе сцвярджацца і мацнець.

Альбіна ЦАРОВА.

Фота А. КАЛЯДЫ.

Ідзіце і глядзіце

Залатым медалём Акадэміі мастацтваў нашай краіны адзначана новая серыя народнага мастака СССР Міхаіла Савіцкага «Чорная быль». Але не на вернісажы і не ў музеі давялося ўбачыць гэтыя карціны карэспандэнту БЕЛТА. Памяць і боль цэлай нацыі, увасобленыя на палатне, захоўваюцца ў кутку майстэрні мастака.

Гэтыя твары я бачыла ў першыя дні мая 1986-га. Тады нарэшце і быў аддадзены загад «зверху» аб эвакуацыі людзей з Хойніцкага і Брагінскага раёнаў. І пацягнуліся бясконцыя начныя чароды аўтобусаў. З жанчынамі і дзецьмі, бабулямі і дзядулямі... І ва ўсіх у вачах — неўразуменне, збянтэжанасць, страх. Боль з'явіцца пазней, калі прыйдзе ўсведамленне страты: дома, малой радзімы, блізкіх. Дзесьці сярод гэтых вачэй дакорлівы погляд атручанага ў тыя дні чарнобыльскім ядам хойніцкага хлапчука Колі Сацуры. Даруй нам, вясёлы палескі гарманіст, што не абаранілі, не зберaглі цябе ад страшнага дыхання станцыі! Рэйс за рэйсам, без адпачынку, ездзіў ён у вёскі, каб быць побач з землякамі ў іх жалобную мінуту развітання з роднай хатай і магіламі. І памёр на пасту — зямля яму пухам. Хто з нас наступны? Каго ў белым адзенні чакае храм вечнага спакою?

У гэтым разгубленым натоўпе бачу і бясконца стомлены твар тагачаснага брагінскага сакратара райкома, гатовага з голымі рукамі ісці на страшны атам, толькі б закончыўся гэты нечалавечы кашмар эвакуацыі. А вось і бабуля знаёмая і яе суцяшальны, ледзь надтрэснуты голас: «А не гаруй ты, дзетка! Мы ўсю тую вайну ў карчах перасядзелі, і гэна перажывём...» Дзе ты цяпер, мая добрая плакальшчыца, ці жывая твая ўнучка гадавалая, якая з малаком маці ўвассала страшныя нукліды? Гэта над ёй распасцерла рукі-крылы чарнобыльская мадонна. Гэта яна, калі вырасце, не зведае радасці мацярынства.

Думала, што ўспамінаю сваю самую сумную за ўсё журналісцкае жыццё камандзіроўку, а аказалася, даўно пераказваю змест карцін новай серыі Міхаіла Савіцкага «Чорная быль». Ведаю, што расказваць аб палотнах — справа безнадзейная. Толькі як інакш даведаецеся вы, што яны ёсць, што зноў, як некалі ў «Лічбах на сэрцы», з дапамогай палатна і фарбаў расказаў нам майстар аб трагедыі цэлага народа? Карціны стаяць у кутку майстэрні і, здаецца, ніхто не спяшаецца перавезці іх у светлую выставачную залу, да людзей.

Як катастрофу, а не простую аварыю, расцэньвае Міхаіл Савіцкі тое, што здарылася ў Чарнобылі. Звязвае гэтую катастрофу са стратай маралі, адчужэннем людзей ад прыроды і адзін ад аднаго, а сваёй новай серыяй работ, кожны мазок якой прапушчаны праз сэрца, заклінае помніць гэту трагедыю вечна. Таму што страціўшыя памяць страчваюць сябе.

У майстэрні мастака, дзе ён сам перастаўляў цяжкія рамы, а потым цярпліва чакаў, пакуль я, знямелая перад карцінамі, вярталася да рэальнасці, мы доўга гаварылі аб велічы духу і баязлівасці, аб тых, хто парадзіў Чарнобыль і хацеў бы як мага хутчэй сцерці памяць аб ім.

— Я вырашыў рабіць гэту серыю адразу ж пасля катастрофы, — расказвае Міхаіл Андрэевіч. — З адзінай мэтай — зняць заслону сакрэтнасці над вынікамі Чарнобыля і прыцягнуць да гэтай трагедыі ўвагу людзей. Таму што адна справа гаварыць аб гэтым, нават прымаць праграмы ліквідацыі вынікаў, інакш — успрыняць усё, што здарылася, сэрцам. Я працаваў над карцінамі ўсе гэтыя чатыры гады. Пісаў. Бракаваў і зноў пісаў.

Новая серыя майстра — не толькі дзевяць палотнаў, паказаных у Акадэміі мастацтваў СССР у рамках творчай сустрэчы дзеячаў культуры на тэму «Экалогія і выяўленчае мастацтва». «Чорная быль» — гэта сотні нанідаў, эскізаў. А хто ведае, колькі асоб, сюжэтаў засталося ў збалелым сумленным сэрцы мастака!

Трэба ісці і глядзець гэтыя няяркія палотны аб нашым з вамі жыцці. І параўноўваць няўцешны сум «Чарнобыльскай мадонны» са светлай радасцю «Партызанскай мадонны». І задаваць сабе пытанне: няўжо ў нас няма будучыні? І адказваць на яго суперажываннем трагедыі. І тады прыйдзе пара ачышчэння, пакаяння і надзеі.

Л. ПЕРАСЫПКІНА.
(БЕЛТА).

Шчучын. Дзіцячыя гады. 1879

Месца майго нараджэння мястэчка Шчучын Лідскага павета Віленскай губерніі, цяпер раённы горад у складзе Гродзенскай вобласці. Мястэчка мела нейкую культурную мінуўшчыну. Аб гэтым сведчаць развалiны мураваных будынкаў колішняй школы, каторую заснавалі манахі каталіцкага ордэна Піраў. Памяці аб тых часах, апроч руінаў, не засталося. Пабудаваны імі кляштар пры касцёле існуе дагэтуль. Нат пры паляках у ім пражывала некалькі піярскіх ксяндзоў. У мае дзіцячыя гады мястэчка налічвала каля 2—3 тыс. жыхароў, пераважна яўрэяў. Карэнныя жыхары — мяшчане з невялікімі сялянскімі гаспадаркамі, ужывалі беларускую мову, але, як каталікі, лічылі сябе палякамі. Сярод мяшчан былі і рамеснікі. У мястэчку касцёл і царква, бо навакольнае беларускае сялянства было часткова каталіцкае, а часткова праваслаўнае.

Рускае насельніцтва мястэчка складалі чыноўнікі — міравы суддзя, ляснічы, урач, ніжэйшыя ўрадаўцы — вучыцелі, валасны пісар, два жандары і інш. Да рускага насельніцтва належалі і праваслаўны свяшчэннік з прычтам. Польскае насельніцтва, апроч псеўда-палякаў, беларускага мяшчанства, складалі: аптэкар, фельчар, ксёндз, арганісты (фактычна беларус са сваёй прымаўкай «заўсягоўлавы»), начальнік пошты, як вынятак з ліку чыноўнікаў, адміністратар, ляснічы і іншыя служачыя Шчучынскага ключа маёнткаў князя Друцкага-Любецкага, у большасці выпісаныя з карэннай Польшчы. Да ліку палякаў належала і наша сям'я. Бацька, па прафесіі прыватны землямер (каморнік), паходзіў з мясцовых абарыгенаў-беларусаў, спольшчаных яшчэ з часоў Вялікага княства Літоўскага. Маці — полька па паходжанню з карэннай Польшчы, хоць бацька яе быў настаўнікам Віленскай гімназіі.

Больш культурныя верхавінкі абедзвюх гэтых частак насельніцтва ўяўлялі, так сказаць, два грамадзянствы, якія ў асабістых адносінах, наогул, жылі адасоблена.

Гэта былі часы, калі ўсё польскае праследавалася; на пошце была выстаўлена дошчачка: «говорить по-польски воспрещается!». Навучанне польскай мовы і ў польскай мове, нат прыватнае, было забаронена. Дзеці ад шлюбаў каталікоў (лічылася — палякаў) з праваслаўнымі (рускімі) павінны былі хрысціцца праваслаўнымі.

Наша сям'я мела значна большую сутычнасць з рускім грамадзянствам. Мы карысталіся багатай бібліятэкай свяшч. Давідовіча, у якой былі цэлыя гадавікі тоўстых прагрэсіўных рускіх журналаў, як «Отечественные Записки» і інш. Калі на летнія канікулы прыязджаў мой найстарэйшы брат, студэнт, то нат у нашым доме збіраліся яго партнёры ў вінт — Давідовіч і некаторыя рускія чыноўнікі.

Тагачасны нацыянальны рэжым, аднак, ужо даваў трэшчыну. Мая маці на працягу дзесяткаў гадоў займалася навучаннем дзяцей мястэчкавых і навакольнай шляхты ў польскай мове. У матчынай школьнай праграме, апроч польскай мовы і іншых прадметаў, была гісторыя Польшчы...

На вечарынах польскага грамадзянства часам пяялі забароненыя патрыятычныя песні, нат у садзе. Жандары, як палітычная паліцыя, сачылі за гэтым, але праследаванняў не здаралася. Забарона польскай мовы на пошце не шчыльна пільнавалася.

Пад забаронай была не толькі польская мова, але і беларускае школьніцтва і друк.

Беларускую мову я чуў на кожным кроку — у мясцовых мяшчан, сялян, асабліва ў базарныя дні; у бацькавых кліентаў, прыязджаючых да яго ў сваіх зямельных справах. Чуваў я нат беларускія вершы, як «Панскае ігрышча». Аднак аб беларускай справе мне не прыходзілася чуць, а ў маёй галаве хлапчука самастойна ніякіх думак наконт гэтага не ўзнікала. Толькі прыезджыя з карэннай Польшчы палякі дзівaваліся на тутэйшую польскую мову і нат пасмейваліся з яе. Гэта выклікала пачуццё пэўнай адчужанасці, непрыязні да іх.

Ва ўрадавую школу я хадзіў толькі некалькі дзён — штосьці там не спадабалася, хаця адносіны настаўніка былі вельмі добрыя.

Гімназічныя гады

Дзеля гімназічнай вучобы мяне адвезлі ў Пецярбург, дзе я меў бясплатную кватэру і ўтрыманне ў сям'і К. Войчынскай, удавы інжынера з дарослымі дзвюма дочкамі і сынам. Найстарэйшы мой брат раней быў рэпетытарам яе сына. Сям'я была польская, але не шавіністычная і інтэлігентная. Ніякіх практык рэлігійных не захоўвалася, і мая рэлігійнасць без ніякай прапаганды з іх боку знікла ад першага года. Марцін Войчынскі, студэнт-медык, быў фактычна маім выхаваўцам. Ён удзельнічаў у нейкай агульнарасійскай рэвалюцыйнай арганізацыі і адсядзеў пару месяцаў у адзіночнай турме на Шпалернай. Ён належаў таксама да ППС і па сканчэнні медыцынскай Акадэміі арганізаваў у адным літоўскім мястэчку (здаецца, Дусятах) пэпэсаўскую друкарню. Змушаны быў эмігрыраваць у Галіцыю, якая тады ўваходзіла ў склад Аўстра-Венгрыі. Пазней быў лейб-медыкам Пілсудскага, таварыша па падпольнай працы.

У Пецярбурзе Войчынскіх час ад часу наведвалі пэпэсаўскія падпольшчыкі: найчасцей татарын, прозвішча якога не прыпомню, а часам Я. Пілсудскі. Апошні трымаў сябе важна і са мной асабіста ніколі не размаўляў, а татарын часта гутарыў са мной. Таксама я з зацікаўленнем чытаў пэпэсаўскую літаратуру. Адно толькі я закідваў ім — пэўную долю антысемітызму, маючы некалькі блізкіх таварышаў яўрэяў. І наогул у старэйшых класах, пачынаючы з 6-га, я ўцягнуўся ў працу нелегальнай арганізацыі вучняў сярэдніх школ Пецярбурга.

Думка аб сваёй вучнёўскай бібліятэцы прыйшла мне ў галаву яшчэ ў 3-ім класе. З адным таварышам Вішнеўскім мы заклалі ў сваім класе бібліятэку кніг сваіх і сваіх знаёмых. Праіснавала яна толькі 1 год — у канцы школьнага года кнігі разабралі.

Пазнейшая нелегальная арганізацыя была заснавана ўвосень 1897 года. Пачатак яе выглядае прыпадковым. Быў я вучнем 6-га класа. Звольніўшыся з лекцыяў да дантыста, спаткаўся на параходзіку, курсуючым па Фантанцы, з таварышам Чарноўскім, пакінутым на другі год у 5-м класе... Між намі наогул не было бліжэйшай сутычнасці, але тут у гутарцы мы закранулі пытанне аб самаадукацыі і патрэбе гуртковай працы бібліятэкі і стварэння дзеля гэтага адпаведнай арганізацыі. Мы падпольна прыступілі да гэтага.

Пачатковым ядром арганізацыі быў гурток з 7 чалавек, пераважна шасцікласнікаў, па вывучэнню палітычнай эканоміі. Пачалі мы з сумеснага чытання Роберта Овена, але хутка перайшлі на іншы метад. Кожны выбраў іншы падручнік па палітэканоміі: Ісаева, Іванюкова, Багданава і інш. Збіраліся раз на тыдзень. Кожны па чарзе рабіў даклад на вызначаную тэму, а рэшта знаёмілася з ёй па сваіх падручніках. На пасяджэнні даклад абгаворваўся, прымаючы пад увагу апініі і іншых аўтараў. Былі потым і іншыя гурткі, але гэты, з невялікімі зменамі ў складзе і не заўжды рэгулярнай працай, пратрываў да выхаду з гімназіі большасці сяброў яго вясной 1900 года.

Бібліятэка складалася часткова з кніг паасобных сяброў і іх знаёмых. На куплю кніг быў устаноўлены членскі ўзнос. У букіністаў можна было дастаць забароненыя кнігі «Что делать?» Чарнышэўскага, «Шаг за шагом» Амулеўскага, «Кобзарь» Шаўчэнкі і інш. Апроч таго, нашы прадстаўнікі наведвалі пражываючых у Пецярбурзе прагрэсіўных пісьменнікаў — Златаўрацкага, Шалгунова, Н. К. Міхайлоўскага, якія ахвяроўвалі некаторыя свае творы.

Арганізацыя мела свой статут, у якім мэтай яе ставіліся самаадукацыя і аб'яднанне. Пры пераглядзе статута на агульным сходзе ставілася пытанне: якая мэта аб'яднання? На гэтае пытанне выразнага адказу ў статуце не давалася, але гэтая формула пакідалася ў ім. На справе яна апраўдала сябе. Жменя сяброў арганізацыі, уліўшыся ва універсітэт восенню 1900, адыграла пэўную ролю ў студэнцкім руху 1900/1 вучэбнага года.

У другім годзе свайго існавання арганізацыя налічвала звыш 40 чалавек. У лік сяброў уваходзілі не толькі гімназісты, але і вучні іншых сярэдніх школ: кадэты, слухачы акушэрскіх курсаў, нат адзін студэнт Мілюцін. Між іншым, кароткі ўдзел у абласных з'ездах у Кіеве і ў Вільні. У Кіеве быў П. Магілянскі, а ў Вільні — я. Апроч Віленскіх школ былі прадстаўлены Гародня і Беласток. Агульны лік удзельнікаў не перавышаў дзесятка. Арганізатарам з'езда быў Міхаіл Гольман — віленец. З іншых удзельнікаў прыпамінаю толькі Макоўскага, Шэваха і Рахіль ці Раісу.

Скончыўшы гімназію, я толькі ў першым годзе адзін раз наведаў сход арганізацыі. Варыціўшыся ў Пецярбург ў 1908, я даведаўся, што арганізацыя праіснавала яшчэ некалькі гадоў, нат быў створаны «Паўночны саюз сярэдніх школ».

За ўвесь перыяд гімназічнай вучобы я амаль зусім згубіў сувязь з бацькаўшчынай. Нат у летнія канікулы найчасцей прыязджаў да брата ў Таржок Калінінскай вобласці. У Пецярбурзе толькі ў кніжнай шафе Войчынскіх я знайшоў «Дудку Беларускую». Я чытаў яе з зацікаўленнем, але выразнага ўплыву на маю нацыянальную пазіцыю яна не мела.

Першы год універсітэцкай вучобы

Пасля сканчэння гімназіі вясной 1900, увосень я паступіў у Пецярбургскі універсітэт на юрыдычны факультэт. Фармальна я далучыўся да польскай студэнцкай арганізацыі пэпэсаўскага напрамку, але фактычна ў яе дзейнасці актыўнага ўдзелу не прымаў.

Усё ж прыпадкова, пры вобыску у тав. Шэхтэра, з якім я пражываў у адным пакоі, пратрэслі і мае рэчы, знайшоўшы там па аднаму нумару пэпэсаўскіх часопісаў, яшчэ талонную кніжку для збору ахвяр на карысць польскай арганізацыі, хоць і нелегальнай, але на якую ўлады глядзелі скрозь пальцы.

Ад самага пачатку я аддаўся працы ў агульна-студэнцкім рэвалюцыйным руху на грунце Пецярбургскага універсітэта. Ад самага пачатку вучэбнага года выявіўся бунтарскі настрой студэнтаў, асабліва першакурснікаў. На гэта было шмат прычын. Між

Ф. СТАЦКЕВІЧ

З МАІХ УСПАМІНАЎ

Рускі культурны чалавек, грамадзянін і патрыёт Расіі ды не толькі Расіі, а кожны, хто цэніць сваю і паважае іншую культуру і гісторыю, хто беражэ і паважае сваё і чужое мінулае, хто ашчаджае родную мову і чуе прыгажосць суседняга слова, ужо атрымлівае паўторнае выданне «Гісторыі дзяржавы Расійскай» М. Карамзіна, «Курс рускай гісторыі» В. Ключэўскага, «Гісторыю Расіі з даўнейшых часоў» С. Салаўёва.

Нізкі паклон перад светлай памяццю М. Улашчыка, які прымаў самы чынны ўдзел у выданні і прапагандзе заходне-рускіх летапісаў. Ён заслужыў, і яшчэ які, каб адна з вуліц беларускай сталіцы была названа яго імем.

Акрамя жывых, удала і чэсна падабраных дакументаў, гісторыя заўсёды дапаўняецца расказамі і ўспамінамі яе сведкаў. Фрагменты з успамінаў Ф. Стацкевіча пра Беларускую рэвалюцыйную грамаду, якая ўтварылася ў 1902 годзе на базе гурткоў беларускай моладзі, таксама могуць засеяць зернем праўды белыя плямы і агрэхі на полі беларускай гісторыі. У жніўні 1966 года Ф. Стацкевіч пісаў (ён тады жыў у Вільнюсе): «Хацелася б яшчэ пабачыць у друку хаця ўспаміны в перыяду 1905—1907 гг. Здаецца мне, што аб працы 2-га Краёвага Камітэту ў Мінску наогул вестак мала.

Напішыце, ці варта працягваць работу. З гэтым матэрыялам вы ўжо знаёмы з маіх ранейшых успамінаў».

Значыць, яшчэ недзе знаходзяцца і не выяўлены іншыя матэрыялы Ф. Стацкевіча, які разам з братамі Луцкевічамі, Цёткай, А. Бурбісам, А. Уласавым, К. Каганцом і інш. стаяў ля вытокаў дробнабуржуазнай нацыянальнай партыі леванародніцкага кірунку.

Вячаслаў АДАМЧЫК.

іншым, свежая была памяць аб трагічным самагубстве курсісткі Ветравай у турме «Кресты» ў 1897 годзе, калі ў форме пратэсту была заказана ў Казанскім саборы паніхіда і перад уваходам да моладзі выступіў Пляханаў, які, здаецца, быў арыштаваны. 8 лютага 1899 каля Мікалаеўскага моста казакі пабілі нагайкамі студэнтаў-дэманстрантаў супраць уводу паліцыі ва універсітэт рэктарам Сергеевічам. Патрэбны быў толькі абы-які повад, нат шукалася яго, каб гэты настрой выліўся ў форму публічнага пратэсту. Такім пачатковым повадам была пастаноўка ў Малым тэатры Суворына, выдаўца рэакцыйнай газеты «Новое Время», п'есы антысеміцкага характару, якая выклікала абурэнне паступовага грамадзянства і прэсы. Ва універсітэце быў скліканы сход, на якім пастаноўлена правесці абструкцыю ў тэатры. З гэтай мэтай у студэнцкай сталоўцы былі раздадзены свістулькі ўдзельнікам абструкцыі. Абструкцыя адбылася, і Суворын змушаны быў зняць п'есу з рэпертуару.

За ўдзел у сходцы два студэнты былі звольнены, што дало повад для далейшых сходаў. У гэтым часе былі выдадзены «Часовыя правілы» аб здачы студэнтаў у салдаты за ўдзел у сходах, што падліло масла ў агонь, студэнцкі рух пашырыўся на іншыя вышэйшыя школы Пецярбурга і універсітэты іншых гарадоў. Трэба адмеціць, што ў арганізаванасці і працягласці руху значную ролю адыграла жменька сяброў вучнёўскай арганізацыі, што ўлілася ва універсітэт увосень 1900 года. З ліку іх трэба адмеціць М. Магілянскага, Шэхтэра, Тагеева, Баброва, а асабліва Пакацілава, які сумысля перавёўся ў Кіеўскі універсітэт дзеля сувязі з ім і дзе сыграў выдатную ролю ў руху. Прыкладам гэтай сувязі была ўзгодненая з пецярбургскімі таварышамі абвестка на першай старонцы газеты «Новое Время»: «Володя (чытай: Кіеўскі унів. імя Уладзіміра) заболел». Гэта было сігналам для выступлення Пецярбурга. Каля 240 студэнтаў Кіеўскага універсітэта было здадзена ў салдаты.

З іншых больш актыўных удзельнікаў руху прыпамінаю Цэдэрбаўма, Свацікава, Райкова, Інжавінскага. Райкоў меў асаблівую здольнасць уплыву на нас. На адным са сходаў, калі яшчэ не была аб'яўлена забастоўка, адзін з аратараў заклікаў прысутных ісці гнаць Сергеевіча-рэктара, які чытаў лекцыю ў суседняй аўдыторыі, і ўсе ўжо гатовы былі пайсці за гэтым заклікам. Адзін Райкоў стрымаў сход ад гэтага кроку.

Сярод удзельнікаў руху стварылася некалькі групаў, між іншым, «Рас. Сац. Дэм. Рабочай Партыі», групы паслядоўнікаў вучэння прафесара Петражыцкага пад лозунгам «Во имя права за права». Кожная з іх распаўсюджвала свае адозвы, як ва універсітэце, так і ў студэнцкай сталоўцы.

Пасля выдання часовых правілаў на сходзе ў ліку звыш тысячы чалавек была пастаноўлена забастоўка з дамаганнем скасавання іх.

Аднак з-за значнага ліку «белападкладачнікаў», кар'ерыстаў і іншых апартуністаў забастоўка не ўдалася. Тады на новым сходзе ў ліку каля 400 чалавек была пастаноўлена забастоўка з абструкцыяй. На другі дзень удзельнікаў абструкцыі сабралася каля 70 чалавек. Група абструкцыяністаў уваходзіла ў аўдыторыю, звярталася да прафесара з заклікам спыніць лекцыю. Прафесар часам пасля спрэчкі, а то і без гэтага, звычайна пакідаў аўдыторыю. Толькі на лекцыі праф. Петражыцкага, якога шанавала шмат удзельнікаў абструкцыі, завязалася дыскусія, у якой фактычна ўвесь час гаварыў Петражыцкі, гутарка працягнулася далёка пасля званка.

Усё-такі абструкцыя, хоць і нешматлічная, давяла да перадчаснага зачынення універсітэта на калядныя канікулы.

У Пецярбургскім універсітэце было здадзена ў салдаты 27 чалавек.

У горадзе пад час забурэнняў адбываліся зборкі паліцыйнага характару пад выглядам вечарын. Публічная лекцыя аднаго прафесара абярнулася ў многалюдны мітынг студэнтаў розных вышэйшых школ Пецярбурга.

Пасля калядных канікулаў рух у сценах універсітэта заглух і быў перанесены на вонкі.

19 лютага 1901 адбылася дэманстрацыя на Казанскім пляцы супраць Часовых Правілаў. Група дэманстрантаў у ліку каля двухсот студэнтаў пайшла ўздоўж Неўскага праспекта з пяннем рэвалюцыйных песняў. Супраць царскага Анічкаўскага палаца яна была затрымана...

Праз некалькі дзён я атрымаў павестку ў Жандарскую Управу. Палкоўнік, які рабіў допыт у справе злоўленых, тлумачыў мне, што ўсёй процідзяржаўнай дзейнасцю кіруе нейкі жыдоўскі цэнтр. Мая віна не такая вялікая, але яны не могуць прайсці міма яе. Мне пагражае які тыдзень арышту, які я змагу адбыць у дагодны для сябе час. Быў складзены пратакол з абвінавачаннем па 252 арт. Ул. Нак., і я быў адпушчаны.

4 сакавіка 1901 адбылася на Казанскім пляцы шматлюдная дэманстрацыя супраць Часовых Правілаў. Апроч студэнтаў, прынялі ў ёй удзел фабрычныя рабочыя, паступовая інтэлігенцыя і прадстаўнікі іншых слаёў насельніцтва. У цэнтры пляца быў развінуты транспарант з надпісам «Долой Временные Правила!», нехта выступаў з прамовай. Цэнтральная група ў ліку каля 70 чалавек была абкружана коннымі казакамі і паліцыяй і арыштавана; астатніх дэманстрантаў пачалі разганяць. Апошнія то адступалі, то варочаліся назад; адбываліся сутычкі дэманстрантаў з паліцыяй. Гэта трывала ад поўдня да цямна. Урэшце пачуліся заклікі ісці ў паліцэйскую часць, каб заявіць сваю салідарнасць з арыштаванымі. Ззаду сабора сабралася значная грамада і сфарміравала шэсце па Казанскай вуліцы ў Казанскую часць. Шэсце эскартавала паліцыя спераду, з бакоў і ззаду, але на ўсім працягу быў свабодны ўваход і выхад з яго. За ўвайшоўшымі ў двор часці была зачынена брама. Затрыманых аказалася каля 600 асоб. Пакуль паліцыя лічыла і меркавала, куды падзець гэткую грамаду людзей, трэ было чакаць 2—3 гадзіны на двары. Агароджу абступіла шмат народу — пасыпаліся перадачы ежы і садавіны. Між паасобнымі затрыманымі і паліцэйскімі завязаліся жывыя гутаркі, успаміны эпізодаў сутычак. Усіх падзялілі на розныя месцы зняволення. Я папаў у Конгвардзейскі манеж. На падсцілку далі саломы ў кулях. Група паліцэйскіх афіцэраў выказала пажаданне паслухаць студэнцкіх песняў. Сфарміраваўся адмысны хор пад рэгенцтвам адваката Грузенберга, шырока вядомага абаронцы ў палітычных працэсах. Побач з рэвалюцыйнымі былі выкананы і іншыя песні, у тым ліку аб манахіні Фядоры, айцу благачынным і іншых царкоўных чынах.

На другі дзень нас перавезлі коннымі трамваямі ў Перасыльную турму, дзе мы занялі два калідоры; кожны з іх быў зачынены на ключ, але камеры былі адчынены.

Часам злучаліся абодва калідоры: ладзілі канцэрты, мітынгавалі, чаго былі пазбаўлены на волі. Паверхам вышэй памяшчаліся жанчыны — удзельніцы дэманстрацыі. З імі завязалася сувязь праз форткі шнуркамі, спушчанымі з вышэйшага паверху. Сярод нас былі не толькі студэнты. Прыпамінаю рабочага Путілаўскага завода з яго сібірскай песняй пра дзеўку Наташку і прыпеў: «ни гу-гу, ни цы-цы — ничего не говори!» Быў і досыць пажылы гадзіннікавы майстар, які бедаваў аб сваёй майстэрні. Паступала шмат перадач правізіі, садавіны і прысмакаў, як паасобным адзінкам, так і ўсім наогул. Выдаваліся дзве рукапісныя газеты, што палемізавалі між сабой. Першымі днямі настрой быў прыўзняты і бадзёры, аднак ад вечнага шуму выявілася ўтома. Выстаўляліся картачкі з надпісам захоўваць цішыню. Найлепш, здаецца, адчувалі сябе чацнёра студэнтаў, якія цэлымі днямі да позняй ночы гулялі ў вінт.

Падзея 4 сакавіка мела сваю лірыку і эпас. Па руках хадзіў рукапісны верш «Лес рубят!»:

Лес рубят! Молодой зеленый лес.
А сосны гордые задумались угрюмо
И, полные неразрешимой думой,
Печальные, глядят в неведомую даль небес.
Лес рубят! Оттого ль, что рано лес шумел?
Что песней радостной будил природу.
Что молодой листвой он слишком сильно пел
Про солнце ясное, про счастье, про свободу.
Лес рубят! Но земля укроет семена.
Пройдут года и мощной жизни силой
Подымется борцов могучая стена
И зашумит над братскою могилой!

Справа аб дэманстрацыі была перададзена ў рукі сенатара Мяшчанікава, які выступаў у ролі міратворцы. Арыштаваных звальнялі пачкамі на працягу пару тыдняў. Улетку пазвальнялі і аддадзеных у салдаты студэнтаў. Часовыя Правілы былі скасаваны. Быў зменены універсітэцкі статут у больш ліберальным духу. Студэнты атрымалі права сходаў, ладжання зямляцкіх і іншых арганізацый.

Мяне з Перасыльнай турмы перавезлі проста ў Жандарскую Управу. Спаткаў мяне той самы палкоўнік, але ўжо з нахмураным тварам. «Мы зрабілі Вам папярэджанне, але Вы не скарысталіся гэтым». Быў спісаны новы пратакол у ранейшай справе — толькі цяпер з абвінавачаннем яшчэ па 250 арт. Ул. Нак. аб прыналежнасці да арганізацыі, маючай мэтай звяржэнне існуючага дзяржаўнага ладу. Падстава тая, што ў талоннай кніжцы было ўжо адарвана некалькі талонаў, — значыць, актыўная дзейнасць ужо праяўлена. Пасадзілі мяне ў Дом папераджальнага зняволення на Шпалернай, дзе пратрымалі ў адзіночцы два месяцы. Пасля звальнення быў высланы на бацькаўшчыну пад яўны нагляд паліцыі да часу вырашэння справы.

З палякаў ды ў беларусы. 1900—1903 г.г.

У Шчучыне маім наглядчыкам быў станавы прыстаў — з нямецкіх баронаў прыбалтыцкага краю. Жонка яго была полька, а двое дзяцей вучыліся ў школцы маёй маці ў польскай мове па яе праграме. Ясна, што прыстаў не замінаў маім рукам, прынамсі, у бліжэйшай ваколіцы. Хутка я выехаў на кандыцыю ў маёнтак за 15 кіламетраў ад мястэчка. За мной сачылі не яўна і жандары. Не бачачы мяне ў мястэчку, адзін з іх прыйшоў у канцылярыю прыстава даведацца, куды я падзеўся. Прыстаў адмовіўся інфармаваць яго.

Мясцовая руская інтэлігенцыя адносілася да мяне прыхільна. Бацюшка Давідовіч змусіў дачку валаснога пісара, якая дабівалася пасады вучыцелькі царкоўна-прыходскай школы, падгатаўляцца ў мяне. Сын Давідовіча таксама быў маім вучнем. Аднойчы, пад час нейкага сямейнага свята ў іх доме, мой вучань, пераняўшы ад мяне словы і прыблізную мелодыю актуальнай тады песенькі «Нагаечка», з нагоды пабіцця студэнтаў-дэманстрантаў у 1899 пры Мікалаеўскім мосце, — наладзіў адмысны хор, які выканаў яе. Гэта было спаткана наогул спагадна. Толькі адзін з гасцей, прыстаў суседняга стана, хоць добра пад газам, крыху насцярожыўся. Аднак гаспадару дома няцяжка было яго супакоіць.

Тым жа летам у маёнтку, суседнім з тым, у якім я быў рэпетытарам, пасля маёўкі была наладжана вечарына. Там я спаткаўся з Алаізай Пашкевічанкай-Цёткай. З ёй мы шмат размаўлялі. Зместу гэтых гутарак я не памятаю, але пазней, у 1905 годзе, яна казала, што гутарка была аб беларускай справе. Магчыма, пад яе ўплывам у той год майго побыту на бацькаўшчыне, сутыкаючыся з беларускім сялянствам, я пачаў разважаць, што беларус, якога адны хочуць зрабіць палякам, а другія рускім — ні тое і ні другое, а Беларусь — не Польшча і не Расія. Аднак у сваёй польскай нацыянальнасці ў мяне, здаецца, сумліву не было.

Вясной 1902 я быў прысуджаны ў адміністрацыйным парадку (па «высочайшему повелению») яшчэ на два гады яўнага нагляду паліцыі, без права пражывання ў Прывісленскім краі (г. зв. Царства Польскае). Паўночна-заходнім (Беларусь і Літва) і Паўднёва-заходнім (Украіна) краёх, сталіцах і універсітэцкіх гарадах. Выехаў я ў Марыупаль пры Азоўскім моры, дзе атрымаў работу ў канторы натарыуса. Увосень таго ж года я паехаў у Пецярбург станавіцца да Камісіі па воінскай павіннасці. Залічылі мяне ў «ратнікі» апалчэння 2-га разраду». Ад дэпартамента паліцыі я атрымаў дазвол на пражыванне ў Пецярбурзе.

Там ад знаёмага студэнта-паляка з карэннай Польшчы, пэпэсаўца, я даведаўся аб існаванні групы студэнтаў-беларусаў. Гэта мяне вельмі зацікавіла. Той жа студэнт пазнаёміў мяне з імі. Тут я спаткаў некалькі сыноў польскіх памешчыкаў, між імі Вацлава Іваноўскага, сына буйнога памешчыка за 20 кіламетраў ад Шчучына. Яны разважалі, што шляхоцкі клас Беларусі — гэта спольшчаныя за панаваннем палякаў беларусы. Я згадзіўся з гэтым і далучыўся да іх гуртка. Тады і заснавалася «Беларуская Рэвалюцыйная Грамада», якая ў 1905 перайменавалася ў «Беларускую Сацыялістычную Грамаду». З тагачасных сяброў яе прыпамінаю, апроч Іваноўскага, братоў Луцкевічаў і Малецкага.

Не маючы права паступлення ва універсітэт і не знаходзячы ў Пецярбурзе заробку, я змушаны быў выехаць у Сясьскія Радкі працаваць на прыладажскіх каналах, дзе і пражыў да вясны 1905 года.

Міхась БАРЭЙША

13 жніўня заўчасна, пасля цяжкай хваробы, памёр беларускі пісьменнік, член КПСС Міхась Барэйша.

Міхась Уладзіміравіч Барэйша нарадзіўся 4 студзеня 1950 года ў вёсцы Новы Лад Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці. У 1969 годзе скончыў Наваполацкі нафтавы тэхнікум. Працаваў машыністам, затым апаратчыкам на Полацкім хімічным камбінаце. У 1971-1973 гг. служыў на Балтыйскім флоце. Пасля дэмабілізацыі вярнуўся на камбінат. У 1980 годзе перайшоў на працу ў полацкую аб'яднаную газету «Сцяг камунізму». Быў карэспандэнтам. З 1983 года — намеснікам рэдактара гэтай газеты. Кіраваў літаратурным аб'яднаннем «Наддзвінне». Працаваў, завочна вучыўся на факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, які скончыў ў 1981 годзе.

У друку з літаратурнымі творамі пачаў выступаць у 1973 годзе. Першая кніга прозы ўвайшла ў калектыўны зборнік «Сустрэчы» (1985 год). Другая кніга прозы «Крыніца, чыстая вадзіца» выйшла ў 1988 годзе. У 1989 годзе Міхась Барэйша быў прыняты ў члены Саюза пісьменнікаў. У беларускую літаратуру прыйшоў сталы, удумлівы аўтар, са сваім бачаннем свету, з адметным почыркам. Міхась Барэйша добра ведаў паўсядзённае жыццё чалавека і таленавіта ўвасабляў яго ў сваіх творах.

Светлы вобраз Міхася Уладзіміравіча Барэйшы назаўсёды застанецца ў сэрцах сяброў і ўсіх, хто яго ведаў.

САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ.

Саюз пісьменнікаў БССР глыбока смуткуе з прычыны заўчаснай смерці пісьменніка Міхася Барэйшы і выказвае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

Наваполацкае гарадское літаратурнае аб'яднанне «Крыніцы» глыбока смуткуе з прычыны смерці пісьменніка Міхася Барэйшы і выказвае спачуванне яго родным і блізкім.

Нагодай для перадруку з беластоцкай газеты «Ніва» гэтага матэрыялу стаў ліст нашага чытача з Гародні, ў якім выказвалася шкадаванне адносна тэндэнцыйнага, не аб'ектыўнага (на ягоную думку) асвятлення польска-беларускіх стасункаў на землях Заходняй Беларусі, што некалі ўваходзілі ў склад польскай дзяржавы. Што шмат гадоў хавалася праўда аб Катыні — аб польскіх ахвярах і сталінскіх катах. Яшчэ наш чытач шкадаваў, што беларуская грамадскасць мала ведае аб подзвігах Арміі Краёвай...

Так, праўда аб Катыні стала здабыткам галоснасці зусім нядаўна. Ды і то не ўся праўда. Па-за ўвагай грамадскасці тая аналічнасць, што Катынь — трагедыя не толькі польскага, але таксама беларускага і ўкраінскага народаў. Бо сярод афіцэраў Войска Польскага — ахвяраў НКУС — былі і жыхары так званых «Крэсаў».

Згодныя з нашым чытачом адносна неабходнасці сказаць усю праўду аб Арміі Краёвай. Пра адзін з эпізодаў дзейнасці «акаўцаў» на Беласточчыне якраз і апавядае матэрыял Яна Максімюка.

Памяць ведае больш, чым слова можа сказаць. Памяць, не слова, хоча сказаць усё і не можа.

Тое, што ў словах.

Попел і памяць

Зані, 2 лютага 1946

Успамінае М. К.: Гэта было ў суботу, якраз выпалі польскія Грамніцы. У нас у хаце была я з сястрою, мама, малодшы брат Ёзік, тата драмалі на зэдліку каля печкі. На вячоркі прыйшлі дзве мае сяброўкі, адна прала на калаўротку, другая вязала на дротах. Старшы брат Уладзік забег у хату і кажа, што паляць Шпакі. Відаць зарыва і дым. І выбег. Мама кажуць, што трэба павыносіць з хаты, бо прыйдуць і нас спаляць. Потым хтось грукнуў у дзверы, тата выйшлі і ў хату ўжо не вярнуліся. Потым стрэлілі ў акно, і згасла карбідоўка. Мы пападалі на падлогу. Я падняла галаву і бачу цераз акно, што і наша вёска ўжо гарыць. Ідзі на гару і павынось што, кажа мне мама. Я пайшла і бачу з гарышча, што людзі пабітыя на вуліцы ляжаць. Бо на вуліцы ясна, як удзень, ад агню. Выходжу і кажу маме. Мама ўзялі польскую ікону, была ў нас адна, і выйшлі на двор. Мы ўсе за ёю. Брат, я памятаю, паспеў захапіць з сабою школьны тарністар. Мы хадзілі ў школу ў Занях, вучыў нас найстарэйшы наш брат Янак, яго ў той час дома не было, бо старэйшыя хлопцы і мужчыны здаўна ўжо па хатах не начавалі. Хто дзе, у клуні, на вышках у хляве або і на грушы, абвязаўшыся вяроўкаю, каб не ўпасці, калі засне. Стаімо мы перад нашым домам, а яны ідуць вуліцай і заходзяць у наш панадворак. Адзін з іх узяў і прыставіў пісталет мне да галавы. «Polacy czy Bialorusy?»—пытаецца. «Panie, my Polacy, nie zabijajcie nas»,—кажуць мама.— «Jak pan nie wierzy, to nieh zapyta u sasiadki. Ona kataliczka». Цераз вуліцу жылі каталікі, нашы суседзі. Мама пабачылі, што суседка ...цкая стаіць перад домам, і падумала, што за нас заступіцца. Бо мы з імі жылі як адна сям'я, гэта я тут праўду, як на споведзі, кажу. Яны былі бедныя, а нашы мама былі шчырыя, спагадлівыя і памагалі ім, чым маглі. Адзін пайшоў пытацца, ці палякі мы. І гая ...цкая сказала, ведаеце, з такой пагардай ці то са злосцю: «Tak, tak, polaki». ён вярнуўся і стрэліў з пісталета маме ў голаў. Я бачыла, як страшна пырснула кроў у мамы з галавы. Мама ўпалі каля хаты. Брат Ёзік кінуўся ўцякаць за хату, за ім стралялі, але не пацэлілі. Ён прасядзеў усю ноч у акопах за вёскай, вярнуўся на другі дзень, ужо на папялішча. А нас з сястрою і з тымі сяброўкамі запхнулі ў хату. Адзін з іх прынёс ад суседзяў акалот саломы, яны ім уваход у пограб закрывалі, бо дзвярэй не мелі, завалок яго на гару і запаліў. І потым пайшлі паліць далей. Мы думалі, што дзверы завязалі чым, каб нам не выйсці, і пазалазілі пад ложак. Але тут дым, кроквы трашчаць і пачынаюць падаць. Я вырвала акно, у нас яно было падвойнае, як на зіму, другую раму выпхнула на двор. Пад акном у нас была сажалка, тут на яе салома са страхі падае і гарыць. Вада гарыць. Хоць быў люты, то вада не замёрзла, бо тады якраз стаяла адліга. Няма як выскачыць, бо ўсюды агонь. Але вытрываць не можна, мы ўжо пачыналі задыхацца. Тады я ўзяла сястру на рукі, ёй было сем гадоў, а мне чатырнаццаць, і кінулася цераз полымя, цераз сенцы на двор. Дзверы не былі завязаны. За мною мае сяброўкі. Я пабегла цераз вуліцу да тых суседзяў і, не пытаючыся, шмыганула ў іхнюю хату і схавалася там. Там, дзе жылі палякі, то не палілі, толькі беларусаў. А таксама абапал дамоў не палілі, нават калі былі беларускія, каб каталікі не згарэлі. У нас у вёсцы было чатыры польскія сям'і, са «шляхты». І тая суседка, што сказала на нас «Так, так, polaki», забегла ў хату і выгнала нас адтуль, як паршывых сабак. Я з сястрою на руках пабегла ў куток панадворка, там у іх хвораст ці то ядловец ляжаў і таксама пярыны, што павыносілі з хаты, бо ім сказалі раней, што паліць беларусаў будуць, каб павыносілі, калі б ад пажару і іхняя хата занялася. Але і адтуль нас прагналі. І мы схаваліся ў куратніку, што стаяў побач сялібы тых суседзяў. Там мы і прабылі да рання, не выходзілі, калі яны збіраліся і крычалі «Zbiórka! Zbiórka!», а потым пайшлі дарогаю на Свірыды.

Успамінае Н. А. (сястра М. К.): Я ляжала ў тым куратніку на курыным памёце ў адной кашулі. Сястра мне казала не варушыцца. Сама была ля дзвярэй. Я чула, як яна дрыжыць і трасецца. У вёсцы стралялі, я цераз пазы бачыла, што на загуменні стаялі іхнія падводы, чакалі, аж тыя ў вёсцы паб'юць людзей і папаляць. Яны збіраліся потым вельмі доўга. Уранні сястра знайшла брата Янку, і ён перанёс мяне ў клуню, якая не згарэла. Сама я ісці ўжо не магла. Тата адвёз мяне ў Свірыды да сваякоў. Вясною я вярнулася ў Зані да бабкі. Зані пасля пажару апусцелі, людзі хаваліся па іншых вёсках, доўга не варочаліся. Тата, як вярнуліся ў нядзелю ранкам, то ўбачылі, што мама згарэлі разам з хатаю, засталіся толькі самыя костачкі. Тата пазбіралі іх у палатно, збілі з дошак труну і хавалі разам з іншымі пабітымі, за вёскаю, у супольнай магіле, мы туды пойдзем, я вам пакажу. Праваслаўныя могілкі былі ў Бранску, але людзі баяліся туды ехаць і хаваць, каб там нас не пабілі. Разам у той магіле пахавалі 42 асобы. Тыя нашы сяброўкі выжылі, яны былі сёстры, але тату і маму іх забілі.

Успамінае А. К.: Яны прыходзілі да нас раней, перад тым, як нас спалілі, былі разоў дваццаць. Грабілі, забіралі коні, свінні, вопратку, хлеб, усё, што згледзелі. Прыходзілі ноччу, грукалі ў акно. Калі гаспадар пытаўся «Хто?», яны казалі «Polskie Wojsko». Мы ўжо ведалі, хто такія і чаго ім трэба. Тады мне было 19 гадоў, я быў на вёсцы, сядзеў з хлопцамі ў некага ў хаце. Па начах мы ў хатах не спалі, бо калі каго з хлопцаў зловяць, то катуюць. Мы пачулі шоргат і рыпенне падводаў. Я выйшаў на двор і бачу, што вёску акружаюць. Пытаю хлопцаў, куды ўцякаць будзем? Усе разбегліся, хто куды. Я сам пабег цераз садок у той бок, дзе лес. Але згубіў шапку і вярнуўся па яе. Тут мяне і схапілі. І вядуць па вуліцы. З адной хаты выглянуў стары, называўся ён Міхал. Яго таксама забралі і павялі са мною. Завялі нас на гасцінец, што ідзе на Свірыды, і там сказалі класціся на зямлю. Потым адзін з іх пайшоў на вёску і доўга не варочаўся. Мусіць, пытаўся ў камандзіраў, што з намі рабіць. У вёсцы чуваць была страляніна, з абодвух канцоў пачалі яе паліць. Потым той паляк, што пайшоў, вяртаецца, выцягвае пісталет і пытаецца ў Міхала: «Polak czy Bialorus?», «Bialorus»,—кажа дзядзька Міхал. Той стрэліў у яго два разы. Потым пытаецца пра тое самае ў мяне. Я адказваю таксама. Ён страляе ў мяне. У першую хвіліну мне падалося, што мне раскалолі галаву і выбілі мозг. Але ж не, я ляжу і думаю, значыць, я жыву і галава цэлая. Чую, як енчыць і страшна хрыпіць дзядзька Міхал. Яму, мусіць, прастрэлілі лёгкія, краем вока бачу, як ён пакутуе і звіваецца каля мяне. «Poprawtemu, co sie tak wije» — кажа той, што страляў. І тады другі пусціў у дзядзьку чэргу з аўтамата. Дабіў яго. Я ляжаў да таго часу, пакуль не ўбачыў, што яны адышлі ад нас і сталі глядзець, як гарыць вёска. Я паволі адпоўз ад іх, потым прыўзняўся і кінуўся бегчы. Тады якраз пачалася моцная страляніна, я не ведаю, стралялі па мне ці, можа, у вёсцы людзей забівалі. Я ўцякаў. Я схаваўся ў акопах, што засталіся пасля немцаў, сядзеў там і прамёрз. Адчуваў, як па маім целе, пад вопраткай, сцякае кроў. Трэба было падацца недзе да людзей. Але куды пайсці? Кругом польскія вёскі. Я пайшоў у Сцёны, там былі дзве беларускія сям'і. Я пастукаў у акно, мне адчыніла бабулька. Сказаў, што я з Занёў і што нас спалілі і пабілі. Прыйшоў гаспадар, у хаце лямпы не палілі, але ён адчуў, што нешта са мною благое. Ён стаў мяне разглядаць і ўбачыў, што з мяне цячэ кроў. Я быў ранены ў двух месцах. Адна куля прайшла праз шыю, другая трапіла ў плячо і выйшла каля локця. Ён мяне перавязаў, а ранкам павёз у Зані. На вуліцы я ўбачыў забітага бацьку. Зайшоў у хату, на пасцелі ляжала мая сястра, ёй прастрэлілі грудзі. І той чалавек занёс сястру на сваю фурманку і павёз яе цераз Бранск у Бельск, у шпіталь. Там яе адратавалі. У Занях у тую ноч забілі 24 асобы. Многа паранілі. Наш сусед выносіў з хаты свайго ўнучка, да яго стралялі з аўтамата, хлопчыку было ўсяго чатыры гады, а можа, і таго не, кулі яго разнеслі амаль на кавалкі, а суседу адстрэлілі абедзве рукі. Яны потым выехалі ў СССР, засталася яго дачка, жыве ў Занях да гэтай пары.

Я: За што стралялі людзей у Занях і палілі вёску? Можа, хтось з Занёў нейкага паляка забіў або выдаў бяспецы? І потым тыя з лесу прыйшлі помсціць?

А. К.: Ніхто з нас нікога не выдаваў і не забіваў. Стралялі і мучылі нас за тое, што мы беларусы, што рэлігія ў нас іншая. Вам, смярдзючым беларусам, месца там, пад Масквой, а не тут, казалі яны не раз.

Вам трэба ведаць, якія ў нас тут, «на шляхце», як людзі кажуць, палякі жывуць. Ім ксяндзы ў касцёлах казалі, што руская рэлігія Маткі Боскай не прызнае, і яны гэтаму верылі і вераць да сёння.

Успамінае П. М.: Заходзіць дзядзька ў нашу хату і кажа, што вёска гарыць. Я на двор, а на загуменні стаяць з карабінамі. Назад у хату! Сядзець і не выходзіць. Я ўзяў дзве мае дочкі на рукі, выйшаў з імі на двор і цераз вуліцу, подбегам, каб хутчэй у лес. За мною стралялі, куля трапіла мне ў клуб, я ўпаў з дочкамі ў баразёнку на агародзе. Аднекуль падбегла мая сястра, забрала дзяўчынак і панесла іх за вёску. Я бачу, ляжыць мая мама на агародзе, забітая. Я падпоўз да яе, кранаю, але яна не варушыцца. Я ляжаў каля мамы не ведаю як доўга, аж чую, крычаць: Zbiórka! Zbiórka! Zbiórka!». Вёска палыхае, яны ідуць вуліцай, згледзелі нас, падыходзіць адзін, падыходзіць другі: «Kurwa mać, nie ma naboi!» Потым падыходзіць трэці з карабінам, такі каратыш, ростам, можа, з метр, калі ў шапцы. Ён страляе ў маму, ужо мёртвую. Потым стрэліў у мяне. І я тады, як ляжаў, то сеў адразу. Сеў і не ведаю, што са мною сталася. Ужо нічога не бачыў. Куля выбіла мне адно вока, прайшла пераноссе і выкалупнула другое. Яно, як людзі мне потым сказалі, ліпела нейкі час на адной жылцы. Яны пайшлі далей, а я астаўся сядзець там без вачэй, жывы. І ў таго каратыша не хапіла на мяне амуніцыі.

Магіла пастраляных 2 лютага 1946 года людзей у Занях метраў дзвесце за вёскай, у полі. На пачатку сямідзесятых на тым месцы паставілі мемарыяльную табліцу. Высечаны на ёй 24 прозвішчы. Найстарэйшаму з забітых 83 гады, наймалодшаму — 4. Гэта тое хлапчанё, якое ратаваў і выносіў з полымя дзед, пакуль не адстрэлілі яму рукі.

Зані спаліў адзін з атрадаў так званага Pogotowia Akcji Specjalnej *(PAS), якім камандаваў «Буры» (Ромуальд Райс). Атрад складаўся з акоўцаў, што прыйшлі на Беласточчыну з Віленшчыны, і таксама з мясцовых палякаў.*

— Вы, калі ласка, не запісвайце нашых прозвішчаў у газеце, — прасілі мяне жыхары Занёў. — Мы вам расказалі ўсё, як было. Але прозвішчаў нашых не запісвайце. Жывуць нашы дзеці, нам трэба жыць. Зразумейце тое, што нас стралялі не партызаны з-за граніцы, а нашы суседзі, людзі з навакольных вёсак. Мы не хочам, каб тыя, што стралялі нас тады, помсцілі нам і цяпер. Калісьці называлі іх бандытамі, цяпер гавораць, што яны героі, бо змагаліся за вольную Польшчу.

Я запісаў гэтыя словы 17 красавіка 1990 года ў Занях, на беларускім астраўку ў Польскай Рэчыпаспалітай.

Я не адчуваю нянавісці да палякаў.

Ян МАКСІМЮК.

(«Ніва», 6.5.1990 г.)

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и совета Союза писателей БССР. Минск. На белорусском языке.

Літаратура і Мастацтва

Выходзіць раз на тыдзень, па пятніцах.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная рэдакцыі — 33-24-61; намеснік галоўнага рэдактара — 33-25-25; адказны сакратар — 33-19-85; аддзел публіцыстыкі: Міхась ЗАМСКІ, Віталь ТАРАС — 33-19-65; аддзел пісьмаў і грамадскай думкі: Людміла КРУШЫНСКАЯ, Марыя ГІЛЕВІЧ — 33-19-85; аддзел інфармацыі: Алесь МАРЦІНОВІЧ — 33-24-62; аддзел крытыкі і бібліяграфіі: Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ — 33-22-04; аддзел літаратуры: Юрась СВІРКА, Уладзімір ЯГОЎДЗІК — 33-22-04; аддзел музыкі: Святлана БЕРАСЦЕНЬ — 33-21-53; аддзел тэатра, кіно і тэлебачання: Жанна ЛАШКЕВІЧ — 33-21-53; аддзел выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў: Пётра ВАСІЛЕЎСКІ — 33-24-62; аддзел народнай творчасці і культасветработы: Вячаслаў ЛАПЦІК — 33-24-62; аддзел мастацкага афармлення: Уладзімір ТАБУШАЎ — 33-44-04; фотакарэспандэнт: Уладзімір КРУК — 33-24-62.

Пры перадруку просьба спасылацца на «ЛіМ». Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.

Галоўны рэдактар Анатоль ВЯРЦІНСКІ.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Анатоль БУТЭВІЧ, Уладзімір ГІЛЕП, Мікола ГІЛЬ (нам. галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЕДАЎ, Лілія ДАВІДОВІЧ, Міхась ДРЫНЕЎСКІ, Алесь ЖУК, Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ, Ігар ЛУЧАНОК, Уладзімір НЯКЛЯЕЎ, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Юрась СВІРКА, Рычард СМОЛЬСКІ, Уладзімір СТАЛЬМАШОНАК, Віктар ТУРАЎ.

Адказны сакратар Андрэй ГАНЧАРОЎ.